Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ

*Зборнік сцэнарыяў гульнёвых праграм*
*экалагічнай накіраванасці*

Мінск 2011

УДК [791.9+37.035:502.1](476)(082)
ББК [85.345+74.200.507]я43
У 115

**Складальнікі**
П.А.Гуд, Д.П.Сергейчук

**Рэцэнзент**
*Л.Ф.Жмачынская,* намеснік начальніка аддзела інавацыйных тэхналогій у сацыякультурнай дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Інстытут культуры Беларусі”

У 115 **У гармоніі** з прыродай: зборнік сцэнарыяў / склад.: П.А.Гуд, Д.П.Сергейчук. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – 124 с. (Народнае выхаванне).
ISBN 978-985-522-018-4.

Прапанаваны сцэнарыі гульнёвых праграм экалагічнай накіраванасці, распрацаваныя студэнтамі кафедры рэжысуры абрадаў і свят і апрабіраваныя ў рамках вучэбнага працэсу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Літаратурныя матэрыялы, выкарыстаныя ў сцэнарыях, сфарміраваны на базе народных традыцый і накіраваны на выхаванне пачуцця патрыятызму, беражлівых адносін да прыроды, актыўнай грамадзянскай пазіцыі, далучаюць падрастаючае пакаленне да беларускай культуры, нацыянальнай спадчыны.

Сцэнарыі знойдуць шырокае выкарыстанне пры арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў. Яны зацікавяць работнікаў устаноў культуры і адукацыі, арганізатараў вольнага часу, спецыялістаў па гульнёвай творчасці, а таксама ўсіх, хто займаецца праблемамі экалагічнага выхавання.

**УДК [791.9+37.035:502.1](476)(082)**
**ББК [85.345+74.200.507]я43**

**ISBN 978-985-522-018-4**

© Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ


**Уступ** ………………………………………………………………… 4

**Алімпіяда знаўцаў кветак** (сцэнарый тэатралізаванай гульнёва-пазнавальнай праграмы) *П.А.Гуд, Н.І.Гуд* ……….......... 6

**Музыка беларускай прыроды** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *Я.І.Сцяпанаў* ………………………….......... 29

**Свята кветак** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *Д.А.Аўрамчык* ……………………………………………........... 36

**У свеце незвычайных кветак** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *І.С.Дзяніішчык* ……………………………….. 43

**Пошукі цудоўнай кветкі** (сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы) *С.В.Арцюшэнка* ……………………………………... 49

**Сёмуха, ці Зялёныя сваткі** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *А.Г.Багданоўская* ……………………………… 53

**Свята птушак** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *В.І.Шарова* ………………………………………………………… 57

**Свята пастухоў** (сцэнарый фальклорнай гульнёва-забаўляльнай праграмы) *А.У.Вячорка* ………………………………. 61

**Юр'я** (сцэнарый фальклорнага свята пастушкоў) *М.М.Федарэнка* …………………………………………………………….. 68

**У вадзяным царстве** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *В.А.Патаповіч* ……………………………………….... 74

**У свеце рыб** (сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы) *А.У.Шабліцкая* ………………………………………… 80

**Знаёмства з лесам** (сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы) *К.І.Ачапоўская* ……………………………………….... 85

**Скарбы лесу** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *Н.А.Валько* ……………………………………………………………. 90

**Казкі старога лесу** (сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы) *С.І.Кузьміч* ……………………………………………... 94

**У лес па ягады** (сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы) *В.М.Барысевіч* ……………………………………………… 99

**У гасцях у Лесуна** (сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы) *Т.К.Кухта* ………………………………………………… 106

**Мурашнік – дзяржава чысціні і парадку** (сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы) *А.Я.Цімафеева* ………………….. 113

**Жыхары лесу** (сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы) *Д.П.Сергейчук* …………………………………………………... 118

**Спіс выкарыстанай літаратуры** ……………………………. 121


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Які дзівосны свет – лясы, палі, рэкі, моры, неба, сонца, жывёлы, птушкі, расліны. Гэта – прырода. І наша з вамі жыццё нельга аддзяліць ад яе. Прырода шчодрая і бескарыслівая. Яна дае нам усё для жыцця і патрабуе ад нас беражлівых, паважлівых адносін да сябе.

Ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі, адна з вострых праблем – ахова і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, экалагічнае выхаванне людзей. Святы, тэматычныя вечары, конкурсы, акцыі, прысвечаныя ахове навакольнага асяроддзя, даюць магчымасць пазнаёміць людзей з разнастайным светам прыроды, арыентавацца ў гэтым свеце і ахоўваць яго. У многіх раёнах краіны цэнтры народнай творчасці, установы культуры і адукацыі выкарыстоўваюць разнастайныя формы работы. Яны адзначаюць свята леса (г.п. Свіслач), свята кветак (г.п. Шчучын), свята птушак (г.п. Тураў), праводзяць конкурсы дзіцячага плаката і малюнка “Здаровая экалогія – здаровы чалавек” (Бярэзінскі раён), “Экалагічная вандроўка” (Уздзенскі раён), выставы-конкурсы кветак і інш. Як правіла, у структуру святочных мерапрыемстваў экалагічнай накіраванасці ўваходзяць масава-гульнёвыя дзеі. Але, на жаль, многія гульнёва-пазнавальныя праграмы з’яўляюцца аднатыпнымі па структуры і не адпавядаюць ідэйна-тэматычнай накіраванасці свята. У многім гэта тлумачыцца фармальным падыходам некаторых работнікаў устаноў культуры да творчага ўвасаблення экалагічнай акцыі, а таксама недастатковай колькасцю і разнажанравасцю сцэнарыяў падобнай тэматыкі.

Прапануемы зборнік сцэнарыяў ставіць сваёй задачай зацікавіць людзей пытаннямі выхавання ўнутранай экалагічнай культуры, развіцця беражлівых адносін да прыроды. Работнікі ўстаноў культуры і адукацыі, а таксама ўсе, хто займаецца праблемамі экалогіі, могуць выкарыстоўваць гэты зборнік пры арганізацыі работы з моладдзю і дзецьмі.

Літаратурныя сцэнарыі конкурсных, гульнёва-забаўляльных, фальклорных, пазнавальна-забаўляльных праграм распрацаваны студэнтамі і выкладчыкамі кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўнівер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сітэт культуры і мастацтваў” пад кіраўніцтвам прафесара П.А.Гуда.

Мы спадзяёмся, што сцэнарныя матэрыялы, якія змешчаны ў зборніку, дапамогуць абудзіць у дзяцей і моладзі інтарэс да вывучэння прыроды, сфарміраваць уяўленні аб месцы і ролі чалавека на Зямлі, выхаваць пачуццё любві, павагі і беражлівых адносін да прыроды.

Кафедра рэжысуры абрадаў і свят плануе выдаць серыю living рознатэматычных зборнікаў гульнёвых праграм, у якіх будуць адлюстраваны гульні і забавы беларускіх народных свят каляндарнага цыкла і сучасных свят. Акрамя прапанаванага зборніка “У гармоніі з прыродай”, у серыю “Народнае выхаванне” ўвойдуць наступныя зборнікі сцэнарыяў гульнёва-абрадавых дзей: “Народная гульнятэка”, “Добры настрой”, “Гульнёвы калейдаскоп”. Зборнікі сцэнарыяў дапамогуць спецыялістам гульнёвай творчасці нашай дзяржавы ў арганізацыі і правядзенні тэматычных гульнёва-забаўляльных, пазнавальных і конкурсных праграм розных мерапрыемстваў сучаснага святочнага календара Беларусі.

*П.А.Гуд, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АЛІМПІЯДА ЗНАЎЦАЎ КВЕТАК
## *(сцэнарый тэатралізаванай гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Пляцоўка дзеяння нагадвае форму кветкі, цэнтрам якой з'яўляецца сцэна, з двух бакоў, пачынаючы ад сярэдзіны круга, размешчаны "пялёсткі", акружаныя крэсламі для каманд (дзесяць крэслаў для ўдзельнікаў і два – для кіраўнікоў каманды).*

*Заднікам сцэны з'яўляецца вялізны дэкарыраваны вянок з кветак беларускай зямлі, у які ўстаўлена рознакаляровая электрагірлянда. Вянок у час правільных адказаў удзельнікаў можа зіхацець і пераліваецца рознакаляровымі агнямі. У вянку сярод розных кветак – сем васількоў (па ліку каманд), у цэнтры якіх прымацаваны лісточкі з заданнямі, і рамонак, на пялёстках якога напісаны заданні для каманд. Унізе вянка – сем дэкаратыўных дубовых лістоў, ззаду якіх напісаны пытанні конкурсу знаўцаў геральдыкі. Наверсе вянка – белы гарлачык, у цэнтры якога знаходзіцца малы піратэхнічны фантан, які будзе запалены ў фінале алімпіяды ў гонар каманды-пераможцы. Цэнтр вянка задэкарыраваны пад белы экран для праектавання слайдаў і відэафільмаў.*

*(Гучыць музыка. На экране трансліруецца відэафільм пра кветкі, фільм завяршаецца выявай вянка. На сцэне з'яўляецца Дзед -Усявед.)*

Д з е д-У с я в е д. Добры дзень, дарагія сябры! Вось, нарэшце, і прыйшло яно, свята кветак, якое ўсе мы так доўга чакалі. Я – Дзед-Усявед – таксама рыхтаваўся да гэтага свята, каб прынесці вам радасць сустрэчы з прыгожым і чароўным светам кветкавых раслін.

*(На экране трансліруюцца слайды розных кветкавых раслін, кустоў, дрэў.)*

Мноства раслін растуць у лугах, лясах, стэпах, бязводных пустынях, багністых балотах. Расліны ўзбагачаюць паветра кіслародам, неабходным для дыхання амаль што ўсіх жывых істот, і паглынаюць з паветра вуглекіслы газ. Расліны служаць ежай для чалавека і жывёл, сыравінай для розных галін прамысловасці, для прыгатавання лекаў, будаўнічага матэрыялу, паліва, кандытарскіх вырабаў, касметыкі. Але расліны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

карысныя не толькі тым, што даюць ежу і сыравіну, яны ўпрыгожваюць наша жыццё, прыносяць радасць.

Сёння гаспадарчая дзейнасць чалавека так моцна ўздзейнічае на прыроду, што многія віды раслін зусім зніклі, а многія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Захаваць іх – наш агульны абавязак. А для гэтага неабходна ведаць, як кветкавыя арганізмы жывуць і што яны значаць у жыцці чалавека. *(Дэманстрацыя слайдаў прыпыняецца.)*

На сваю алімпіяду беларускае свята кветак сабрала знаўцаў кветкавых раслін з розных мясцін. Паглядзіце ў залу, і вы пабачыце сапраўднае кветкавае багацце Беларусі. На галовах удзельнікаў каманд – шапачкі – рамонкі, васількі, дзьмухаўцы, лілеі, гарлачыкі. Сем каманд сёння будуць аспрэчваць званне "Знаўца кветак". У кожнай камандзе па 10 удзельнікаў, якія праявяць свае веды і ўменні ў гісторыі, батаніцы, геральдыцы, раскрыюць многія цікавыя факты з жыцця кветкавых раслін.

Я прашу каманды павіншаваць сваіх sапернікаў дружнымі воплескамі.

*(Усе апладыруюць, гучаць фанфары.)*

Нашу алімпіяду будзе судзіць кампетэнтнае журы:

– старшыня журы (*называе рэгаліі і ініцыялы старшыні журы);*

– батанік –

– гісторык –

– фалькларыст –

– паэт –

– кампазітар –

– культарганізатар –

Д з е д-У с я в е д. Кожны з членаў журы будзе судзіць свой конкурс. За кожны правільны адказ ці выкананае заданне ўдзельнікі атрымаюць прызавыя жэтоны-васількі. Якая каманда збярэ большую колькасць васількоў – тая і пераможа!

Паважаныя суддзі! А зараз прыміце ў дар ад удзельнікаў алімпіяды кветкі як сімвал прыгажосці кожнай каманды!

*(Гучыць музыка. Капітаны каманд падыходзяць да століка журы і ўсталёўваюць у крышталёвую вазу кветкі – сімвалы каманд.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д з е д-У с я в е д. Мы пачынаем прадстаўленне каманд. Кожная каманда падрыхтавала тэатралізаванае прывітанне, у якім раскажа аб сваёй кветцы.

*(Гучыць музыка, на сцэну па чарзе запрашаюцца каманды, якія ў песнях, вершах, танцах прадстаўляюць сваю кветку.)*

Д з е д-У с я в е д. Ну, вось і закончылася прадстаўленне каманд і мы пачынаем нашае турнірнае спаборніцтва размінкай. А размінка – гэта аўкцыён кветак!

Я паказваю літару, а каманды адказваюць. Якая каманда апошняй назаве кветку на паказаную літару, тая і атрымае прызавы васілёк. Дык вось, літара "А".

*(Каманды ўдзельнічаюць у аўкцыёне, называючы кветкі на ўсе літары алфавіта, за кожны праўдзівы адказ каманда атрымлівае прызавы жэтон.)*

Д з е д-У с я в е д. А зараз я выклікаю на сцэну батанікаў каманд! Усе ўдзельнікі вітаюць свайго знаўцу кветак дружнымі воплескамі і скандзіраваннем слова "віват".

*(Пад музыку і воплескі прадстаўнікі каманд выходзяць на сцэну.)*

Д з е д-У с я в е д. Я прашу знаўцаў батанікі падысці да вянка і ўзяць заданні, якія знаходзяцца ў цэнтры васількоў. *(Удзельнікі каманд бяруць паперкі з заданнямі. Пытанні складзены паводле падручніка батанікі для 5–6-х класаў сярэдняй школы.)*

На кожнай паперцы напісана пытанне, на якое вы павінны даць адказ. На падрыхтоўку вам даюцца тры хвіліны. Час пайшоў!

*(Гучыць музыка, удзельнікі рыхтуюцца да адказу. Заданні для батанікаў наступнага зместу.)*

1. Назавіце органы кветкавых раслін. *(Корань, сцябліна, ліст, кветка.)*

2. Назавіце групы кветкавых раслін. *(Травы і травяністыя расліны, кусты, дрэвы.)*

3. Якія састаўныя часткі мае кветка? *(Кветканожка, кветкаложа, чашалісцік, завязь, слупок, песцік, тычынка, рыльца, пялёсткі.)*

4. Назавіце віды сакавітых і сухіх пладоў кветкавых раслін. *(Сакавітыя плады – ягада і касцянка; сухія – насенне, зярноўка, боб, стручок, каробачка.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Назавіце будову раслiннай кветкі. *(Абалонка, поры, цытаплазма і вакуолі – пустыя месцы, запоўненыя кветкавым сокам.)*

6. Назавіце знешнюю будову кветкавага лісця і яго адрозненне. *(Лісце мае лісцевую пласцінку і чаранок, розніца – у размяшчэнні жылак на лісце, якое можа быць паралельным, дугавым, сеткавым.)*

7. Суквецце – група кветак, размешчаных блізка адна каля другой у пэўным парадку. Назавіце віды суквеццяў? *(Кісць – ландыш, чаромха; просты колас – падарожнік; складаны колас – жыта, пшаніца, ячмень; просты парасонік – прымула, вішня; складаны парасонік – пятрушка, морква; карзінка –- дзьмухавец).*

Д з е д-У с я в е д. Пакуль батанікі рыхтуюцца да адказаў, я кожнай камандзе па чарзе буду зачытваць вершаваную загадку, звязаную з пэўнай кветкай ці кветкавай раслінай, а каманда павінна адказаць. На роздум даецца 10 секунд. Каманда, якая своечасова адкажа, атрымае прызавы васілёк. Калі каманда не зможа адказаць, то падключаюцца іншыя каманды, якія змогуць пры дапамозе свайго варыянта адказу атрымаць прызавы рамонак.

*На фоне музыкі гучаць загадкі:*

1. Цвітуць і на лузе, і ў полі
   Чырвоныя, белыя шапкі.
   І дораць турботлівым пчолам,
   Нектар і салодкі, і пахкі. *(Канюшына.)*
2. Хвалюе водарам,
   Красою,
   Але няпроста
   Ўзяць рукою.
   Галава – пахучая,
   Тулава – калючае. (*Ружа.)*
3. На сцяблінках тонкіх
   Вісяць званочкаў гронкі –
   Белыя, духмяныя,
   У тугіх лістах схаваныя. *(Ландыш.)*
4. Мною дзяўчынак называюць,
   А як толькі зацвітаю –
   З гудам рупным і вясёлым
   Да мяне лятаюць пчолы. *(Ліпа.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Выраслі ў полі браточкі
І зазванілі ў званочкі:
Жніце нас і малаціце,
Дзеткам пячэнне рабіце. *(Авёс.)*
6. На сцяблінку сонца села –
Белы капялюш адзела. *(Рамонак.)*
7. Гарачае лета,
Спеюць суніцы,
А ён –
У пуховай хусцінцы. *(Адуванчык.)*

*(У праграму конкурсу загадак можна ўключыць і іншыя – больш складаныя або больш простыя – вершаваныя ці празаічныя загадкі.*

*Дзед-Усявед аб'яўляе вынікі конкурсу загадак і выклікае знаўцаў батанікі для адказу на пытанні.)*

Д з е д-У с я в е д. Конкурс батанікаў у нас будзе ацэньваць вянок кветак. Ён у нас незвычайны, чароўны! Калі ўдзельнік дасць правільны адказ – вянок зазіхаціць агеньчыкамі і ўдзельнік атрымае прызавы васілёк. І вось, мы пачынаем выпрабаванне! *(Гучыць музыка, удзельнікі адказваюць на пытанні, журы падводзіць вынікі конкурсу.)*

Д з е д-У с я в е д. А зараз мы збіраемся ў вандроўку і возьмем з сабою ў дарогу наш чароўны вянок. Дапусцім, што ўсё неабходнае для вандроўкі па прыродзе – рэчавы мяшок, турысцкія прыналежнасці, ну і, канешне, бутэрброды – вы прыгатавалі. Але ўсё гэта яшчэ не гарантуе поспеху вандроўкі. Галоўнае – надвор'е: калі будзе дождж або халодны вецер, то гэта значна горш, чым сонечны дзянёк. Вядома, што пра надвор'е можна даведацца з газеты, ці з прагнозу па радыё і тэлебачанні, або па барометры, калі ён ёсць у цябе дома. А можна зрабіць значна прасцей: прыглядзецца да навакольнай прыроды, у прыватнасці да кветак. Яны – самыя лепшыя барометры і беспамылкова прадкажуць табе, якое будзе надвор'е. Возьмем канюшыну. Калі яе кветкі – шышачкі сціснуліся і схіліліся да зямлі, то ведай, што абавязкова будзе дождж. А калі яны весела паднялі галоўкі, пялёсткі расправіліся і ласкава шалясцяць на пяшчотным ветрыку – смела адпраўляйся ў паход, дзень будзе ясны і сонечны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А хто падкажа, якія кветкі перад дажджом закрываюць пялёсткі? *(Ружа, мальва, цюльпан, фіялка, дзьмухавец, наготкі, цыкорый, бярозка палявая, іпамея, календула, макрыца.)*

А якія кветкі адкрываюцца перад непагаддзю і не скручваюцца перад дажджом нават на ноч? *(Акацыя, чырвоная канюшына, зайцава капуста.)*

Многія кветкі перад дажджом пачынаюць моцна пахнуць, выдзяляць многа нектару і вакол іх роем лятаюць пчолы. Назавіце гэтыя кветкі. *(Мята, язмін, ліпа, бружмель.)*

Д з е д-У с я в е д. Частка кветкавых раслін перад дажджом пачынаюць "плакаць", дакладней кажучы, на лістах з'яўляюцца кроплі вады. Скажыце, якія кветкі "плачуць"? *(Стракаліст, разак, вольха, чаромха, клён, вярба.)*

А цяпер падкажыце, суквецці якіх раслін перад дажджом згінаюцца і звісаюць уніз так, што пыльнікі ўсіх кветачак надзейна ахаваны зверху пялёсткамі? *(Чаромха, барбарыс, лаўравішня.)*

Ну, вось бачыце, як цудоўна вы ведаеце жывы барометр прыроды!

Я прашу тых, хто правільна адказаў, атрымаць прызавы жэтон-рамонак.

*(Юнак і дзяўчына пад гукі ўрачыстай музыкі ўручаюць удзельнікам алімпіяды жэтоны.)*

Д з е д-У с я в е д. У паходзе мець гадзіннік – гэта цудоўна. Але не бяда, калі ў кагосьці з вас яго не аказалася. Час можна вызначыць пры дапамозе раслін. Яшчэ ў 20-х гадах XVIII стагоддзя вядомы шведскі батанік, даследчык прыроды Карл Лінэй заўважыў, што тыя ці іншыя кветкі раскрываюць і закрываюць свае пялёсткі ў пэўны час. Назіраючы на працягу многіх гадоў за паводзінамі кветак, вучоны склаў табліцу, дзе пазначыў гадзіны раскрыцця і закрыцця пялёстак, а затым паводле гэтай табліцы "высадзіў" кветнік, зрабіў кветкавы гадзіннік, які ён назваў "Гадзіннік Флоры".

Паглядзеўшы на свой кветнік, Карл Лінэй мог лёгка вызначыць час у залежнасці ад таго, якія кветкі ў гэты момант раскрытыя, а якія закрытыя. Таму знаёмства з навакольным светам кветак і іх жыццём лепш пачынаць з самага простага – вызначэння відаў раслін і часу іх цвіцення на працягу дня. А гэта і ёсць знаёмства з кветкавым гадзіннікам. Для яго лепш выбраць устойлівы перыяд у сярэдзіне лета, лепш у другой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палове чэрвеня. Тады і дзень самы доўгі і разнастайнасць кветак багацейшая.

Кожны з вас таксама можа навучыцца вызначаць час па кветках. Напрыклад, цыкорый раскрывае свае блакітныя кветкі ў 6–7 гадзін раніцы, а закрывае ў 3–4 гадзіны дня; званочкі раскрываюць свае пялёсткі ў 7–8 гадзін раніцы. Нават кветкі бульбы таксама падказваюць час: раскрываюцца яны ў 7 гадзін раніцы, а закрываюцца ў 2–3 гадзіны дня.

Вось зараз мы і паспрабуем скласці кветкавы гадзіннік. Кожная каманда атрымлівае планшэт з назвамі кветак. За тры хвіліны ўдзельнікі разам з капітанамі каманд павінны насупраць кожнай кветкі напісаць мяркуемы час яе раскрыцця і закрыцця. Кветкавы гадзіннік – гэта своеасаблівы іспыт як для членаў каманды, так і для яе капітанаў. Каманда, якая больш дакладна выканае заданне, атрымае тры прызавыя жэтоны. Умовы ўсе зразумелі? Пачынаем! *(Юнак і дзяўчына раздаюць камандам планшэты "Кветкавы гадзіннік", у якіх удзельнікі конкурсу павінны адзначыць час адкрыцця і закрыцця пялёсткаў. Гучыць музыка – старт конкурсу. Каманды пачынаюць выконваць заданне.)*

Кветкавы гадзіннік

| Назвы кветак | Час адкрыцця пялёсткаў, гадз. | Час закрыцця пялёсткаў, гадз. |
|---|---|---|
| 1. Казлабарод | 03.00 | 12.00 |
| 2. Цыкорый | 04.00 | 13.00 |
| 3. Дзьмухавец, пунцовая ружа | 05.00 | 14.00 |
| 4. Шыпшына | 05.00 | 20.00 |
| 5. Асот | 06.00–07.00 | 13.00 |
| 6. Дзьмухавец, бульба | 06.00–07.00 | 14.00 |
| 7. Кап'ялісты каганец | 06.00–07.00 | 15.00 |
| 8. Наготкі | 06.00–07.00 | 16.00 |
| 9. Цыкорый, званочкі, белы гарлачык | 06.00–07.00 | 15.00–16.00 |
| 10. Парасоністы ястрабок | 06.00–07.00 | 17.00 |
| 11. Макрыца | 09.00 | 17.00 |
| 12. Казялец | 10.00 | 18.00 |
| 13. Мак | 10.00 | 19.00 |
| 14. Кісліца | 10.00 | 19.00 |
| 15. Свінакроп | 11.00 | 16.00 |
| 16. Хрусталёвая траўка | 12.00 | 19.00 |
| 17. Пахучая табака | 20.00 | На світанку |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д з е д-У с я в е д *(пасля заканчэння конкурсу).* Ну вось мы і склалі кветкавы гадзіннік. Зараз нашае журы азнаёміцца з вашымі работамі і вызначыць лепшую каманду або каманды, якія атрымаюць тры прызавыя васількі.

А мы з вамі працягваем нашу вандроўку! *(Гучыць мелодыя беларускага народнага танца "Бульба". На сцэне – танец у выкананнні харэаграфічнага калектыву. У фінале танца дзяўчаты ствараюць "бульбяное поле".)*

Д з е д-У с я в е д. Мы з вамі праходзім праз бульбяное поле. У наш час вас будуць лічыць дзіваком, калі вы падорыце каму-небудзь букет з кветак бульбы. А ў XVII стагоддзі такія букеты лічылі шыкоўнымі. Сціплымі фіялетавымі або ружовымі кветкамі бульбы ўпрыгожвалі валасы каралёў і камзолы прыдворных. Радзіма бульбы – узбярэжжа Чылі і горы Перу. Бульба добра вытрымлівала маразы высакагорных раёнаў. Еўрапейцы не ведалі бульбы да 1565 года, гэта значыць да наведвання Паўднёвай Амерыкі іспанцамі. У Еўропе бульбу спачатку вырошчвалі як дэкаратыўную расліну, якой упрыгожвалі клумбы. У Беларусі бульба з'явілася ў XVIII стагоддзі і заваявала такую папулярнасць, што яе ў нас пачалі называць другім хлебам.

А цяпер адкажыце на пытанні:

1. Да якога сямейства раслін належыць кветка бульбы? *(Да паслёнавых.)*

2. Ці ёсць нектар у кветак бульбы? *(Ёсць.)*

3. Якім спосабам адбываецца апыленне бульбы? *(Самаапыленнем.)*

4. Як размнажаюць бульбу? *(Вегетатыўным спосабам, клубнямі.)*

Д з е д-У с я в е д. А цяпер тых, хто правільна адказаў на пытанні, я прашу атрымаць прызавы васілёк і смачную смажаную бульбу!

*(Гучыць мелодыя танца "Бульба", удзельніцы харэаграфічнага калектыву падносяць канкурсантам жэтоны і смажаную бульбу.)*

Д з е д-У с я в е д. А мы працягваем наша падарожжа. Мы прайшлі з вамі луг і лес. Вы заўважылі, што вакол раслін заўсёды многа насякомых? І ў гэтым нічога дзіўнага, бо яны выкарыстоўваюць у ежу лісце раслін. Але, аказваецца, і ліст можа з'есці мошку. У свеце ёсць больш за 400 раслін-канібалаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якія харчуюцца насякомымі. Страшэннымі драпежнікамі з'яўляюцца расліны-гарлачыкі Мадагаскара, Паўднёвага Кітая, Паўночнай Аўстраліі. На балотах Атлантычнага ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі сустракаецца расліна дарлінгтонія з лоўчым апаратам. Яна дасягае рэкорднай для раслін-драпежнікаў велічыні – адзін метр!

Папаўшы ў купал гарлачыка, насякомае доўга б'ецца, шукаючы выхад, але, урэшце, падае на дно пасткі і пераварваецца раслінай.

Ёсць такія расліны і ў нас, у Беларусі. На глебах тарфяных балот сярод імхоў, тонкіх галіначак клюквы і лёгкіх шарыкаў пушыцы можна пабачыць беленькія кветачкі расліны-паляўнічага. Кожны яе лісточак пакрыты чырвона-крывавымі валасінкамі, а на кончыках лісточкаў, быццам чыстая раса, "б'ецца" кропелька. Садзіцца на ліст расліны камар, а на лістку не прахалодная раса, а ліпкая слізь. Валаскі ліста пачынаюць згінацца, кранаючыся камара, і выдзяляюць пякучы сок. Пад яго ўздзеяннем праз дзень-два камар усмактваецца лістом. Цяпер кусцік зусім сухі, але неўзабаве пачнецца новае паляванне. Ад гэтай кропелькі на лісце расліна і атрымала трапную назву. Як называаецца гэтая расліна? Правільна, расянка! Я прашу ўдзельніка, які правільна адказаў на пытанне, атрымаць прызавы жэтон-васілёк. *(Гучыць музыка, юнак дорыць удзельніку прызавы васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. Расянка з'яўляецца і лячэбным сродкам. Яе выкарыстоўваюць пры прастудных захворваннях, у якасці потагоннага сродку. У нашай краіне ёсць і іншыя зялёныя расліны-паляўнічыя. Назавіце іх. *(Венерына мухалоўка, альдраванда, жыранка. Удзельнікі, якія адказалі правільна, атрымліваюць прызавы васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. А зараз мы зробім прывал. Адпачнем, пакаштуем маліны, яблык і раскрыем кнігу прыроды. *(Раскрывае кнігу.)* А зараз зробім падарожжа па гісторыі кветкавых раслін розных часоў і народаў. На першай старонцы гісторыі – Старажытны Усход.

*(Гучыць усходняя музыка. На сцэне дзяўчаты выконваюць усходні танец з кветкавымі галінкамі розных дрэў. На экране – вісячыя сады Семіраміды.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адно з сямі цудаў света – вісячыя сады Семірамiды, якія былі створаны ў VI стагоддзі да новай эры па загаду цара Навухаданосара.

Гэты цар пабудаваў палац на штучна створанай пляцоўцы, паднятай на вышыню шасціпавярховага дома. Да пляцоўкі слупамі падымаліся шэсць радоў цагляных арак – шэсць аркад. На кожным уступе быў насыпаны слой зямлі і буяў квітнеючы сад. Дзень і ноч сотні рабоў вярцелі велізарныя калёсы, падаючы ў вісячыя сады ваду ракі Еўфрат. Квітнеючыя вісячыя сады Семірамiды – гэта адзін з цудоўных твораў чалавечага розуму і ўмелых рук. А знаходзіліся квітнеючыя вісячыя сады ў самым вялікім і багатым горадзе Старажытнага Усходу. Як называўся гэты горад? Правільна, Вавілон! Атрымайце прызавую кветку. *(Дзяўчына дорыць кветку правільна адказаўшай камандзе.)*

Д з е д-У с я в е д (*гартаючы кнігу*). У сёмым стагоддзі Егіпет стаў месцам кахання дзвюх пануючых асоб – царыцы Клеапатры і рымскага консула Марка Антонія.

*(Гучыць егіпецкая мелодыя, на сцэну выходзяць Клеапатра і Служанка, якая выносіць столік з садавінай і віном.)*

К л е а п а т р а. Сёння прыедзе Марк Антоній, у яго гонар у гэтай зале я наладжу пір, таму ўсю падлогу я загадваю пакрыць шоўкам і пялёсткамі маіх любімых кветак.

С л у ж а н к а. Але гэта будзе каштаваць вялізныя грошы.

К л е а п а т р а. Нічога, гэта будзе проста шыкоўна і Марку ўсё спадабаецца.

С л у ж а н к а. Клеапатра, Маркам Антоніем авалодала незвычайная падазронасць, як ты зможаш пераканаць яго ў шчырасці свайго кахання?

К л е а п а т р а. Я загадала атруціць ядам маёй любімай кветкі вянок і калі мы будзем піць віно, я змагу даказаць яму сваё каханне.

(*Яны пакідаюць пляцоўку, цікае гадзіннік, гучаць парадныя трубы і голас: "Консул Рыма – Марк Антоній!". На сцэну выходзяць Антоній, Клеапатра і служка. Гучыць музыка.)*

К л е а п а т р а. Вітаю цябе, Марк Антоній, вітаю гонар Рыма і маё каханне!

А н т о н і й. Я таксама кахаю, але не веру табе, Клеапатра! Увесь Рым гаворыць аб тваім вераломстве і жаданні атруціць мяне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

К л е а п а т р а. Любы, маё каханне да цябе чыстае, як кропля ранішняй расы, як пацалунак дзіцяці, як сок гэтай гронкі вінаграду. Пакаштуй, і ты пераканаешся!

А н т о н і й. Я не пачну пір, пакуль слуга не адведае ўсе стравы.

К л е а п а т р а. Юлій, адведай царскія стравы!

*(Служка каштуе вінаград, печыва, віно.)*

А н т о н і й. Я згодзен раздзяляць з табою застолле.

*(Клеапатра і Антоній падыходзяць да стала, садзяцца. Клеапатра ўзмахнула платком, на сцэне – танец егіпецкіх рабоў, у час якога Клеапатра і Антоній п'юць віно, спрабуюць розныя стравы. Пасля танца Антоній здымае з Клеапатры вянок і сыпле яго лісце ў сваю чашу.)*

А н т о н і й. Ува мне жывуць каханне і рэўнасць, каханне і падазронасць, але я хачу выпіць за цябе, Клеапатра!

К л е а п а т р а *(вырываючы з яго рук чашу)*. Паглядзі, дарагі Антоній, як я магла лёгка ад цябе пазбавіцца, калі б толькі я магла без цябе жыць! Юлій! Падыдзі і адведай віна! *(Служка падыходзіць, выпівае віно і валіцца на падлогу.)*

А н т о н і й. Ты выратавала маё жыццё! Ты – сама вернасць і шчырасць, бо ты пераканала мяне, што каханне застаецца жыць!

*(Усе персанажы застываюць у стоп-кадры.)*

Д з е д-У с я в е д. Вось такі факт з гісторыі кветак. Аб чым ён гаворыць – думайце самі, але вось якое пытанне: "Як называліся любімыя кветкі Клеапатры, якімі яна загадала пакрыць падлогу і сокам якіх атруціла вянок?" *(Ружы.)*

Сапраўды, гэта ружы! Першыя звесткі аб ружы мы знаходзім у старажытнаіндускіх паданнях, дзе яе з'яўленне звязваюць з богам Вішну. У Персіі ружа атрымала такую любоў і распаўсюджанасць, што ў паэтаў краіна атрымала назву "Гулістран" – сад руж. Краінай руж называюць Балгарыю, дзе з іх рыхтуюць ружовае масла. А ў Англіі XV стагоддзя паміж дынастыямі Ланкастэраў і Ёркаў 30 гадоў доўжылася барацьба за каралеўскую ўладу. Знаўцы гісторыі, адкажыце, як называлася гэта вайна?

*(Удзельнікі адказваюць.)*

Правільна, вайна Алай і Белай ружы, якія былі сімваламі гэтых дынастый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Атрымайце прызавыя васількі! *(Пад музыку ўдзельнікі атрымліваюць жэтоны-васількі.)*

Д з е д-У с я в е д. Мы гартаем далей нашу кнігу прыроды і пераносімся ў Францыю *(чытае):* "У XII стагоддзі на прасторах Малой Азіі разгарнулася жорсткая барацьба паміж туркамі і хрысціянамі Еўропы за гроб Ісуса Хрыста, які знаходзіўся ў Іерусаліме. Важную ролю ў гэтай барацьбе адыграла Францыя.

*(Гучыць музыка Сярэдніх вякоў, на сцэне з'яўляюцца некалькі прыдворных і мажардом французскага двара. Ён тройчы стукае трасцяной палкай па падлозе.)*

М а ж а р д о м. Яго вялікасць кароль Францыі Людовік VII!

*(Пад музыку на сцэне з'яўляецца кароль, прыдворныя кланяюцца.)*

Л ю д о в і к VII. Я сабраў усіх вас, каб паведаміць маё канчатковае рашэнне. Мы будзем удзельнічаць у другім крыжовым паходзе супраць мусульман. Герцаг Анжуйскі, вы былі з пасольскай місіяй у розных краінах. Аб чым вы дамовіліся?

Г е р ц а г. Рымскі Папа даў сваё высокае благаславенне. У паход ідзе ўвесь хрысціянскі свет. Лепшыя ў свеце швейцарскія лучнікі, рыцары Англіі, Саксоніі, Іспаніі і Італіі – гэта вялікая моц! Генуэзскія купцы перавязуць войска праз Міжземнае мора на сваіх караблях за невялікія грошы. З піратамі Сіцыліі і Італіі ёсць дамоўленасць, што яны не будуць нападаць на нашыя караблі.

Л ю д о в і к VII. Гэта ўсё добра, але я настойваў і настойваю, каб мы пайшлі ў паход асобным атрадам.

Г е р ц а г. На гэта згодны ўсе манархі, але яны патрабуюць, каб па звычаях нашага часу вы, як начальнік асобнага атрада, выбралі для размяшчэння на сваім сцягу сімвалічную эмблему і давялі гэта да ведама ўсіх.

Л ю д о в і к VII *(у роздуме)*. Майму продку, каралю Хлодвігу, Бог ужо падараваў кветку, выяву якой ён выкарыстаў у сімволіцы сцяга, перамог ворагаў хрысціянства і стаў заснавальнікам французскай нацыі. Гэта кветка – яго баявы запавет. *(Рашуча.)* Залатым колерам тройчы яна будзе ззяць на маім белым сцягу, напамінаючы воінам пра подзвіг гасудара, які выгнаў з Айчыны рымлян. Белы сцяг! Белы сцяг і тры кветкі прынясуць нам перамогу над няверным і! У паход!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Гучыць музыка, персанажы пакідаюць сцэну.)*

Д з е д-У с я в е д. Тры кветкі. У далейшым яны сталі эмблемай каралеўскай улады і вернасці папскаму прастолу. Як называлася гэтая кветка? *(Удзельнікі адказваюць.)* Правільна, лілея! Я прашу пад гукі старадаўняй французскай мелодыі ўручыць прызавыя васількі тым, хто адказаў на пытанне правільна.

Д з е д-У с я в е д (*гартаючы кнігу, чытае*). Сярэднія вякі. Па ўсёй Еўропе грымяць шчыты і мячы, ламаюцца коп'і на турнірах, дзе рыцары аспрэчваюць свой гонар і славу. Найлепшымі лічыліся штогоднія турніры Іспаніі, дзе сустракаліся лепшыя рыцары Еўропы.

*(Гучыць традыцыйная музыка Іспаніі. На сцэну выносяць два крэслы для караля і каралевы. На сцэну выходзіць герольд з сурмой. Гучаць гукі сурмы.)*

Г е р о л ь д. Пачынаем рыцарскі турнір у гонар імянін каралевы Іспаніі. На бой выклікаюцца два лепшыя рыцары хрысціянскага свету – праслаўлены Чорны рыцар з Польшчы і гонар Іспаніі – Залаты рыцар! Вітаем рыцараў!

*(Пад гукі сярэднявечнай музыкі і воплескі прысутных на сцэну выходзяць рыцары. Яны кланяюцца ва ўсе бакі і падымаюць мячы. На фоне музыкі праходзіць бой рыцараў. У фінале пераможца кланяецца ўсім прысутным, здымае шлем, бярэ ў рукі букет цюльпанаў і становіцца на калена перад каралевай.)*

Р ы ц а р. Ваша вялікасць, каралева Ганна! Па звычаёваму рыцарскаму праву я выбіраю Вас дамай сэрца і ваш гонар я буду адстойваць, пакуль будзе біцца маё сэрца. Прыміце ў дар гэтыя кветкі – сімвал рыцараў і кахання! *(Стоп-кадр.)*

Д з е д-У с я в е д. Прыкладна так праходзілі рыцарскія турніры. Але ў гэтым турніры можна заўважыць прынцыповую памылку. Разгадайце яе. *(Рыцар падараваў каралеве цюльпаны. А гэта няверна. Кветкамі рыцараў з'яўляюцца маргарыткі, якія дарылі ў час турніраў.)*

Гэту складаную загадку вызначыў удзельнік каманды____. Ён атрымлівае два прызавыя васількі! *(Пад музыку ідзе перадача жэтона – васілька.)*

*(Дзед-Усявед раскрывае наступную старонку кнігі. Гучыць лірычная музыка цымбалаў.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д з е д-У с я в е д. Ну, вось мы і вярнуліся з падарожжа дамоў, у Беларусь. Спякотным чэрвеньскім днём, удыхаючы водар кветак і траў, выйдзіце за ваколіцу вёскі. Вы пабачыце, як уздоўж хлебнага поля то тут, то там запальваюцца пяшчотна-блакітныя або сінія васількі:

Ходзяць на арбіце летнія дзянькі,
Расквітнелі ў жыце кветкі васількі,
Вечар ярка зорыць мой любімы кут,
Любы мне падорыць васільковы цуд.

І два сэрцы млеюць ад гарачых слоў,
На душы квітнеюць горы васількоў,
Кветкі палявыя звяжуцца ў вянок,
Вёсны маладыя косіць Васілёк.

Ой ты, водар ночы, цеплыня рукі,
Васількові вочы, быццам васількі,
Сонна ночка тае аксамітам рос,
Два жыцці сплятае ў адзіны лёс.

Вось такія цудоўныя вершы пра кветку і каханне напісаў беларускі паэт І.Цітавец. Васілёк – любімая кветка беларусаў. У даўнія часы яна была занесена да нас з Заходняй Азіі і стала нашай нацыянальнай кветкай. Васількі з'яўляюцца элементамі арнаменту ў народных вышыўках, дзе іх выявы заўсёды бачны з калоссямі жыта, яны ўплецены ў Дзяржаўны герб Беларусі. Васілёк стаў сімвалам нашага свята. Падкажыце, а ў якіх рытуалах і забавах беларускіх народных свят каляндарнага цыкла васілёк ужываюць у якасці аздаблення абрадавых дзей на Купаллі і Дажынках?

*(Удзельнікі гавораць, што яго ўплятали ў купальскія вянкі і варажылі аб лёсе. Па заканчэнні жніва імі пераплятали дажыначны сноп і ўрачыста перадавалі гаспадару поля. Васількі з жытнімі каласамі (як сімвал ураджаю) стаялі ў чырвоным куце кожнай хаты. Хто з удзельнікаў каманды найбольш дакладней выказаў меркаванне пра васілёк, той і атрымлівае жэтон-васілёк).*

Д з е д-У с я в е д. Васілёк – цудоўны меданос, ні чмель, ні пчала не мінаюць яго. У даўніну з васілька здабывалі сінюю фарбу і рабілі воцат, адварам яго настою лячылі хворыя вочы. Васілёк – гэта адзіная на славянскай прасторы кветка,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая ў пэўны час становіцца грашовай адзінкай. Пачынаючы з канца XX стагоддзя на адным са свят Беларусі рэгулярна выпускаюць святочныя грошы – "васількі", якімі ўдзельнікі карыстаюцца ў гандлёвых радах нараўне з беларускімі рублямі. У 2003 годзе ЮНЕСКА прызнала гэтае свята лепшым у Еўропе! Як называецца свята з "васільковымі" грашыма? *(Міжнароднае свята мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".)* Я прашу таго, хто сказаў поўную назву свята, атрымаць прызавы васілёк! *(Пад музыку ўдзельнік алімпіяды атрымлівае жэтон-васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. Паглядзіце, зноў наш чароўны вянок зазіхацеў і пачаў пераліваецца агнямі. Гэта сведчыць пра тое, што ён выходзіць на арэну выпрабаванняў, каб ацэньваць змаганні наступных удзельнікаў. Вянок – гэта старажытнейшы сімвал узнагароды, гонару. Вянок з зеляніны і кветак ва ўсіх народаў у даўнія часы ўжываўся ў час свят, а таксама ахвярапрынашэнняў як знак саюзу паміж нашчадкамі і продкамі, таму на ранняй стадыі ён разглядаўся як сімвал бессмяротнасці.

У антычныя часы вянок ператварыўся ў сімвал узнагароды – ім увенчвалі пераможцаў Алімпійскіх і Немейскіх гульняў, пераможцаў змаганняў у галіне спорту і мастацтва.

У старажытным Рыме ён стаў сімвалам воінскай доблесці, а ў нашыя часы – састаўной часткай гербаў многіх краін свету.

Вянок – гэта сімвал, умоўны знак, таму ён выклікае на сцэну знаўцаў кветкавай геральдыкі.

*(Гучыць музыка, знаўцы геральдыкі ўсіх каманд падымаюцца на сцэну і выходзяць да мікрафона.)*

Д з е д-У с я в е д. Паважаныя знаўцы геральдыкі! На нашым вянку вы бачыце сем дубовых лісцікаў, на адваротным баку якіх напісаны розныя пытанні па геральдыцы.

Я прашу вас падысці да вянка і ўзяць адзін лісцік. *(Удзельнікі выконваюць заданне.)* Вам даецца пяць хвілін, за гэты час вы павінны азнаёміцца з пытаннем, падрыхтавацца і даць адказ.

*Удзельнікі бяруць паперкі і рыхтуюцца да адказу.*

*На лісточках дуба напісаны пытанні:*

1. Якую кветку кароль Рычард Львінае Сэрца зрабіў англійскай эмблемай? *(Ружу.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Гірлянда з якіх раслін у Беларусі стала эмблемай памяці? *(Хваёвая гірлянда з кветкамі, перавітая алай стужкай.)*

3. Ружа якога колеру з'яўляецца гербам Пекіна – сталіцы Кітая? (*Жоўтая ружа.)*

4. У гербе якой паўночнай краіны дзевяць белых руж? *(Фінляндыі.)*

5. Якая дзяржава мае ў сваім гербе нарцыс? *(Уэльс.)*

6. Якія кветкі красаваліся на сцягах французскіх каралёў у Сярэднявеччы? *(Тры лілеі. У гэтыя часы Францыю называлі царствам лілей, а караля – каралём лілей.)*

7. Сімвалам якой краіны з'яўляецца 16-пялёсткавая хрызантэма? *(Японіі.)*

8. Якая кветка была геральдычным знакам Напалеона? *(Фіялка.)*

*(Пры ўмове правільнага адказу ўсіх удзельнікаў дадатковае (восьмае) пытанне задаецца, каб выявіць пераможца конкурсу.)*

Д з е д-У с я в е д. Пакуль нашы знаўцы геральдыкі абдумваюць пытанні, мы з вамі наладзім караоке. Зараз будзе гучаць фанаграма песень аб кветках, а мы ўсе хорам будзем спяваць. Якая каманда будзе спяваць лепш, тая заваюе прызавы васілёк. Пачынаем караоке!

*(Гучыць музыка, пачынаецца агульнае выкананне песень.)*

Д з е д-У с я в е д. Вы бачыце, замільгацеў наш чароўны вянок, а гэта значыць, што час спеваў скончыўся і мы пачынаем конкурс знаўцаў геральдыкі.

*(На сцэне знаўцы геральдыкі адказваюць на пытанні, у час правільных адказаў пераліваецца рознакаляровымі агеньчыкамі вянок, журы падводзіць вынікі конкурсу геральдыкі і караоке.)*

Д з е д-У с я в е д. Гартаючы старонкі кнігі прыроды, мы заўважылі, што на свеце многа краін адзначаюць свята кветак. Напрыклад, у Японіі ў лютым святкуецца квіценне сліў, у сакавіку – персікаў, у красавіку – вішань, у маі – вістарый, у чэрвені – півонь, а ў кастрычніку – хрызантэм. У вёсках Францыі дагэтуль у першую майскую нядзелю адзначаюць свята ландыша – кветкі з незвычайна прыемным водарам, снежна-белыя званочкі якога спяваюць пераможны гімн вясны. У гэты дзень сабранымі ў лесе ландышамі – сімваламі вясны – людзі ўпрыгожваюць вокны, каміны і сталы, у за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

столлі спяваюць песні ў гонар ландыша і, нарэшце, збіраюцца на танцы, дзе хлопцы запрашаюць дзяўчат у карагод, і, калі дзяўчына згодна правесці з хлопцам увесь вечар, яна дорыць яму букецік ландыша.

Давайце ўявім, што мы знаходзімся ў французскай вёсцы на свяце ландыша. Наша сцэна і зала – гэта танцавальная пляцоўка. Зараз пачне гучаць музыка і хлопцы будуць запрашаць дзяўчат сваёй каманды на танцы. Якая каманда выставіць на пляцоўку больш танцораў і будзе лепш за іншых танчыць, тая атрымае прызавы васілёк.

Пачынаем вечарыну ландыша!

*(Гучыць музыка французскіх кампазітараў: танга, вальс, факстрот – сцэна пераўтвараецца ў танцавальную пляцоўку, у фінале танцаў каманда-пераможца атрымлівае прызавы васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. Працягваючы тэму “Кветкі і свята”, трэба сказаць, што ў многіх краінах праводзяцца агульныя святы кветак, а ў некаторых яны прысвечаны найбольш любімым кветкам, у гонар якіх наладжваюцца пышныя ўрачыстасці. Зараз я буду называць кветкі, а вы адкажыце, у якіх краінах існавалі ці існуюць іх святы. Зразумелі? Дык вось, мы пачынаем:

– Свята ружы? (*Іран, Францыя, Балгарыя.)*
– Свята цюльпанаў? *(Галандыя.)*
– Свята нарцысаў? *(Швейцарыя.)*
– Свята ландыша? (*Германія, Францыя.)*
– Свята лотаса? *(Егіпет.)*
– Свята незабудкі? *(Англія.)*

*(Хто з удзельнікаў адказаў правільна, атрымлівае прызавы васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. У Беларусі на працягу апошніх 10 гадоў сімвалам аднаго з самых прэстыжных свят, якое праводзіцца ў чэрвені, стала featurerознакаляровая кветка творчасці, а адметнымі асаблівасцямі гэтага свята з’яўляюцца выстава і кірмаш кветак розных народаў. Як называецца гэтае свята? *(Усебеларускі фестываль нацыянальных культур у горадзе Гродне. Удзельнік, які правільна адказаў на гэтае пытанне, атрымлівае прызавы васілёк і буклет Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д з е д-У с я в е д. На беларускім народным свяце “Купалле” раніцай або вечарам дзяўчаты заўсёды збіралі кветкі, а пасля каля храмаў наладжвалі сапраўдныя кірмашы кветак і зёлак. Каля кастроў або на вадзе ў час гэтага паэтычнага, чароўнага свята дзяўчаты варажылі на кветкавых вянках пра каханне і будучы лёс. І ўсе шукалі ў лесе сімвал надзеі і шчасця – папараць-кветку.

Вось і зараз, падтрымліваючы гэтую традыцыю, мы з вамі будзем яе шукаць, а хто яе знойдзе – будзе прызнаны самым шчаслівым чалавекам нашага свята і прынясе сваёй камандзе прызавы васілёк. Гэтая кветка можа знаходзіцца ў самым незвычайным месцы – на галінках дрэў, кустоў, у траве, пад вашымі крэсламі, на сцэне. А пазнаеце вы яе па лісточках папараці і яскравай кветцы. Кветка знаходзіцца недалёка, не больш чым у дзесяці метрах ад мяне. Дык вось, шукаем кветку шчасця!

*(Гучыць вясёлая мелодыя беларускай полькі. Усе шукаюць папараць-кветку. Пераможца атрымлівае падарунак і жэтон-васілёк.)*

Д з е д-У с я в е д. Нарэшце, надышла чарга аднаго з самых адказных турнірных выпрабаванняў алімпіяды знаўцаў кветак – конкурс капітанаў!

*(Гучаць урачыстыя фанфары.)*

Д з е д-У с я в е д. Мы запрашаем на сцэну самых мудрых і знаходлівых інтэлектуалаў – капітанаў сямі каманд – выкладчыкаў батанікі!

*(На фоне музыкі капітаны падымаюцца на пляцоўку да мікрафонаў.)*

Д з е д-У с я в е д. Паважаныя капітаны! Зараз мы з вамі правядзём алімпійскі турнір з выбываннем – чвэрцьфінал, паўфінал і фінал. Пасля першага тура з ліку ўдзельнікаў турніра выбываюць тры капітаны, пасля другога тура – два капітаны і ў фінале сустракаюцца двое самых лепшых знаўцаў кветак.

У час турніра капітаны павінны адказаць на прапанаваныя пытанні. За кожны правільны адказ удзельнік атрымлівае прызавы васілёк, які ўключаецца ў агульную суму каманды, а пераможца турніра, акрамя таго, атрымлівае яшчэ тры прызавыя васілёчкі. Судзіць вашыя адказы будзе сімвал нашай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

алімпіяды – чароўны вянок, які будзе зіхацець рознакаляровымі агеньчыкамі пасля кожнага правільнага адказу.

*(У эфіры гучыць музыка-роздум.)* У конкурсе капітанаў на абмеркаванне кожнага пытання даецца 5 секунд.

Мы пачынаем чвэрцьфінал:

– Самая вялікая кветка? *(Архідэя, дыяметр пялёсткаў да двух метраў.)*

– Самая маленькая кветкавая расліна? *(Раска, памер ад 2 да 10 мм)*

– Самая вялікая травяністая кветкавая расліна? *(Банан, да 7 м вышынёй.)*

– Якая кветкавая расліна мае да 100 *м* у вышыню? *(Эўкаліпт.)*

– Якая кветкавая расліна дажывае да 1000 гадоў? *(Дуб.)*

– У якой краіне вышэйшая ўзнагарода – ордэн Хрызантэмы? *(Японіі.)*

– Якая горная кветка занесена ў Чырвоную кнігу? *(Эдэльвейс.)*

– Якім газам дыхае расліна ў светлы час сутак? *(Вуглекіслым газам.)*

– У якой краіне васілёк – сімвал свабоды? *(Бельгіі.)*

– Пры дапамозе чаго ў расліне ўтвараецца хларафіл і ідзе фотасінтэз? *(Святла.)*

– Калі поле бывае блакітным? *(Калі цвіце лён.)*

– Царыца кветак?*(Ружа.)*

– Кветка русалак? *(Гарлачык.)*

– Любімая кветка Жан Жака Русо? *(Барвінак.)*

– Кветка мар і курыльшчыкаў опія*? (Мак.)*

– Эмблема закаханых у сябе? *(Нарцыс.)*

– Любімая кветка кітайцаў? *(Півоня.)*

– Любімец турэцкіх гарэмаў і кветка біржавой ігры? *(Цюльпан.*)

– Кветка – зорка? *(Астра.)*

– Расліна “След белага чалавека”? *(Падарожнік.)*

– Кветка – капюшон? *(Настурцыя.)*

– Народная назва бегоніі? *(Вуха Напалеона.)*

– Сонечная кветка? *(Сонечнік.)*

– Кветка памяці? *(Незабудка.)*

– Дзікая ружа? *(Шыпшына.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Беларуская прымаўка кажа: “Няма ягады без кветкі”. А якая ягада самая вялікая? *(Кавун.)*

Д з е д-У с я в е д. Ну вось і завяршыўся чвэрцьфінал. Я прашу членаў журы вызначыць чатырох удзельнікаў паўфінала. *(Журы падводзіць вынікі, прайграўшыя атрымліваюць прызавыя васількі за правільныя адказы і пакідаюць пляцоўку. Гучаць урачыстыя фанфары.)*

Мы пачынаем паўфінал. Уважліва слухайце пытанні:

– Кветка, якая расце ў жыце? *(Васілёк.)*

– Дзе захоўвае ваду кактус? *(У сцябліне.)*

– Фіялка – гэта аднагадовая ці двухгадовая расліна? *(Аднагадовая.)*

– Што такое двухполая кветка? (*У якой ёсць песцік і тычынка.)*

– Якая травяністая кветкавая расліна пачынае свой рост зімой пад снегам? (*Пралеска.)*

– Ці ёсць кветка ў папараці? *(Няма.)*

– Як размнажаецца папараць? *(Спорамі.)*

– Што такое фотасінтэз? *(Працэс стварэння арганічных рэчываў з неарганічных з выкарыстаннем энергіі святла.)*

– Вянкі з лісця якога дрэва пляді для пераможцаў Алімпійскіх гульняў у Старажытнай Грэцыі? *(Лаўр.)*

– Як называецца першы запаведнік на ўсходнеславянскай тэрыторыі? *(Белавежская пушча.)*

– Любімая кветка Гётэ? *(Фіялка.)*

– Сталіца старажытных персаў называлася Суза. Што гэтае слова азначае ў перакладзе? *(Горад лілей.)*

Д з е д-У с я в е д. Паўфінальная баталія скончылася, і я прашу журы падвесці вынікі. *(Журы аб’яўляе фіналістаў конкурсу. Прайграўшыя ўдзельнікі атрымліваюць падарункі за ўдзел і пакідаюць пляцоўку. Гучаць урачыстыя фанфары.)*

Д з е д-У с я в е д. Мы пачынаем фінал конкурсу капітанаў. Я прашу падтрымаць нашых інтэлектуалаў дружнымі воплескамі (*усе апладзіруюць)*. Зараз кожнаму з капітанаў па чарзе мы будзем задаваць пытанні дзесяціраўндавага паядынку.

Вось якія пытанні мы падрыхтавалі для фіналістаў:

– Якая кветка ў казцы была калыскай эльфаў і з яе з’явілася Дзюймовачка? *(Цюльпан.)*

– Якія кветкі ў казцы шукала Беласнежка? *(Ландышы.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Назавіце пісьменнікаў або творы, дзе ўпамінаецца цюльпан? *(А.Дюма “Чорны цюльпан”, А.Дюма “Віконт дэ Бражэлон”, А.Купрын “Сталетнік”.)*

– Адкуль родам бэз? *(З Малой Азіі.)*

– З якой кветкай кітайцы сустракаюць Новы год? *(З нарцысам.)*

– Народная прыкмета кажа: трэба садзіць бульбу, калі цвіце...? *(Чаромха).*

– Паводле легенды гэтая кветка ў старажытнасці служыла парасончыкам для маленькіх гномікаў, а зараз на гэтай кветцы дзяўчаты варожаць пра лёс і каханне. Як яна называецца? *(Рамонак.)*

– Якую траву з сухімі залацістымі кветкамі называюць лекамі ад 99 хвароб? *(Зверабой.)*

– У назвах якіх кветак змяшчаюцца імёны людзей? *(Маргарытка. Лілія. Разалія. Анюціны вочкі. Іван ды Мар’я.)*

– За выратаванне жыцця суайчыннікаў у Старажытным Рыме ўзнагароджвалі ганаровым вянком. З лісця якога дрэва плялі гэты вянок? *(З дуба.)*

– Якія кветкі знаходзяцца ў сучасным гербе Канады? *(Ружа, лапух і нарцыс, якія паказваюць на тых, хто заклаў аснову канадскай дзяржавы – Англія, Шатландыя, Уэльс.)*

– У Інданезіі ёсць расліна, якая расце па краях кратэраў вулканаў. Яна заўсёды напярэдадні вывяржэння вулканаў расцвітае, і гэта служыць папярэджаннем людзей аб небяспецы. Як называюць гэтую “каралеву землятрусаў”? (*Каралеўская прымула.)*

– Што сімвалізуе ў Беларусі дзявочы вянок з палявых кветак? *(Цнатлівасць.)*

– У час аднаго са свят дзяўчаты, варожачы на лёс, кідалі вянкі кветак на бярозу. Як называецца гэтае свята? *(Сёмуха.)*

– Як у Беларусі называюць празрыстую тканіну, прымацаваную да вянка (з’яўляецца часткай жаночага шлюбнага ўбору)? *(Вэлюм.)*

– Пры дапамозе якой кветкі жанчыны асвятляюць валасы? *(Рамонка.)*

– Якую кветку ніколі нельга пабачыць? (*Папараць-кветку, бо яна не існуе.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

… І тчэ, забыўшыся, рука
Замест пярсідскага узору
Цвяток радзімы васілька.
– Хто напісаў гэтыя вершы? *(Максім Багдановіч.)*

Д з е д-У с я в е д. Вось і закончыўся конкурс капітанаў. Паважаныя ўдзельнікі, як вы лічыце, хто перамог у гэтым змаганні? Па вашых апладысментах мы зараз выявім пераможцу нашага спаборніцтва! *(Удзельнікі падтрымліваюць сваіх капітанаў. Гучаць урачыстыя фанфары.)* А зараз слова прадастаўляецца журы!

*(Журы падводзіць вынікі. Пад музыку капітанам уручаюцца прызавыя васількі.)*

Д з е д-У с я в е д. Кветкі знайшлі адлюстраванне ў творчасці многіх паэтаў і кампазітараў, захаваліся ў творах вуснапаэтычнай творчасці. Нашы ўдзельнікі, рыхтуючыся да правядзення алімпіяды, старанна вывучалі легенды, паданні, песні, вершы аб кветках, рыхтавалі пластычныя і харэаграфічныя кампазіцыі аб кветкавых раслінах.

І зараз мы распачынаем творчы конкурс алімпіяды. Кожная каманда па чарзе будзе дэманстраваць свае нумары, а нашае журы вызначыць лепшых выканаўцаў у намінацыях “вуснапаэтычная творчасць”, “верш”, “песня”, “танец”. Пераможцы намінацый прынясуць сваім камандам па тры прызавыя васількі.

Капітанаў каманд я прашу падысці да нашага вянка і выцягнуць з рамонка пялёстак, на якім напісаны парадкавы нумар вашага выступлення.

*(Гучыць музыка. Капітаны каманд падыходзяць да рамонка, выцягваюць пялёстак і абвяшчаюць парадкавы нумар канцэрта сваёй каманды. На сцэне адбываецца творчы конкурс каманд, вядучымі праграм з’яўляюцца кіраўнікі дэлегацый-удзельніц.)*

Д з е д-У с я в е д. Ну вось і закончылася наша падарожжа па краіне кветак. Пакуль журы будзе падводзіць вынікі, мы для ўсіх удзельнікаў алімпіяды праводзім кветкавую дыскатэку. Гэта апошні конкурс, які ацэньваецца ў тры балы і можа значна палепшыць стан любой каманды. А задача каманд – масавасць удзелу і якасць выканання танцаў, у час якіх вы павінны ўразіць усіх прысутных. Кожная каманда танчыць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межах свайго пялёстка, а яе найлепшая пара выходзіць на пляцоўку. Пачынаем дыскапраграму!

*(Праходзіць танцавальны конкурс. Адзін з членаў журы ацэньвае ўзровень выступленняў каманд, а астатнія падводзяць вынікі. Танцавальная праграма складзена з мелодый аб кветках.)*

*Гучаць фанфары.*

Д з е д-У с я в е д. Для падвядзення вынікаў алімпіяды знаўцаў кветак я запрашаю на сцэну нашае паважанае журы!

*На фоне музыкі члены журы абменьваюцца сваімі ўражаннямі аб алімпіядзе, старшыня журы падводзіць вынікі. Пад урачыстую музыку пачынаецца рытуал узнагароджання пераможцаў.*

*Усе ўдзельнікі атрымліваюць памятныя падарункі. (Кнігі пра кветкі.)*

*Пераможцы творчых намінацый атрымліваюць ганаровую ўзнагароду – ордэн "Васілёк".*

*Пераможцу конкурсу капітанаў на плечы ўскладаюць "залатую" стужку з надпісам "Знаўца кветак".*

*Каманда-пераможца атрымлівае Ганаровую грамату ў выглядзе кветкі і вялікі торт у форме васілька, а ўсім удзельнікам каманды на галаву дзяўчаты ўскладаюць вянок з зеляніны і кветак.*

*У гонар пераможцаў гучыць урачыстая музыка і ўспыхвае белымі бенгальскімі агнямі піратэхнічная кветка.*

***Аўтары сцэнарыя П.А.Гуд, Н.І.Гуд***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МУЗЫКА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*На задніку сцэны замацавана эмблема праграмы “Музыка беларускай прыроды” ў выглядзе спяваючага салаў’я.*

*Па баках ад эмблемы размяшчаюцца сімвалы прыроды: птушкі, жывёлы, расліны і інш.*

*На сцэне ў хаатычным парадку знаходзяцца розныя музычныя інструменты, якія з’яўляюцца не толькі часткай дэкарацый, але будуць выкарыстоўвацца ў якасці рэквізіту. Пляцоўка ўпрыгожана дэкаратыўнымі раслінамі. Лейтматыў праграмы – інструментальны твор А.Іванова “Шум дубраў”.*

*Перад пачаткам праграмы гучыць фонавая музыка па тэматыцы свята з рэпертуару беларускіх аўтараў.*

*У пачатку гульнёвай праграмы гучаць фанфары, пасля якіх выключаецца святло і пачынае гучаць кампазіцыя “Шум дубраў” А.Іванова, чуюцца шум і гукі жыхароў лесу. На закрытую заслону з дапамогай відэапраектара дэманструюцца пейзажы беларускай прыроды, беларускіх лясоў.*

*Гучыць урывак верша “Салавей” Язэпа Пушчы:*

Салавей, пясняр крылаты,
Прыляцеў вясной дахаты.
Пад лістком расінку соку,
Выпіў чыстага, як вока.
Пакланіўся зорцы ў пояс,
І спрабуючы свой голас,
Над крыніцаю, у вербах,
Ліўся гоман чыстым срэбрам.

*(Заслона адкрываецца. На сцэну, з аднаго боку, крадучыся, выходзіць Воўк, а з супрацьлеглага боку сцэны з’яўляецца Заяц. Воўк заўважае гледачоў у зале, героі ў аняменні спыняюцца, пачынаюць размову.)*

В о ў к. Слухай, Касы! Ды не пужайся ты мяне! У мяне яшчэ ранкам зусім апетыт знік! Ой! Ты толькі паглядзі, што тут такое адбываецца?!

З а я ц. І сапраўды. Куды мы трапілі, колькі людзей шмат, мабыць, на нейкі сход сабраліся!

*На сцэну выбягае паляўнічы са стрэльбай. Воўк і Заяц хаваюцца за дрэва.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

П а л я ў н і ч ы (*азірнуўшыся*). Прыпыначак! Укусі мяне пчала, бачу, што маё паляванне скончылася, так і не паспеўшы пачацца. І казала мне даражэнькая цёшча, што не дадуць мне як трэба папаляваць у лесе. А шкада, вельмі шкада, колькі тут жывёл і птушак – толькі паспявай страляць!

*(На сцэну пад фанаграму песні “Алеся” ў выкананні ансамбля “Сябры” выходзіць вядучая праграмы – гаспадыня беларускай прыроды Алеся.)*

У с е р а з а м. А гэта хто ідзе ?

В о ў к. Гэта Алеся – гаспадыня нашага лесу!

А л е с я. Сябры, не здзіўляйцеся. Справа ў тым, што сёння, тут зараз пойдзе размова аб цудоўным, таямнічым і загадкавым. Пра музыку беларускай прыроды. Дарэчы, усе вы: і ты, Воўк, і ты, Зайчык, і ты, Паляўнічы, маеце да гэтага непасрэднае дачыненне.

У с е р а з а м. І гэта якое ж?

А л е с я. Усе вы з’яўляецеся неад’емнай часткай беларускай прыроды. Вы – жыхары ляснога царства. Уявіце зараз сабе, што мы знаходзімся ў старым магутным бары.

*(Гучыць лейтматыў разам з гукамі лесу.)*

А л е с я (*на фоне музыкі чытае ўрывак з паэмы “Новая зямля” Якуба Коласа*):

Старыя хвоі і яліны,
Далёка кінуўшы галіны,
Глядзелі хораша, любоўна,
Як іх патомкі згодна, роўна
Стаялі гожай чарадою.
Схіліўшыся да сонца галавою,
У лясах, гаях дразды спявалі,
У балотах кнігаўкі крычалі.
А ў небе ўдзень і вечарамі
Высока роўнымі шнурамі
Злятаўся вырай жураўліны.
І амярцвелыя даліны
Будзілі звонкім сваім крыкам,
Як бы прыветным гэтым зыкам,
Віталі родныя балоты,
Густыя лозы і чароты.

А л е с я. Колькі тут гукаў! Усе ведаюць, як спяваюць ваўкі, і часцей за ўсё гэта адбываецца ў суправаджэнні таямніча-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га месяца на небасхіле. А Заяц у лесе самы лепшы барабаншчык. *(Звяртаючыся да гледачоў.)* Якіх яшчэ лясных музыкантаў вы ведаеце? А калі вы правільна адкажаце, то я запрашу вас у падарожжа па сваіх уладаннях. Пачнем.

*(Гучыць музычны фон.)*

1. Удзень спіць, а ўначы крычыць. *(Сава.)*

2. Ляціць конь заморскі, спявае па-польску, хто яго заб'е – сваю кроў пралье. *(Камар.)*

3. Ляціць – вые, сядзе – рые. *(Жук.)*

4. Тут бурліць, там шуміць, ды заўсёды некуды бяжыць. *(Рака.)*

5. Сівенькі жарабец па ўсім свеце ржэц. *(Гром.)*

А л е с я. А зараз крыху складаней загадкі, для самых кемлівых эрудытаў.

1. Жыве без цела, кажа без мовы, ніхто не бачыць, а ўсякі чуе. *(Рэха.)*

2. У лесе вырасла, з лесу вынеслі, у руках плача, хто слухае, той скача. *(Скрыпка.)*

3. Сама доўгая, бок дзіравы, канец закручысты, а пішчыць галасіста. *(Жалейка.)*

4. Сам пусты, голас густы, дроб выбівае, людзей збірае. *(Барабан.)*

А л е с я. Добра! Кожны, хто адгадаў загадку, атрымлівае падарунак.

П а л я ў н і ч ы. Можна, Алеся, мне сказаць? Калі б было меней браканьераў, каб было болей розумных паводзін у адносінах да лесу, то і гукаў у лесе было б значна болей.

А л е с я. Згодна з табой. Нельга без розуму высякаць лясы і без павагі адносіцца да яго жыхароў, бо так яны могуць застацца толькі ў вершах і прозе. А зараз усіх вас я запрашаю да мяне ў гасцёўню.

*Закрываецца заслона. Гучыць урывак верша "Прырода на дзіва праўдзіва" Пімена Панчанкі ў суправаджэнні музычнага лейтматыву праграмы. Пакуль чытаецца верш, на зачыненую заслону дэманструюцца пейзажы беларускай прыроды.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г о л а с. Прырода на дзіва праўдзіва!
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет нас яна нарадзіла,
А мы забіваем яе.
То смеццем, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом ...
Планету мы так прапалолі:
Нашчадкі заплацяць жыццём.

А л е с я. Я запрашаю вас на лясную паляну.

*(Адкрываецца заслона. На сцэне вакол імправізаванага вогнішча сядзіць кампанія маладых хлопцаў і дзяўчат, якія спяваюць пад гітару.)*

А л е с я. Мне вельмі прыемна вас вітаць на лясной паляне. Добры дзень, дарагія сябры! Добра спяваеце, малайцы. Вы, сябры, музычныя, а адкажыце, калі ласка, акрамя вашай песні на паляне, можна пачуць яшчэ якія-небудзь гукі? *(Адказваюць.)*

А л е с я. Так. На паляне гукаў можна пачуць не менш, чым у лесе. Праверым вашу назіральнасць. Ці пазна́еце вы гэтыя гукі? Падарунак можа атрымаць кожны.

*Чуваць гукі:*

1) пчалы,
2) камара,
3) ветру,
4) дзіка,
5) дзятла,
6) маланкі,
7) мядзведзя,
8) рэчкі,
9) зябліка,
10) ваўка.

А л е с я. Вельмі добра! Знаўцы атрымліваюць свае падарункі. Адчуваецца, сябры, ваша добрая падрыхтоўка.

*(На сцэну выходзіць Ягаднік з кошыкам.)*

Я г а д н і к. Добры дзень, Алеся!

А л е с я. Добры! Як заўсёды поўны кошык ягад назбіралі?

Я г а д н і к. Паспрабаваў бы я назбіраць не поўны, мяне б жонка… . *(Апускае галаву.)* А за поўны кошык – пахваліць. Дарэчы, каб не так хутка асушвалі балоты і забруджвалі смеццем лясы, я б з трыма кашамі поўнымі хадзіў! Спадзяю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ся, калі мы з вамі будзем з большай пашанай адносіцца да прыроды, то яна адкажа нам тым жа – аддзячыць нас сваімі пачастункамі. *(Пакідае сцэну.)*

А л е с я. І мы спадзяемся! Усім дзякуй! А зараз разам з вамі мы пойдзем за падарункамі да блакітных рэк і азёр.

*(Заслона закрываецца. На заслону дэманструюцца рэкі і азёры Беларусі. Пад музычны фон гучыць верш.)*

Г о л а с. У любую пару года,
У пагоду, непагоду,
Слухай родную прыроду –
Ты пачуеш галасы
Таямнічае красы.

З лесам, з нівай залатою
Размаўляе ветравей,
Сонца-сонейка – з зямлёю,
З цішынёю – салавей,
З небам – рэкі і азёры,
Хвалі – з маладой вярбой...
Як і што яны гавораць,
Слухай, сябра любы мой.

*(Заслона адкрываецца. Гучыць фанаграма – шум рэк. Заднік сцэны ўпрыгожаны блакітнымі хвалямі ракі.*

*Пад песню "Ой, рэчанька" з рэпертуару гурту "Песняры" гучыць урывак верша "Ручаі загулі" Анатоля Астрэйкі. На сцэне з'яўляецца рыбак з вудай і садзіцца на край сцэны, ловіць рыбу.)*

Р ы б а к. Уздыхае свабодна рака,
Плешча хваляй у бераг няроўны.
Сеці гатовы ўжо ў рыбака,
І агледжаны леташні човен.

Паплывуць караванам плыты
Да далёкага сіняга мора.
Між лясоў маладых і густых,
Паміж гор і блакітных азёраў.

*(Адразу загучала вясёлая музыка. Выходзіць Алеся, звяртаецца да Рыбака.)*

А л е с я. Тут хтосьці ёсць? Мы вам не пашкодзім? Дзякуй! Але мы жадаем даведацца, хто больш за ўсіх атрымаў пада-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рункаў? Выходзьце да мяне. Як вас завуць? *(Глядач адказвае.)* Каб цікавей было нам вандраваць, выбірайце сабе памочнікаў з сябраў, бо якое вандраванне без добрай сяброўскай песні.

*(Капітаны збіраюць каманды.)*

А л е с я. Прапаную вашым камандам музычную віктарыну. Каманды па чарзе будуць слухаць музычныя ўрыўкі, а пасля ўдзельнікі каманд павінны адгадаць назву песні і хто з'яўляецца яе выканаўцам.

*Гучаць урыўкі твораў:*

1. "Лягу-прылягу". ВІА "Сябры".
2. "Ой, у лузе...". Беларуская народная песня. Апрацоўка ансамбля "Бяседа".
3. "Малінаўка". ВІА "Верасы".
4. "Каб любіць Беларусь маю мілую". ВІА "Песняры".

А л е с я. Паважаныя гледачы, якая каманда вам больш спадабалася?

Зараз мы па апладысментах выявім каманду пераможцаў!

*(Пад апладысменты і фанфары пераможцы атрымліваюць падарункі. Раптам Рыбак выцягвае з ракі стары чаравік.)*

Р ы б а к. Вы толькі паглядзіце, чый гэта бот? Як жа не сорамна таму чалавеку за гэткі ўчынак. Рыбы тут увогуле няма, толькі чаравікі клююць. Ці яе нафта згубіла, ці рыба-піранья з'ела, не ведаю. Але трэба з гэтым нешта рабіць! Пайду.

*(Пакідае сцэну.)*

А л е с я. Паважаныя сябры, сапраўды, трэба нешта рабіць, як параіў нам паважаны Рыбак! Прыроду трэба не толькі слухаць, яе трэба яшчэ і берагчы, каб нашым нашчадкам захаваць дзіўную яе прыгажосць. І чым менш на тэрыторыі нашай радзімы будзе экалагічна небяспечных мясцін, тым лепей будзе сябе адчуваць прырода Беларусі, а з ёй і ўсё жывое.

*(Паказвае на карту, побач з эмблемай знаходзіцца фізічная карта Беларусі, на якой свецяцца чырвоныя агеньчыкі.)*

*Гучыць урывак верша "Лясы і рэкі" Пімена Панчанкі:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г о л а с. Леглі плямы мазуту і нафты,
Бруд сцякае з усіх бакоў.
Як там птушкам пяецца?
Не надта.
Як там рыбы?
Спытай рыбакоў.

Смерць лясоў для мяне непрымальна,
Як і гібель павольная рэк.
Людзі, людзі, жывіце нармальна
І пра будучы думайце век.

А л е с я. Усім дзякуй, да пабачэння!

*Гучыць музычны фон "Чысты храм прыроды", усе ўдзельнікі праграмы выходзяць на сцэну і развітваюцца з гледачамі.*

*Напрыканцы праграмы, пакуль гледачы пакідаюць глядзельную залу, гучыць фанаграма "Каб любіць Беларусь маю мілую"з рэпертуару гурту "Песняры".*

***Аўтар сцэнарыя Я.І.Сцяпанаў***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СВЯТА КВЕТАК
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Пляцоўка ўпрыгожана выявамі кветак. На бакавых кулісах размешчаны кветкавыя гірлянды. Сцэна нагадвае летняе лугавое поле. Сонечнае надвор'е.*

Харэаграфічная кампазіцыя
"Нараджэнне кветак"

*(На пляцоўцы знаходзяцца Васілёк і дзве кветачкі.)*

В а с і л ё к. Прывітанне, паважаныя госці! Сёння ў нас свята нараджэння кветак! Я вітаю вас у нашым кветкавым царстве! Гаспадар тут я, Васілёк, – служка неба, пасланы на зямлю прапаведаваць людзям веру, а Багам – вернасць. За сваё жыццё я шмат павандраваў па свеце. І сёння я запрасіў да нас некалькі іншаземных кветак. Усе яны вартыя захаплення, бо кветка – гэта незямная прыгажосць, якую трэба захоўваць і берагчы. Мне вельмі хочацца, каб кветкі, якія вы сустрэнеце сёння, прыемная музыка, гульні, конкурсы, смех, вяселле падаравалі вам адпачынак. Добрага вам настрою!

1-я к в е т к а. А зараз я запрашаю ўсіх прыняць удзел у аўкцыёне, які складаецца з дзвюх частак. Па-першае, вы павінны назваць усе вядомыя вам палявыя і лугавыя кветкі. Калі ласка!

*(Удзельнікі называюць: купальнік, расіца, лотаць, куколь, белы гарлачык, казялец і інш.)* Пераможцу запрашаю да сябе на сцэну.

2-я к в е т к а. А зараз другая частка аўкцыёна. Назавіце лясныя кветкі. Дык вось, пачынаем! *(Пралеска, гайнік, вяснянка, плакун, дзядоўнік, лянівец, сардэчнік і інш.)*. Пераможцу запрашаю да сябе на сцэну!

1-я к в е т к а *(звяртаецца да пераможцаў)*. Вам зараз патрэбна сабраць каманды колькасцю па 4 чалавекі ў кожнай.

*(Гучыць вясёлая музыка, пераможцы набіраюць каманды.)*

В а с і л ё к. І вось у нас ёсць дзве каманды. Першае заданне ўдзельнікам – прыдумаць кветкавыя назвы для сваіх каманд. *(Прыдумваюць.)*

В а с і л ё к. Цудоўна! Зараз мы будзем з вамі складаць сімвалічны рамонак! Мае памочніцы будуць трымаць сцяблінкі, на якія вы будзеце прымацоўваць пялёсткі, але спачатку гэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыя пялёсткі трэба вырабіць. І вось, вы іх выразаеце, прыклейваеце і вяртаецеся да каманды, і так па чарзе ўсе ўдзельнікі каманды. У каго рамонак атрымаецца прыгажэйшым – тая каманда і пераможа!

*(Дзве дзяўчыны трымаюць па сцябліне для кожнай каманды.)*

В а с і л ё к. Каманды, калі ласка, станце на старт, па маёй камандзе пачынаем гульню. Пачалі!

*Гучыць вясёлая музыка, праводзіцца гульня.*

*Каманда-пераможца ўзнагароджваецца цукеркамі "Рамонак".*

*Гучыць музыка "Ave Maria".)*

В а с і л ё к. Якая цудоўная музыка! Ведаеце, яна нагадала мне пра маю французскую знаёмую маргарытку, кветку рыцараў, кахання і таямнічых варожбаў. Кветка гэтая незвычайная. Існуе павер'е, што калі Дзева Марыя атрымала ад архангела добрую вестку, адразу адправілася ў дарогу да сваёй сястры. І вось, калі яна праходзіла па палях і далінах, усюды, дзе нага будучай Маці Боскай кранілася зямлі, выраслі маленькія белыя кветачкі маргарыткі.

*(Гучыць "Ave Maria", Васілёк пакідае сцэну, на пляцоўцы танчыць Маргарытка.)*

М а р г а р ы т к а. Вітаю вас! Мне вельмі прыемна быць госцей у вашай краіне. Мне хочацца даведацца як мага больш пра кветкі вашага краю. Можа вы мне дапаможаце? *(Да гледачоў.)*

1-я к в е т к а. Паразважаем аб кветках Беларусі. Паважаныя сябры, паглядзіце ўважліва на спінкі вашых крэслаў. Калі вы знайшлі на іх кветку, то выходзьце да мяне! *(4 жоўтыя і 4 чырвоныя кветкі.)* Хто з чырвонай кветкай – станьце па правы бок ад мяне, а хто з жоўтай – па левы.

2-я к в е т к а. Каманда справа будзе называцца "Цюльпан", а злева – "Хрызантэма". Судзіць будзе наша госця – Маргарытка, за кожны правільны адказ яна будзе даваць камандзе па кветачцы. У якой каманды іх будзе болей, тая і пераможа!

**В і к т а р ы н а**

2-я к в е т к а. Імчацца думы на раздолле –
Туды, дзе зелянеюць усходы,
Дзе срэбрам засвяцяцца воды.
Між гор прабіўшайся ракі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Цямнее рог сівога бору…
І тчэ, забыўшыся, рука
Замест персідскага ўзору
Цвяток радзімы… *(Васілька.)*

1-я к в е т к а. Меднастволы, як выліты, высіцца бор,
Зацвітае на ўзлессі блакітны… *(Чабор.)*

1-я к в е т к а. Стаяць у полі сястрычкі,
Жоўтае вока, белыя расністкі. *(Рамонкі.)*

2-я к в е т к а. Паліць сонца макушку,
зрабіць хоча паграмушку. *(Мак.)*

1-я к в е т к а. Пасярод двара –
залатая галава. *(Сланечнік.)*

М а р г а р ы т к а. Белыя гарошкі
на зялёнай ножцы. *(Ландыш.)*

2-я к в е т к а. Жоўты "Антон" круціцца на ножцы,
дзе сонца стаіць –
туды і паглядзіць. *(Сланечнік.)*

1-я к в е т к а. Рос Дзям'ян, вырас,
На белы свет вылез,
Праз зямлю прайшоў,
Чырвоную шапку знайшоў,
Шапку зняў,
Дзяцей спаць паклаў. *(Мак.)*

М а р г а р ы т к а. А па якія кветкі адпраўляла ў лес злосная мачыха маленькую, добразычлівую сіротку ў траскучы студзеньскі мароз? *(Пралескі.)* Ханс Крысціян Андэрсен некалі сказаў: "Кожнаму чалавеку, каб жыць на зямлі, патрэбны сонца, свабода і …" Што яшчэ, на думку аўтара, патрэбна чалавеку для сапраўднага шчасця? *(Маленькая кветачка.)*

1-я к в е т к а. Адна з першых веснавых кветак, якая прадказвае надыход вясны. У самым яе пачатку гэтая кветачка вырываецца ўверх з-пад снега, несучы на сваім сцябле бледна-зялёны бутон. *(Сон-трава.)*

2-я к в е т к а. Жыла дзяўчынка з добрым сэрцам і прамяністымі вачыма. Усім яна давярала. Жыла яна ў вёсцы. І аднойчы сустрэла дзяўчына хлопца, які абудзіў у ёй першае каханне. Усім сэрцам пацягнулася яна да яго. А хлопец спужаўся і адправіўся ў дарогу па неадкладных справах. Абяцаў вярнуцца… Доўга глядзела дзяўчына на дарогу, чакаючы каханага, і ціха гасла ад смутку. А калі загінула, то на месцы яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пахавання выраслі кветкі. Трохкаляровыя кветачкі, у якіх адлюстраваліся надзея, здзіўленне і смутак… *(Анюціны вочкі.)*

1-я к в е т к а. Некалі на зямлі быў толькі адзін сродак руху для далёкіх пераездаў – гэта ямшчына. І стройныя, забубённыя (бесклапотныя) ямшчыковыя песні ды мелодыі бубенчыкаў пад дугой разліваліся навокал – і менавіта там прараслі кветкі, дзе разліваліся пералівы гукаў. Што гэта за кветкі? *(Званочкі.)*

2-я к в е т к а. У славянскіх народаў раз у год адбывалася свята, калі сапраўдныя кветкі станавіліся падставай для танцаў, песень, вясёлых жартаў, а таксама для загадкавых шуканняў скарбаў у таямнічым цёмным лесе. Менавіта на гэтае свята апоўначы расцвітае цудоўная кветка ўсяго на некалькі хвілін. І хто знойдзе яе, будзе лічыцца самым шчаслівым чалавекам у свеце. Што гэта за свята і як завецца кветка? *(Купалле, папараць-кветка.)*

1-я к в е т к а. Гэта было ў час татара-мангольскага нашэсця. У мангольскага хана захварэў сын. Нават самыя знакамітыя знахары не маглі яму дапамагчы. І тады хан звярнуўся да паланянак, паабяцаўшы выканаць любое пажаданне той, хто зможа вылечыць сына. Наперад выйшла простая беларуская сялянка.

– Хан! Забудзь дарогу на Палессе! За гэта вылечу твайго хлопца.

І яна дастала галінкі лекавай расліны, якая расце ў нашых лясах, цвіце прыгожымі блакітнымі кветачкамі, пакрываючы зямлю пушыстым мяккім дыванам. Як вы лічыце, што гэта за расліна? *(Чабор.)*

*(Падлічваецца колькасць правільных адказаў, вызначаецца каманда-пераможца. Узнагарода адбываецца пад урачыстую музыку, усе размяшчаюцца па сваіх месцах. Выходзіць вядучы.)*

В а с і л ё к. Я бачу, вы ўжо пазнаёміліся. Маргарытка, спадзяюся, што табе ў нас падабаецца!

*(Павольная музыка змяняецца на вясёлую, урачыстую. Выходзіць пампезны Нарцыс.*

*На пляцоўцы ў паўколе знаходзяцца Васілёк, Маргарытка, дзве дзяўчыны- кветкі.)*

Н а р ц ы с. Ну!? Чаму я не чую апладысментаў? *(Глядзіць на сябе ў маленькае люстэрка.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Усе разгублена пачынаюць пляскаць у далоні.*

Н а р ц ы с. Я – Нарцыс, самая прыгожая кветка ў свеце. Мною захапляліся Шэкспір і Тургенеў. Мяне абажаюць у Англіі і Прусіі.

*(Пасля гэтых слоў Нарцыс застывае ў нерухомасці.)*

1-я к в е т к а. Цікава, а чаму ён ходзіць з люстэркам?

М а р г а р ы т к а. Гэта наказанне Багоў. Калісьці ён быў маладым юнаком незвычайнай прыгажосці. Аднойчы ў спякотны дзень, жадаючы ўталіць смагу, ён нахіліўся да вады, убачыў сваё адлюстраванне і… закахаўся ў сваю прыгажосць. Тады Богі ператварылі яго ў дзівосную кветку.

Н а р ц ы с *(перабіваючы).* Найдзівоснейшую!!!

1-я к в е т к а. Наша зямля таксама насычана дзівоснымі кветкамі – нашымі дзяўчынамі, якія славяцца не толькі прыгажосцю, але і таленавітасцю.

*(Маргарытка і дзве кветкі пакідаюць залу.)*

Н а р ц ы с. Калі дазволіце, мы гэта праверым!

1-я к в е т к а. Калі ласка, я запрашаю ў наша кветкавае царства тых дзяўчат, якія атрымалі па адной кветачцы.

*(Чатыры дзяўчыны пад лірычную музыку выходзяць на пляцоўку.)*

1-я к в е т к а. Паважаныя сябры! Давайце разам вызначым каралеву кветак сённяшняга вечара.

Н а р ц ы с. Шаноўныя ўдзельніцы! Зараз я праверу, наколькі вы таленавітыя. Адкажыце, калі ласка, што азначаюць наступныя колеры кветак:

*(Да першай удзельніцы.)* Чырвоны колер? *(Агонь, незалежнасць, страсць, каханне.)*

(*Да другой удзельніцы.)* Жоўты колер? *(Жыццё, радасць.)*

*Насычана-жоўты? (Рэўнасць, здрадніцтва.)*

*(Да трэцяй удзельніцы.)* Сіні колер? *(Смутак, вернасць, давер'е і бясконцасць.)*

*(Да чацвёртай удзельніцы.)* Зялёны колер? *(Мір, спакой, урадлівасць.)*

1-я к в е т к а. Сёння вечар можна назваць сапраўдным балем кветак. Але няма ў нас толькі караля баля – вальса.

Н а р ц ы с. Паважаныя ўдзельніцы, аб'яўляю белы танец! А мы паглядзім, хто з вас лепей рухаецца!

(*Гучыць вальс, дзяўчаты запрашаюць хлопцаў, танчаць. Нарцыс знікае, з'яўляецца Васілёк.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пасля вальса вызначаюцца дзве лепшыя пары, якія застаюцца на пляцоўцы.*

В а с і л ё к. Нам трэба вызначыць адну лепшую пару, таму для вас яшчэ адзін іспыт! Трымайце, калі ласка, па кветкавай гірляндзе. Па маім сігнале вы павінны ўкруціцца ў гірлянду, пацалавацца і раскруціцца. І так тры разы. Якая пара зробіць гэта хучэй, тая і пераможа! На лік тры – пачалі! Адзін, два, тры! Пачалі.

*(Гучыць музыка, праводзіцца гульня, пераможцы атрымліваюць узнагароды.)*

В а с і л ё к *(да ўдзельнікаў).*Дзякуй вам вялікі, сядайце на свае месцы.

Няма, магчыма, на свеце такога чалавека, які б не любаваўся прыгажосцю ружы. Але і няма такога, які б мог сказаць, што бачыў усе ружы. Вось адкажыце, якія вы ведаеце колеры руж? *(Адказ: чырвоная, белая, чорная, сіняя, ружовая, блакітная, фіялетавая, бірузовая і г.д. Хто адказвае, таго запрашаюць на пляцоўку.)*

В а с і л ё к. Да нас завітала Ружа з Усходу, давайце зараз разам патанчым пад усходнія матывы. Хто будзе лепей рухацца, той атрымае падарунак ад нашай госці.

*(Танец Ружы, падчас танца памочніцы раздаюць гледачам восем картак, на якіх напісана па адным радку з куплетаў дзвюх песень.)*

Р у ж а. Калі ласка, выходзьце тыя, у каго апынуліся пялёсткі. Складзіце зараз у радок куплеты і згрупіруйцеся, такім чынам, у дзве каманды. Якія куплеты ў вас атрымаліся, тыя вам патрэбна праспяваць!

*(Гучыць вясёлая музыка, удзельнікі ствараюць дзве каманды.)*

Р у ж а. Цудоўна! А ці любіце вы спяваць? Зараз мы паглядзім, якая каманда больш песень ведае пра ружу. Спяваем па аднаму куплету: адна каманда, потым другая, і так па чарзе. А вы, гледачы, таксама падключайцеся, падказвайце і спяваць дапамагайце!

(*1-я кветка выносіць ватман, на якім напісаны радкі з песень.*

*Па заканчэнні конкурсу ўзнагароджваюцца пераможцы.*

*Выходзяць 1-я і 2-я кветкі і выносяць гірлянду з літарамі.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Р у ж а. Паважаныя ўдзельнікі! Паглядзіце на нашу гірлянду, на ёй прышчэплены літары. Вы па чарзе бераце літару і называеце кветку на гэтую літару, калі назвалі, тады застаецеся на пляцоўцы, калі не – сядаеце ў зале.

*(Гучыць музыка, праводзіцца гульня, пераможцы атрымліваюць узнагароды.)*

Р у ж а. А зараз усе, хто трымае ў руках літары, запрашайце на танец сваіх сяброў!

*(Гучыць музыка, усе танчаць, у сярэдзіну выходзяць Васілёк, 1-я і 2-я кветкі, Маргарытка, Нарцыс, Ружа.)*

В а с і л ё к. Вось і прыйшла пара развітацца. Я спадзяюся, што сёння кветкавы вечар падняў ваш настрой і падараваў адпачынак.

М а р г а р ы т к а. Мне, у сваю чаргу, хочацца пажадаць вам шчасця!

Н а р ц ы с. Міру!

Р у ж а. Дабрабыту!

1-я, 2-я к в е т к і. Няхай побач з вамі ўсё жыццё квітнеюць сады і палі прыгожымі кветкамі, як мы!

*(Гучыць музыка, усе пакідаюць сцэну.)*

***Аўтар сцэнарыя Д.А.Аўрамчык***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## У СВЕЦЕ НЕЗВЫЧАЙНЫХ КВЕТАК
### *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Зала афармлена ў выглядзе кветкавай паляны. Плакат "Царства кветак". Гучыць "Вальс кветак" П.І.Чайкоўскага. У карагодзе выходзяць дзяўчаты, у цэнтры карагода – Кветкавая фея. Збоку ўладкаваны відэапраектар.*

*Гучыць вальс.*

К в е т к а в а я  ф е я. Добры дзень, мілыя сябры. Мяне завуць Кветкавая фея, я прыляцела да вас з незвычайнага царства, каб распавесці аб самым чароўным на зямлі – пра свет кветак, загадкавы і цудоўны. Тысячы розных відаў кветак упрыгожваюць нашу планету.

*(Фонавая музыка. Дзяўчаты, якія вялі карагод, пачынаюць аповед пра свята і кветкі розных краін свету на фоне лірычнай мелодыі.)*

1-я  д з я ў ч ы н а. У Старажытнай Грэцыі ўладкоўваліся святы ў гонар гіяцынтаў і лілей.

2-я  д з я ў ч ы н а. У Англіі – у гонар незабудак і першацветаў.

3-я  д з я ў ч ы н а. У Францыі – у гонар руж і фіялак.

1-я  д з я ў ч ы н а. У наш час асабліва ярка адзначаюцца святы руж у Балгарыі.

2-я  д з я ў ч ы н а. У Беларусі – Купалле, кульмінацыйным момантам якога з'яўляецца пошук у лесе таямнічай кветкі.

3-я  д з я ў ч ы н а. Кветкі папараці, якая паводле легенды павінна падараваць чалавеку шчаслівае жыццё!

(*Гучыць вясёлая мелодыя, з'яўляецца Кветачка-рознакаляровачка і падключаецца да размовы.)*

К в е т а ч к а-р о з н а к а л я р о в а ч к а. "Каб шчасліва жыць, трэба сонца, воля і маленькая кветка", – сцвярджаў вялікі казачнік Ханс Крысціян Андэрсен. Я спадзяюся, што ўсе ведаюць гэтага казачніка. *(Адказ.)*

К в е т к а в а я  ф е я. Рознакаляровачка, вось дзіва дык дзіва. Якое цуда, што ты з'явілася тут! Але ты зусім не ў гуморы! Што здарылася!

К в е т а ч к а-р о з н а к а л я р о в а ч к а. Я амаль што страціла ўсе свае магічныя якасці. Людзі ўжо не так, як раней, любяць кветкі, перасталі іх дарыць адзін аднаму, не высаджваюць іх у кветніках, а ў хаце замест жывой кветачкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

красуецца штучная. А ці любіце вы, даражэнькія сябры, кветкі? *(Адказ.)*

К в е т к а в а я ф е я. Вось бачыш, не ўсё так дрэнна! *(Гледачам.)* Дапаможам нашай Рознакаляровачцы?

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Паглядзім, што вы ведаеце пра кветкі. Кажуць, што самая выдатная палова грамадства – нашыя чароўныя дамы ведаюць пра кветкі болей, чым моцныя і адважныя мужчыны. Так гэта ці не? *(Адказ.)* Ну, тады трэба гэта праверыць невялікім выпрабаваннем! Спачатку будуць адказваць дзяўчыны, а потым нашыя мужчыны, і так па чарзе.

*(Конкурс "Адгадай кветку". Таму, хто правільна адкажа, асістэнты ўручаюць жэтончыкі ў выглядзе рамонка дзяўчынам, а ў выглядзе васілька хлопцам.)*

1. Сама пахучая, а хвост калючы. *(Ружа.)*
2. Белыя гарошкі на зялёнай ножцы. *(Ландыш.)*
3. Прабіваецца парастак,
   Дзіўная кветка
   З-пад снега вырастае,
   Сонца зірне – расцвітае. *(Пралеска.)*
4. На лугах сястрычкі – залатое вочка, белыя вейчыкі. *(Рамонак.)*
5. Ярка-сіні, пухнаты, ён у хлебе народзіцца, у ежу не гадзіцца. *(Васілёк.)*
6. Рос шар белы, вецер дунуў – паляцеў. (*Дзьмухавец.)*
7. Кубачкі і блюдцы не тонуць і не б'юцца. *(Гарлачыкі.)*
8. Эх, званочкі, сіні колер, з язычком, а звону няма. (*Званкі.)*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Народная мудрасць сцвярджае: "Хто вырошчвае кветкі, той прыносіць радасць сабе і людзям". Жывучы на зямлі, мы павінны памятаць пра ахову прыроды, пра захаванне яе багаццяў.

*(Слайд-шоу "Кветкі прыносяць радасць людзям".)*

К в е т к а в а я ф е я. Ну што, Рознакаляровачка, бачыш, твае здольнасці пачынаюць вяртацца, бо нашыя сябры добра ведаюць кветкі!

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Так, цікава, а што яны яшчэ ведаюць пра багаты свет таямнічых і загадкавых кветак? Хто атрымаў жэтончык, прашу выйсці сюды. У нас утварыліся дзве каманды – "Рамонкі" і "Васількі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Каманда дзяўчат – "Рамонкі", хлопцаў – "Васількі".)*

К в е т к а в а я ф е я. А каб нам лёгка было іх ацэньваць, мы запрашаем вялікіх знатакоў мастацтва, справядлівае і кампетэнтнае журы.

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Надышоў час выпрабаваць нашых удзельнікаў. *(Звяртаецца да каманды "Васількі".)* Дорыце кветкі дзяўчатам? Існуе звычай, калі мужчына пасылае букет кветак даме разам з запрашальнай паштоўкай. Зараз перад вамі, "Васількі", стаіць задача напісаць у вершаванай форме запрашальную паштоўку, у якой павінна прагучаць запрашэнне на свята кветак, а чароўныя "Рамонкі" павінны прыняць гэтае запрашэнне таксама ў вершаванай форме. Час пайшоў.

*Асістэнты раздаюць камандам заданні:*

*1. У вершаванай форме запрасіць дзяўчат на свята кветак.*

*2. У вершаванай форме прыняць запрашэнне мужчын ("Запрашэнне на свята кветак").*

*Пакуль каманды выконваюць заданні, гучыць музыка, на гэтым фоне Кветкавая фея распавядае аб кветкавых гадзінах.*

К в е т к а в а я ф е я. Дарэчы, пра гадзіны, пакуль нашы каманды будуць рыхтавацца, у мяне для вас ёсць штосьці цікавае. Яшчэ ў 20-х гадах XVIII стагоддзя вядомы шведскі батанік, даследчык прыроды Карл Лінэй заўважыў, што некаторыя кветкі раскрываюць і закрываюць свае пялёсткі ў пэўны час. Назіраючы на працягу шматлікіх гадоў за паводзінамі кветак, ён склаў табліцу, у якой пазначыў гадзіны раскрыцця і закрыцця пялёстак, а потым паводле гэтай табліцы пасадзіў вялікі кветнік, зрабіўшы, тым самым, кветкавы гадзіннік, які ён назваў "Гадзіннік Флоры". Паглядзеўшы на свой кветкавы гадзіннік, Карл Лінэй мог лёгка вызначыць час у залежнасці ад таго, якія кветкі ў гэты момант раскрыліся, а якія закрыліся. Таму знаёмства з навакольным светам кветак і іх жыццём лепш пачынаць з самага простага – вызначэння назвы расліны і часу іх цвіцення на працягу дня. У кожнага з вас ёсць магчымасць стварыць свой кветкавы шэдэўр. І я думаю, што пры вялікім жаданні ў вас гэта атрымаецца.

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Безумоўна, атрымаецца. І я прапаную вам паўдзельнічаць у пазнавальнай віктарыне, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

куль каманды рыхтуюцца. За правільныя адказы вы атрымаеце магічныя кветачкі, якія выканаюць вашае жаданне.

*(За правільны адказ уручаецца цукерка ў выглядзе кветкі.)*

1. Самая маленькая кветкавая расліна? *(Раска, памер ад 2 да 10 мм)*

2. Самая вялікая травяністая кветкавая расліна? *(Банан, да 7 м вышынёй.)*

3. У якой краіне вышэйшая ўзнагарода – ордэн Хрызантэмы? *(Японіі.)*

4. Якая горная кветка занесена ў Чырвоную кнігу? *(Эдэльвейс.)*

5. Якім газам дыхае расліна ў светлы час сутак? *(Вуглекіслым газам.)*

6. У якой краіне васілёк – сімвал свабоды ? (*Бельгіі.)*

7. Пры дапамозе чаго ў расліне ўтвараецца хларафіл і ідзе фотасінтэз? *(Святла.)*

8. Царыца кветак? *(Ружа.)*

9. Кветка русалак? *(Гарлачык.)*

10. Кветка мар і курыльшчыкаў опія? *(Мак.)*

11. Расліна "След белага чалавека"? *(Падарожнік.)*

12. Кветка памяці? *(Незабудка.)*

13. Дзікая ружа? *(Шыпшына.)*

*Музыка заканчваецца.*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Нашы каманды ўжо падрыхтаваны, прашу: «"Васількі" ўсёй камандай голасна вымавіце тое, што вы прыдумалі».

*Выступленне каманды "Васількі".*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. На такое запрашэнне нельга даць адмову, слова вам, "Рамонкі".

*Выступленне каманды "Рамонкі".*

*(Паштоўкі аддаюцца журы.)*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Кветкі, як і людзі. Ёсць як вялікія, так і маленькія. *(Пытанне гледачам.)* Якая кветка лічыцца самай вялікай? *(Адказ.)* Правільна, архідэя. Дыяметр яе пялёсткаў дасягае двух метраў.

К в е т к а в а я ф е я. Перад вамі, дарагія ўдзельнікі, стаіць задача зрабіць вялікую кветку. Матэрыялам для гэтага вам будуць служыць запалкі. І пакуль каманды будуць будаваць свае шэдэўры, я вам распавяду пра кветку, рост якой дасягнуў звыш двух метраў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Слайд-шоу “Самая высокая кветка ў свеце”.*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Смуродная трапічная кветка *аморфафалус (яна ж – ароннік, або трупная кветка)* зацвіла ў батанічным садзе ўніверсітэта Мэдзісана. Падзея гэтая ў ЗША лічыцца сапраўднай сенсацыяй – цвіце аморфафалус толькі ў другі раз за 12 гадоў. Гэтая дзіўная расліна, думаецца, вырасце да гіганцкіх памераў і, напэўна, патрапіць у Кнігу рэкордаў Гінэса, як самая высокая кветка ў свеце. Вышыня кветкі на сёння складае 2 метры, яна працягвае расці з неймавернай хуткасцю. Тысячы людзей з розных куткоў Амерыкі стаялі ў чэргах, каб уласнымі вачамі ўбачыць яе. Напэўна, каманды ўжо гатовы паказаць свае творы, і самая вялікая кветка ў каманды ________!

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Кветкі не перастаюць нас здзіўляць сваімі магчымасцямі. У свеце ёсць больш за 400 раслін-канібалаў, якія сілкуюцца насякомымі. Вельмі небяспечнымі з’яўляюцца расліны-гарлачыкі Мадагаскара, Паўднёвага Кітая, Паўночнай Аўстраліі. На балотах Атлантычнага ўзбярэжжа, Паўночнай Амерыкі можна сустрэць расліну дарлінгтонію з лоўчым апаратам, які захоплівае насякомах. Яна мае рэкордны памер сярод раслін-драпежнікаў – адзін метр. Прыклады такіх раслін мы хутка ўбачым.

*(Слайд-шоу “Насякомаедныя кветкі”.)*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Патрапіўшы ў купал гарлачыка, насякомае ўжо не зможа адтуль выбрацца. Такія расліны ёсць і ў нас, у Беларусі. Гэта – венерына мухалоўка, альдраванда, жыранка. Расце на тарфяных балотах, сярод імхоў расліна з белымі кветачкамі, якая завецца расянкай. Кожны яе лісточак пакрыты чырвона-крывавымі валасінкамі, якія вылучаюць пякучы сок, а на кончыках лісточкаў вылучаецца ліпкая слізь, з яе дапамогай расліна ўтрымлівае насякомае, а потым і паглынае яго. І я прапаноўваю пагуляць у адну захапляльную гульню, якая называецца “Паляванне драпежных колераў”. Вы павінны захапіць у сваё валадарства як мага больш прысутных гасцей і зрабіць гэта вельмі далікатна. Але, каб гэтае заданне не здавалася лёгкім, вам патрэбна для пачатку прышпіліць значкі з характэрнымі для каманд кветачкамі.

*(Праходзіць гульня “Паляванне драпежных колераў”, журы падводзіць вынікі, каманды ўзнагароджваюцца дыпломамі.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Я амаль што ўзнавіла сваю магутнасць, але каб вярнуць сваё валадарства, неабходна ўсім удзельнікам з’яднацца!

К в е т к а в а я ф е я. І, як вядома, людзей з’ядноўвае танец, але незвычайны. Давайце закружымся ў чароўным вальсе кветак.

*(Усе пачынаюць танцаваць кветкавы вальс.)*

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Вялікі дзякуй, я вярнула ўсю сваю моц. Да новых сустрэч!

К в е т к а в а я ф е я. Кветкі адкрываюць перад чалавекам магчымасць спазнаць выдатнае, адчуць паўнату жыцця! З іх вянкі плялі нявесты, іх у школку дзяўчынкі неслі.

Растуць ва ўсе стагоддзі каханыя,
Іх не забіць, не затаптаць.
Яны, кветкі, невынішчальныя.

Р о з н а к а л я р о в а ч к а. Да новых сустрэч! Добрага вам настрою, кветкавай прыгажосці!

***Аўтар сцэнарыя І.С.Дзянішчык***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПОШУКІ ЦУДОЎНАЙ КВЕТКІ
## *(сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы)*

*На сцэне стаяць некалькі елачак. Гучыць лірычная музыка, чуваць спевы птушак, шум лесу.*

Г о л а с з а к у л і с а м і. Маша! Машанька, пойдзем хутчэй. Хутка сонейка за лясок схаваецца, і не знойдзем мы тады цудоўную папараць-кветку.

*(На сцэну выходзяць дзве дзяўчыны.)*

1-я д з я ў ч ы н а. А навошта шукаць нам гэту цудоўную кветку?

2-я д з я ў ч ы н а. Як? Ты не ведаеш? Гэта незвычайная кветка: яна цвіце адзін раз у год, у ноч на Івана Купала, і хто яе знойдзе, той будзе вельмі шчаслівы, той мае магчымасць разумець шчэбет птушак, гоман дрэў, размову жывёл. Так мы зможам дапамагчы не толькі людзям, але ж і нашай маці-прыродзе, якая сваёй прыгажосцю дорыць людзям кожны дзень свята.

1-я д з я ў ч ы н а. Паглядзі, можа гэта яна? Ці вось? Вельмі прыгожая кветка!

2-я д з я ў ч ы н а. Не! Яна асаблівая, яна гарыць, як жар. Мы яе абавязкова знойдзем і падорым людзям.

*(Стаяць на паляне і не ведаюць, куды ісці.)*

1-я д з я ў ч ы н а. Ды калі мы ўжо яе знойдзем? Мы і так ад дому далёка адышлі.

2-я д з я ў ч ы н а. І праўда, здаецца, мы заблукалі. Давай хутчэй на дапамогу клікаць!

Р а з а м. Ау! Ау, ёсць тут хто?

З а л а д к а з в а е. Ёсць!

1-я д з я ў ч ы н а. Паглядзі, колькі хлопчыкаў і дзяўчынак на той палянцы, мы не адны.

2-я д з я ў ч ы н а. Гэй, сябры і сяброўкі! *(У залу.)* Хадземце з намі чароўную кветку шукаць! Разам неяк весялей! Ну што, згодны?

*(Зала адказвае.)*

1-я д з я ў ч ы н а. А можа хто з вас ведае, дзе расце папараць-кветка?

*(Зала адказвае.)*

2-я д з я ў ч ы н а. А я ведаю, хто нам дапаможа! Трэба паклікаць Лесуна, ён тут уладар, ён усё ведае пра свой лес. А

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

словы будуць такія: “Акажыся не воўкам-зверам, не воранам-птушкай, не дрэвам іглістым, а такім, як сам!”

1-я д з я ў ч ы н а. Паўтарайце разам з намі!

*(Усе разам паўтараюць гэтыя словы. Гучыцъ лірычны фон, з’яўляецца Лясун.)*

Л я с у н. Хто мяне клікаў? Зноў прыйшлі людзі ў лес кастры паліць ды смецце пакідаць?

*(Дзяўчаты адыходзяць назад.)*

1-я д з я ў ч ы н а. Не! Мы прыйшлі ў лес, каб знайсці чароўную папараць, але ж мы заблукалі.

2-я д з я ў ч ы н а. Дапамажы нам, калі ласка, дарогу адшукаць.

Л я с у н. Калі вы мне дапаможаце, тады і я вам дапамагу!

Д з я ў ч ы н к і. Сябры, дапаможам Лесуну?

З а л а д к а з в а е. Так!

1-я д з я ў ч ы н а. А што рабіць трэба?

Л я с у н. Трэба пазбіраць гэтыя паперкі ў торбачкі. Каб наш лес быў чысты і прыгожы. А хто зробіць гэта хутчэй за ўсіх, той атрымае ад мяне цудоўныя лясныя падарункі.

*(Праводзіцца гульня “Збор смецця”.)*

Л я с у н. Ой, якія вы малайцы! А папараць-кветку шукайце *(паказвае)* вось там – за балотам, на ўзгорку, дзе жыве Купальскі дзядок, які ходзіць па лесе з кошыкам і напаўняе яго кветкамі, таму кошык гарыць, як жар. Вось ён вам і дапаможа.

*Лясун пакідае сцэну, дзяўчаты крычаць яму ўслед.*

Р а з а м. Дзякуй табе, Лясун!

1-я д з я ў ч ы н а. Ой, Маша, а як жа мы з сябрамі праз балота пройдзем?

2-я д з я ў ч ы н а. Як, як, па купінах! Мы падзелімся на дзве невялікія каманды: адны пойдуць з табой з аднаго боку, а іншыя з другога, са мной. А хто першы прыйдзе, той атрымае смачныя падарункі! Ну, што – згодныя?

1-я д з я ў ч ы н а. Гэта якія падарункі?

2-я д з я ў ч ы н а. Пабачыце, так цікавей будзе. *(Хітра.)*

*(Гучыць вясёлая музыка. Праводзіцца гульня “Перайсці балота”.)*

2-я д з я ў ч ы н а. Ай, малайцы! Вось і вам падарункі, трымайце. Гэтыя салодкія грыбы мы па дарозе назбіралі; праўда, цудоўныя?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(*Гучыць таямнічая музыка. З'яўляецца Русалка-лесавіца.)*

Р а з а м. Хто гэта?

Р у с а л к а. Я – Русалка-лесавіца,
Да падобы мне рэзвіцца.
Каб далей свой шлях трымаць,
Трэба мяне пачаставаць.

1-я д з я ў ч ы н а. Прасі, што хочаш. Мы ўсё зробім. Толькі адпусці нас хутчэй, а то мы папараць не знойдзем.

*(Стаяць на паляне і не ведаюць, куды ісці.)*

Р у с а л к а. Я ведаю, што ў Купальскую ноч дзяўчаты плятуць прыгожыя вяночкі, якімі яны ўпрыгожваюць сябе на свята. Вось вам лясныя кветкі, зрабіце і вы мне такую прыгажосць. А хто зробіць самы прыгожы, таго нават яшчэ і пачастую.

*(Гучыць вясёлая музыка. Праводзіцца гульня "Купальскі вянок".)*

Р у с а л к а. Дзякуй за вяночкі. Вы вельмі добрыя, і за гэта я вам падарую цудоўны абрус, а калі заслаць яго на зямлі і пераступіць праз яго, то перад вамі з'явіцца Купальскі дзядок. Вось ён вам і дапаможа. Да пабачэння, сябры. (*Пакідае сцэну.)*

1-я д з я ў ч ы н а. Давайце хутчэй зробім тое, што сказала Русалка-лесавіца.

*(Сцелюць абрус, пераступаюць яго тры разы. Гучаць фанфары. Выключаецца святло. З'яўляецца дзядок. У руках кошык, які свеціцца чырвоным колерам.)*

К у п а л ь с к і д з я д о к. Добры дзень, сябры! Вось вы мяне і знайшлі. Цяжкі шлях вы прайшлі, малайцы! Лясун мне казаў, што вы шукаеце чароўную кветку.

Д з я ў ч ы н ы. Мы шукалі яе вельмі доўга! Можаш нам падараваць яе?

К у п а л ь с к і д з я д о к. Лясун пахваліў вас і Русалка казала, што вы добрыя людзі, а добрыя людзі любяць прыроду, лес не губяць, а наадварот, вельмі шануюць яго. Я падарую вам папараць-кветку, але ж вы спачатку адкажыце на мае пытанні:

1. Чаму расліны ў лесе не перашкаджаюць адна адной расці? *(Яны растуць ярусамі.)*

2. Чаму дзятла называюць "лясным лекарам"? *(Лечыць дрэвы.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Якая расліна “гаворыць”, дзе яна расце? (*Падарожнік.)*

4. Якая травяністая расліна вясной цвіце першай. *(Маць-і-мачыха.)*

К у п а л ь с к і   д з я д о к. Малайцы, усё ведаеце! Вось бярыце гэтую цудоўную папараць-кветку, і няхай яна вам служыць дабром!

*(Даруе кветку, якая свеціцца чырвоным колерам.)*

1-я  д з я ў ч ы н а. Дзякуй. Цяпер мы яе падорым усім людзям, і яны пачуюць голас прыроды і будуць яе шанаваць і любіць.

(*Гучыць чароўная музыка. Кветка тухне.)*

2-я  д з я ў ч ы н а. Нам цяпер можна і дадому ісці!

*Гучыць песня “Папараць-кветка”. Усе пакідаюць сцэну.*

***Аўтар сцэнарыя С.В.Арцюшэнка***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЁМУХА, ЦІ ЗЯЛЁНЫЯ СВЯТКІ
### *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Гучыць музыка. Пасярэдзіне сцэны стаіць бяроза.*

*Дзяўчаты выконваюць танец з вянкамі. У канцы танца выходзяць дзве вядучыя. Ім на галовы надзяваюць вянкі.*

1-я в я д у ч а я. Добры дзень, дарагія госцейкі!

2-я в я д у ч а я. Добры дзень вам, хлопчыкі!
Добры дзень вам, дзяўчаткі!
Запрашаем Вас усіх
На гульні і забаўкі.

1-я в я д у ч а я. Бо сёння ў нас
Зялёныя святкі.

2-я в я д у ч а я. З даўніх вякоў ва ўяўленні нашых продкаў святкаванне Сёмухі супадае з перыядам актыўнага росту раслін і дрэў. Гэта свята працягвалася 2–3 дні. Людзі ўпрыгожвалі свае хаты зелянінай, кляновым ці бярозавым лісцем, падлогу высцілалі аерам. Таму Сёмуху яшчэ называлі “Зяленыя святкі”. А можа хто з вас, шаноўныя, ведае, гэта свята больш дзявоцкае ці мужчынскае?

*(Гучаць адказы.)*

1-я в я д у ч а я. Сёмуха лічыцца дзявоцкім святам, таму што менавіта дзяўчына сімвалізуе маладосць і прыгажосць прыроды.

2-я в я д у ч а я. А ці хочаце вы, мае даражэнькія, пагуляць?

Зараз мы ў вас запытаем, але адказваюць на пытанні толькі дзяўчаты. Слухайце ўважліва першае пытанне з нашай віктарыны:

1. Што азначае “накарміць бярозавай кашай”? *(Нахлястаць розгай.)*

2. Як называліся расліны, якімі ўпрыгожвалі будынкі і памяшканні? *(Май.)*

3. Назвы якіх грыбоў звязаны з бярозай? *(Падбярозавік, бярэзіца.)*

4. Колькі дзён святкавалася Сёмуха? *(2–3 дні.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Калі ў хату прыходзілі сваты ці сваха, галінкі якога дрэва давалі, што азначала згоду на шлюб? *(Бярозы).*

6. А галінкі якога дрэва, калі адмаўлялі? *(Сасны, дуба.)*

*(Дзяўчынам, якія адказваюць правільна, прапаноўваюць прайсці на сцэну і даюць бранзалеткі.)*

1-я в я д у ч а я. У сёмушны дзень дзяўчаты збіраліся ў гурты, спявалі песні, вадзілі карагоды, вілі вянкі і варажылі на лёс.

Зараз мы з вамі, дзяўчаты, таксама на лёс варажыць будзем. Станьце, калі ласка, вакол нашай бярозкі і загадайце жаданне. Потым кідайце вянок на дрэва. Калі ваш вянок зачэпіцца – жаданне збудзецца, калі ўпадзе на дол – не. Ну што, усе зразумелі? Тады пачнем варажыць. *(Кожная дзяўчына па чарзе кідае вянок.)*

2-я в я д у ч а я. Вялікі дзякуй! Усе вашы жаданні абавязкова споўняцца – у кагосьці раней, а ў кагосьці пазней. А зараз трэба крыху парухацца, таму што мы з вамі будзем вянкі пускаць, каб з берага паглядзець на квітнеючыя хвалі. Рэчку мы зробім самі. Падзяліцеся, калі ласка, на дзве каманды па аднолькавай колькасці чалавек. А зараз станьце за рыскай, якую вы бачыце паралельна адна адной. Я пляскаю ў далоні, а вы хуценька аддаяце вянок – кожная сваёй хвалі. Калі вянок дойдзе да канца, апошняя ўдзельніца бяжыць наперад і перадае вянок другой. І так паўтараецца да таго часу, пакуль першыя ўдзельнікі зноў не апынуцца наперадзе. *(Ідзе гульня.)*

2-я в я д у ч а я. А ці ведаеце вы, што на Сёмуху праводзіўся абрад кумлення. Дзяўчаты цалаваліся праз вянок, дарылі падарункі, пасля гэтага яны лічыліся кумамі, неразрыўнымі сяброўкамі на ўсё жыццё або на тэрмін свята.

1-я в я д у ч а я. Адкажыце, дзяўчаты, на пытанне: "Ці хочаце вы быць сяброўкамі?" *(Гучаць адказы.)* Цудоўна! Тады пацалуйцеся праз вянок з дзяўчынай з супрацьлеглай каманды, абмяняйцеся падарункамі і станавіцеся ў канец сваёй каманды. Зразумела? Тады пачынаем!

*(Праходзіць "кумленне".)*

2-я в я д у ч а я. Вось як добра! Вы больш не глядзіце адна на адну як на саперніцу, вы сталі сапраўднымі сяброўкамі. Ну

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ж, а зараз патрэбна і кума прыгледзець, з якім вы на Пятра куміцца будзеце.

1-я вядучая. Не думайце, мае даражэнькія, што калі Сёмуха – дзявоцкае свята, то хлопцы ў ім не прымалі ўдзел. Хлопцы таксама прымалі ўдзел, але толькі пасля заканчэння рытуальных дзеянняў. Ну, сапраўды, якое ж свята без хлопцаў? Давайце загадаем хлопцам загадкі, няхай яны адгадваюць, а мы іх пачастуем.

*(Дзяўчатам раздаюць загадкі, яны іх чытаюць услых.)*

1. Вечна беланогая, ды сукенкі ўсё мяняе,
 То яна зялёная, то празрыста-залатая,
 А зімовым ясным днём адлівае серабром.*(Бяроза.)*

2. Многа рук, а нага адна. *(Дрэва.)*

3. Сярод агарода стаіць урода,
 Хто за яе возьмецца, той і сам скрывіцца. *(Дзядоўнік.)*

4. Вісіць – зялёны, ляціць – жоўты, а ляжыць – чорны. *(Ліст.)*

5. Зялёная прыгажуня стаіць ля вады – косы палошча. *(Вярба.)*

6. Ля дарогі шарык белы,
 Вецер б'е, а шарык цэлы,
 А як дзьмухнуць хлапчукі –
 Пух ляціць ва ўсе бакі. *(Дзьмухавец.)*

2-я вядучая. А зараз патрэбна выбраць таго хлопца, з якім вы на Пятра куміцца будзеце. Таму дзяўчаты станьце з хлопцамі ў карагод. Наша кума-горліца будзе ў сярэдзіне круга рухацца супраць агульнага ходу карагода.

1-я вядучая. Калі музыка спыніцца, дзяўчына, якая ішла супраць ходу карагода, спыняецца. Хлопец, які насупраць яе стане, будзе ёй на Пятра кумам. За тое, што яна выбрала яго, хлопец павінен пацалаваць яе. Кожная дзяўчына такім чынам выбірае сабе кума.

2-я вядучая. Ну што, дзяўчаткі, хто з вас хоча першай выбраць сабе кума? Вось дзяўчына жадае, калі ласка. Пачынаем.

1-я вядучая. Цяпер у кожнай з вас ёсць хлопец, з якім вы на Пятра будзеце куміцца. Таму давайце разам патанчым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2-я в я д у ч а я. У каго душа не вузкая, запрашаем на польку беларускую.

*(Усе танцуюць польку.)*

1-я в я д у ч а я. Сёння свята праслаўлялі,
Пачастункі атрымалі,
Усіх са святам віншавалі,
Весела каля бярозкі гралі.

2-я в я д у ч а я. А на Сёмуху жадалі,
Каб збыліся казкі-сны,
Каб дзяўчаты ўсіх кахалі
І чакалі ўсе вясны.

1-я в я д у ч а я. Да пабачэння!

Р а з а м. Да наступнага свята Сёмухі!

***Аўтар сцэнарыя А.Г.Багданоўская***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СВЯТА ПТУШАК
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Пляцоўка ўпрыгожана птушынымі гнёздамі. У цэнтры задніка сцэны размешчана эмблема праграмы – клін птушак. Гучаць спевы птушак. На пляцоўку ў пластычным эцюдзе з’яўляюцца Вясна і Ластаўка.*

Л а с т а ў к а. Як тут хараша! Паглядзі, а вунь птушачкі паляцелі.

В я с н а. А вунь шпакі з выраю вяртаюцца. О зямля, ты ўся ў абновах...

Л а с т а ў к а. Ты ў мільён званочкаў звоніш,
Ты на ста пявучых мовах,
Песняй радасцю гамоніш...

В я с н а. Ты смяешся так шчасліва,
Што адразу стала ясна,
Як даўно, як церпяліва,
Свята гэтага чакала!
Сардэчна вітаем і віншуем вас са святам птушак!
Я – Вясна, а гэта мая сяброўка – Ластаўка.

Л а с т а ў к а. Вясна-сястрыца, паглядзі, як тут хараша, як прыгожа. Сонечны дзень, цёплае паветра, нездарма кожны год я вяртаюся на родную зямлю.

В я с н а. Сапраўды! Птушкі – гэта дзеці паветра, яны ўздымаюцца вышэй аблокаў, пралятаюць над марáмі і пустынямі.

Л а с т а ў к а. Напрыклад: каханых завуць лябёдушкамі ці журавушкамі, рухавых дзяцей – чыжыкамі ці пеўнікамі, а прыгожых і пластычных дзяцей клічуць ластаўкамі.

*(Гучыць запіс песні “Птушка” ў выкананні Ю.Міхальчык.)*

В я с н а. Зараз мы з Ластаўкай па чарзе будзем загадваць вам загадкі. Калі вы правільна адкажаце на загадку Ластаўкі, то вы выйдзеце да нас на пляцоўку і будзеце ў камандзе Ластаўкі, а калі правільна адкажаце на маю загадку, то пойдзеце ў каманду да Вясны, да мяне:

На алешніку, на бярэзніку таратайка брэша. *(Дзяцел.)*

Што гэта за маці, што дзяцей сваіх не бача? *(Зязюля.)*

Л а с т а ў к а. Без сякеры і цвікоў пабудавалі птушкі дом. *(Гняздо.)*

Ля ракі спусціліся дзве дугі. *(Вясёлка.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В я с н а. Такім чынам, у нас атрымаліся дзве каманды. Каманда Ластаўкі, вашы апладысменты!

Л а с т а ў к а. І каманда Вясны – апладысменты! *(Асістэнты выносяць паветраныя шары і раздаюць удзельнікам.)* У нашай гульні вось гэтыя паветраныя шарыкі будуць выконваць ролю птушыных яек.

В я с н а. Умовы гульні. *(Асістэнты выносяць умоўныя гнёзды.)* Вы павінны даляцець да гнязда з заціснутым паміж каленяў птушыным яйкам і пакінуць яго ў гняздзе. Якая каманда першая з гэтым справіцца, тая і пераможа.

Л а с т а ў к а. На лік тры пачынаем! Адзін, два, тры – пачалі!

*(Гучыць вясёлая музыка.)*

В я с н а. Якія спрытныя ў нас зязюлькі, нават сапраўдныя так хутка не справіліся б.

Л а с т а ў к а. Але ж гэтыя птушыныя яйкі павінны вылупіцца.

В я с н а. Вы павінны даляцець да гнязда, узяць птушынае яйка, даляцець з ім на сярэдзіну пляцоўкі і вылупіць птушаня.

Л а с т а ў к а. Гэта значыць, вы павінны сесці на птушынае яйка, і калі яно лопне, удзельнікі павінны сказаць, якое птушаня вывелася. На лік "тры" пачынаем. Адзін, два, тры – пачалі! *(Выходзяць асістэнты і прыбіраюць пляцоўку. Гучыць вясёлая музыка.)*

В я с н а. А зараз мы паспрабуем намаляваць птушку нашага сённяшняга свята. *(Асістэнты выносяць паперу і алоўкі.)*

*(Гучыць запіс песні "Птушкі" ў выкананні Алесі.)*

Л а с т а ў к а. Вясна-сястрыца, у нашай краіне неверагодная колькасць птушак. І яны такія розныя: у адных доўгая дзюба, у другіх ледзь прыкметная, адны шэрыя, другія рознакаляровыя.

В я с н а. Сапраўды цікава! Але, на жаль, мы не разумеем іх размоў!

Л а с т а ў к а. Вясна, паколькі мы з табой сяброўкі, я падзялюся з табой апошнім птушыным гумарам.

*(Праводзіцца гульня "У заалагічным парку".)*

Н а в е д в а л ь н і к. Вы добра ведаеце пароды птушак?

Р а б о т н і к. А як жа!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н а в е д в а л ь н і к. А вось адкажыце, якая з гэтых птушак Няёс, а якая Шчыгол?

Р а б о т н і к. А вось тая, што побач з Няёсам і ёсць Шчыгол!

В я с н а. Дзякуй, Ластаўка, тады і я падзялюся з табой птушыным гумарам. Унук пытае ў свайго даволі тоўстага дзядулі: “Дзядуля, а цябе таксама бусел прынёс?”. “Вядома”, – адказвае дзядуля. Унук недаверліва верціць галавою: “Але, мабыць, не ўсяго адразу!”

Бацька з сынам купілі на кірмашы карову ды вядуць яе дамоў, а варона, летучы, кракае:

– Кра! Кра!

– Брэшаш! – адказвае на тое бацька. – Не краў, а купіў!

На той час і зязюля закукавала: “Ку-ку”.

– Вось і зязюля кажа, што я купіў, а не краў!

*(Жарты суправаджаюцца мелодыяй са спевамі птушак.)*

В я с н а. Дзякуй табе, Ластаўка, за птушыны гумар! Але ж бачу я, што госці нашы сумуюць па птушыных гульнях. Давай паглядзім, што атрымалася ў нашых удзельнікаў.

*(Асістэнты забіраюць паперу і алоўкі. Гучыць вясёлая музыка.)*

А зараз у вас ёсць магчымасць паўдзельнічаць у нашай птушынай латарэі. Калі ласка, выбірайце гняздечка, якое вам найбольш падабаецца. Калі назвы птушак у ім супадуць, вы атрымаеце падарунак! І птушак пакінеце сабе на памяць!

*(Асістэнты ўсіх частуюць і раздаюць падарункі.)*

Зараз мы з Ластаўкай будзем задаваць вам пытанні, калі вы правільна на іх адкажаце, то выходзьце да нас на пляцоўку.

*(Гучыць запіс песні “Ворон” гурта “Hi-Fi”.)*

Л а с т а ў к а. Якая гарадская птушка не адлятае ў вырай? *(Голуб.)*

Хапаткія ў мяне крылы, хвосцік востры, нібы вілы *(Ластаўка.)*

В я с н а. Якая птушка перш за ўсіх вяртаецца з выраю? *(Шпак.)*

Хто ў чырвоных ботах ходзіць па балотах? ***(Бусел.)***

*(Гучаць спевы птушак.)*

Л а с т а ў к а. Вы ведаеце, што сарокі любяць збіраць бліскучыя рэчы? Умовы гульні: на лік “тры” вы бяжыце ў глядзельную залу і здымайце са сваіх сяброў усё бліскучае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В я с н а. А гледачы разам з намі будуць лічыць да дзесяці. На лік “дзесяць” вы вяртаецеся зноў на пляцоўку. *(Падлічваем рэчы.)* Два ўдзельнікі, на жаль, прайгралі, у іх менш рэчаў, чым у астатніх. Але ў вас ёсць магчымасць паўдзельнічаць у нашай птушынай латарэі.

*(Асістэнты частуюць двух прайграўшых удзельнікаў.)*

В я с н а. А з вамі мы правядзём гульню “Бусляня”.

(*Гучаць спевы птушак. Асістэнты выносяць чырвоныя боты, умоўнае балота і жабак.)*

Л а с т а ў к а. Умовы гульні: вы павінны надзець чырвоныя боты, дайсці да балота, узяць першую жабку, вярнуцца на бераг і пакласці яе ў кошык. У кожным кошыку павінна апынуцца па дзве жабкі.

В я с н а. На лік “тры” пачнем! Адзін, два, тры – пачалі! *(Гучыць вясёлая музыка. Асістэнты частуюць удзельнікаў і гасцей.)* Цудоўна, а зараз усе, хто атрымаў птушак, выходзьце да нас на пляцоўку, будзем выконваць танец маленькіх качанят!

*(Танец маленькіх качанят. Ластаўка з Вясною выходзяць на сярэдзіну пляцоўкі. Спевы птушак.)*

Л а с т а ў к а. Хай вам, людзі, будзе даспадобы
Веснавы і цёплы гэты дзень.
Каб заўсёды вы жылі ў згодзе,
Кожны час і кожны дзень.

В я с н а. Яснага, блакітнага вам неба.

Р а з а м. Каб на стале была краюха хлеба
І каб святло вы неслі ў сваёй душы.

***Аўтар сцэнарыя В.І.Шарова***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СВЯТА ПАСТУХОЎ
## *(сцэнарый фальклорнай гульнёва-забаўляльнай праграмы)*

*Гучыць юр'еўская песня, выходзяць два пастухі.*

1-ы пастух (Антось) *(звяртаючыся да Кірыла)*. Паглядзі, Кірыл, колькі да нас на свята сёння завітала людзей! Вітаем вас, людцы добрыя!

2-і пастух (Кірыл). Са святам вас, з Юр'ем!

1-ы пастух. Мы пастухі, ён – Кірыл.

2-і пастух. А ён – Антось.

1-ы пастух. Сёння свята першага выгану скаціны на пашу, свята пастухоў – Юр'я. У народзе кажуць: Як дождж на Юр'я…

2-і пастух. То будзе хлеб і ў дурня.

1-ы пастух. Як на Юр'я пагода...

2-і пастух. Будзе на грэчку няўгода.

1-ы пастух. Калі будзе раса...

2-і пастух. То будзе ў дастатку коням аўса.

1-ы пастух. А яшчэ раса юр'еўская – лячэбная. Яна спрыяе прыбаўленню малака ў кароў. Калі гаспадыня апырскне карову гэтай расою, то ў яе будзе вельмі смачнае малако. А хто з вас ведае, якія стравы робяць з малака. Назавіце іх, калі ласка.

*(Праводзіцца гульня "Малочныя стравы".)*

2-і пастух. Я бачу, што вы, малады чалавек, ведаеце вельмі шмат малочных страў. Хадзіце, калі ласка, да нас.

*(Асістэнты выводзяць удзельнікаў.)*

2-і пастух *(пакуль удзельнікі падымаюцца)*. Бачыш, Антось, як нашы госці любяць малако.

1-ы пастух. Давайце з вамі пазнаёмімся. Як вас завуць?________. А вас? ________.

2-і пастух. Ведаеце, госцікі дарагія, у даўнія часы перад тым, як выгнаць скаціну на пашу, патрэбна было пакласці пад браму яйка, каб кароўка, пераступіўшы яго, была гладкая, поўная і круглая, бо яйка – гэта сімвал жыцця. А калі вы ўжо тут апынуліся, то зрабіце гэта, калі ласка. Згодны?

1-ы пастух. Вось. Трымайце, калі ласка, галінкі вярбы і імі каціце гэтыя яйкі ўздоўж чырвоных ліній пад браму. Хто хутчэй справіцца, той і будзе пераможцам! Зразумела? Тады на лік "тры" пачнем гуляць. Адзін, два, тры!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня “Падкаці яйка пад браму”.)*

1-ы п а с т у х. *(Запрошвае апладысменты.)* У гульні перамог ________.

2-і п а с т у х. Малайцы! Змагацца паміж сабой, адзін на адзін вы можаце добра. А цяпер праверым, ці добрыя ў вас сябрукі.

1-ы п а с т у х. Для гэтага паклічце з залы свайго сябра, з якім вы пайшлі б і ў агонь, і ў ваду. *(Кожны з гульцоў выводзіць сябра.)* Цудоўна. А цяпер сядайце на спіну адзін аднаму, і на спіне сябрука паспрабуйце дастаць з долу гэтае яйка *(паказвае).* Селі? Гатовы? Але спачатку паслухайце, чаму менавіта курыныя яйкі. З курыных яек робіцца яешня, якая лічыцца пастуховай стравай і якую яны павінны закапаць на чатырох вуглах поля, калі пасуць на Юр’я даручаную ім скаціну. Зразумела? Дык вось, вы гатовы? Пачалі!

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня “Дастань з долу яйка”.)*

1-ы п а с т у х. І ў гэтым спаборніцтве перамог ________ са сваім сябрам!

2-і п а с т у х. Трэба пахваліць другіх нашых удзельнікаў за фізічную моц!

1-ы п а с т у х. А цяпер давайце з вамі паспрабуем правесці традыцыйную юр’еўскую гульню. Але ж для гэтага нам патрэбна больш удзельнікаў. Калі ласка, паклічце да сябе па аднаму сябру ці сяброўцы.

(*Пад музыку ідуць за сябрамі. Кожны кліча па аднаму сябру. Асістэнты ў гэты час кладуць два кажухі, унутры якіх ляжаць яйкі, і выстройваюць удзельнікаў у дзве каманды.)*

1-ы п а с т у х. Вось у нас ужо атрымаліся дзве цудоўныя каманды. Давайце з вамі прыдумаем назвы для іх, якія патрэбна звязаць са святам Юр’я. Як будзе называцца гэтая каманда? _____. А гэтая? _____ .

2-і п а с т у х. А зараз слухайце ўважліва ўмовы гульні. Вы павінны будзеце прайсці праз кажухі, імітуючы свойскую жывёлу. Гэта можа быць карова, каза, конь, авечка і інш. Пры гэтым яйка, якое знаходзіцца ў кажуху, павінна захоўвацца цэлым. Зразумела?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1-ы п а с т у х. Але ж давайце спачатку намалюем тых жывёл, якіх вы будзеце імітаваць. Калі ласка, трымайце кожны паперу і аловак. Вы гатовы? Тады пачынайце.

2-і п а с т у х *(да гледачоў).* А пакуль нашыя ўдзельнікі малююць жывёл, назавіце, якія жывёлы могуць быць у хатняй гаспадарцы беларусаў? А якія раслінныя культуры вырошчваюць беларусы?

1-ы п а с т у х. Вось і надышоў час паглядзець, якія малюнкі атрымаліся ў нашых каманд. Нашы "малевічы" будуць па адным выходзіць на сярэдзіну пляцоўкі, а мы з вамі, паважаныя гледачы, будзем ацэньваць іх "шэдэўры" мастацкай творчасці апладысментамі. *(Ацэньваем апладысментамі кожны малюнак.)* Дык вось, паважаныя ўдзельнікі, я ўзгадваю вам умовы гульні: вы павінны прайсці праз кажухі, імітуючы свойскую жывёлу, тую, што намалявалі вы самі, пры гэтым яйка, якое знаходзіцца ўнутры кажуха, павінна застацца непашкоджаным. Гатовы? Тады на лік "тры" пачнем. Адзін, два, тры!

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня "Прайдзі праз кажух".)*

1-ы п а с т у х. Цудоўна, давайце паглядзім, у якой з каманд яйка засталося цэлым.

*(Кожны пастух глядзіць у бок той каманды, каля якой стаіць.)*

2-і п а с т у х. Перамагла каманда _____!

1-ы п а с т у х. А давайце мы з вамі правядзём старажытны абрад, які з цягам часу пераўтварыўся ў гульню. Першы ўдзельнік каманды трымае ў руках свечку, падбягае да сваёй жывёлы *(кажуха)*, кладзе свечку ля яе на дол, бяжыць назад. Другі ўдзельнік падбягае, кладзе запалкі, трэці запальвае свечку, а чацвёрты аббягае вакол сваёй жывёлы *(адзін раз)* і прыносіць свечку назад. Пераможа тая каманда, якая першая данясе свечку і не затушыць яе. Калі свечка патухне, то каманда адразу прайграе. Усё зразумела? Тады па маім воплеску пачнем гуляць.

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня "Свечка".)*

1-ы п а с т у х. А ў гэтай гульні перамагла каманда_____!

2-і п а с т у х. А для наступнай гульні нам спатрэбяцца два фартушкі і два курыныя яйкі.

*(Асістэнткі выносяць два фартушкі і курыныя яйкі.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2-і п а с т у х. Умовы гульні. Кожнаму ўдзельніку каманды патрэбна хуценька данесці курынае яйка да кароўкі, адзін раз абысці кароўку і вярнуцца назад, перадаць курынае яйка і фартух наступнаму ўдзельніку. Тая каманда, якая першай гэта зробіць, і будзе пераможцам. Зразумела? Нарэшце, пачынаем: адзін, два, тры – гуляць пачалі!

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня “Яйкі і фартушок”.)*

1-ы п а с т у х. Цудоўна. Перамагла каманда _____! Калі ласка, частуйцеся нашымі падарункамі і праходзьце ў глядзельную залу.

*(Гучыць музыка, удзельнікі частуюцца і ўсе садзяцца ў зале.)*

1-ы п а с т у х. “Майская травіца для ўсякай скацінкі гадзіцца”, – казалі раней беларусы. Таму што для кожнай жывёлы ў Юр’я была свая расліна.

2-і п а с т у х. Адкажыце, калі ласка, для якой свойскай жывёлы ён прыпас траву? *(Каровы.)* Правільна, выходзьце, калі ласка, да нас.

1-ы п а с т у х. Для якой лазу? *(Казы.)* Правільна, выходзьце таксама, калі ласка.

2-і п а с т у х. Для якой мурог? *(Авечак.)* Правільна, калі ласка, выходзьце.

1-ы п а с т у х. Для якой дзягель? *(Свіначак.)* Выходзьце, калі ласка.

2-і п а с т у х. Для якой канюшыну? *(Коней.)* Выходзьце, калі ласка.

1-ы п а с т у х. А для каго яшчэ Юр’я прыпас канюшыну? *(Трусаў.)* Выходзьце, калі ласка.

*(Усе адказаўшыя выходзяць.)*

1-ы п а с т у х. Ведаеце, Юр’я – гэта яшчэ і свята ўсіх каханых. Таму запрасіце да вас вашу знаёмую ці знаёмага, якая ці які вам падабаецца.

*(Асістэнткі выстройваюць гуляючых у дзве каманды.)*

2-і п а с т у х. А хто з вас ведае, без якой рэчы пастух – гэта не пастух? *(Пугі.)* Так, сапраўды. У кожнага пастуха павінна быць пуга, для таго каб вывесці на пашу жывёлу і там пільнаваць яе. Але нашы пугі з Антосем ужо старыя і ўсе парваліся. Таму мы просім дапамагчы сплясці нам новыя. А для гэтага давайце спачатку падзелімся на дзве каманды. Гэтую каманду назавем “Сонейка”. А гэтую – “Пастухі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1-ы п а с т у х. Умовы гульні. Плесці пугі павінны хлопцы *(па магчымасці)*. Адзін з удзельнікаў каманды будзе трымаць будучую пугу за ручку, а другія плясці і ў канцы звязаць яе чырвонымі ніткамі. Зразумела, пераможа тая каманда, якая першай спляце пугу. А вы, дзяўчаты, проста так не стойце, а сваіх хлапцоў падтрымлівайце апладысментамі. Усім зразумела?

*(Асістэнты раздаюць рэквізіт.)*

1-ы п а с т у х. Гатовы? Пачалі!

*(Гучыць музыка і праходзіць гульня "Вязанне пуг".)*

2-і п а с т у х. І мы з вамі бачым, што перамагла каманда _____. Дык трэба праверыць, ці добрыя вы пугі сплялі. Тыя ўдзельнікі каманд, што трымалі пугі за ручкі, павінны як мага званчэй сцебануць пугай аб падлогу. Пераможа той, хто зробіць гэта званчэй.

1-ы п а с т у х. Гуляючыя абедзвюх каманд (па чарзе) па тры разы будуць хлёстаць пугай. Зразумела?

*(Праходзіць гульня "Сцябанне пугай".)*

1-ы п а с т у х. Мне здаецца, што перамог удзельнік каманды _____. Паглядзім, якая з каманд мацней будзе сцябаць пугай. Кожны з удзельнікаў каманд па чарзе будзе біць пугай. Готовы? Тады пачынаем з каманды _____ *(Правялі.)* А зараз няхай кожная каманда выбярэ аднаго з гледачоў, які жадае сцебануць пугай. Калі ласка.

2-і п а с т у х. Вось ад гэтай пугі кароўкі добра паскачуць. Даражэнькія ўдзельнікі, станьце, калі ласка, па парах. Зараз мы паглядзім, якія вы спрытныя. Станьце ў кола, я пакручу пугу, а вы паскачаце, а хто па нагах атрымае, той і прайграе.

1-ы п а с т у х. Але ёсць яшчэ адна ўмова: дзяўчаты павінны трымаць хлопцаў за плечы, а хлопцы дзяўчат – за талію, і калі Кірыл круціць пугу, вы павінны сінхронна падскокваць, каб не атрымаць пугай па нагах. А хто атрымае пугай, тая парачка і выбывае; якая пара застанецца апошняй – тая і пераможа. Пачынаем!

*(Гучыць музыка, праводзіцца гульня "Спрытная парачка".)*

1-ы п а с т у х. А вось і наша парачка пераможцаў. Як вас завуць?_____. А вас?_____. Паапладзіруем нашай спрытнай парачцы.

2-і п а с т у х. Мы з вамі скакалі? Бегалі? Абрады праводзілі? Тады самы час нам загадкі адгадваць!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1-ы п а с т у х. Кожны з удзельнікаў каманды будзе па чарзе падыходзіць да сонейка, выцягваць яго праменьчык і адгадваць загадку. Калі ўдзельнік не ведае адказ, яму дапаможа яго каманда. Зразумела?

Ані шпунта, ані дна, поўна бочачка віна. *(Яйка.)*

Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. *(Раса.)*

Сам голы, а сарочка за пазухай. *(Свечка.)*

Б’юць мяне палкамі, пнуць мяне камянямі, рэжуць мяне нажамі. За тое мяне глумяць, за што мяне любяць. *(Хлеб.)*

У вадзе радзіцца, а вады баіцца. *(Соль.)*

Вышэй аблакоў чырвоная птушка лятае. *(Сонейка.)*

Адзін пастух пасе тысячу авец. *(Месяц і зоркі.)*

У полі без кораня расце. *(Камень.)*

Бяжыць без пугі, без повада. *(Вада.)*

Сто коней, сто валоў яйцо не пацягнуць. *(Зямны шар.)*

Зароў вол за сто гор, на сто печак, на сто рэчак. *(Гром.)*

І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць. *(Дождж.)*

*(Гучыць музыка і праводзіцца гульня “Загадка”.)*

1-ы п а с т у х. Цудоўна, якія ў нас кемлівыя ўдзельнікі. А зараз пабегаем. Усе памятаюць сваю пару? Калі ласка, хлопцы ўтварыце знешняе кола, а дзяўчынкі ўнутранае. Калі будзе гучаць музыка, унутранае кола будзе рухацца па ходу гадзінніка, а знешняе – супраць. Як толькі музыка змоўкне, кожны ўдзельнік павінен знайсці сваю пару і правільна выканаць дзеянне, якое загадаў пастух. Пара, якая апошняя знойдзе адна адну ці не паспее выканаць дзеянне, пакідае гульню. Пераможцай стане пара, якая будзе хутка знаходзіць адна адну з натоўпу ўдзельнікаў і правільна выконваць загады пастуха.

*(Каманды пастуха: спіна да спіны, далонь да далоні, вуха да далоні, нага да нагі, калена да плечыка, локаць да пяткі, жывот да жывата, спіна да спіны, твар да твару і інш.)*

2-і п а с т у х. А вось і наша самая спрытная парачка.

1-ы п а с т у х. А вы ведаеце, паважаныя сябры, што на Юр’я існаваў такі звычай. Кожны гаспадар павінен быў спячы вялікі каравай, каб гэты год быў счаслівым і ўраджайным. Вось і мы спяклі вялікі каравай, але нават яго не хопіць на ўсіх. Таму мы прапаноўваем вам такую гульню. Станавіцеся ў карагод вакол Кірыла і пад карагодную песню рухайцеся, калі ласка, у карагодзе. Калі музыка змоўкне, той, хто апы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нецца ў ручніковым доміку, атрымае кавалак смачнага каравая. Зразумела? Тады пачынаем.

*(Гульня "Каравай", пасля якой усе ўдзельнікі праходзяць на свае месцы.)*

2-і п а с т у х. Спадзяёмся, што юр'еўскія забавы прыйшліся вам даспадобы і гэта прыгожае беларускае свята кранула вашыя сэрцы, не пакінула вас абыякавымі да нашай роднай спадчыны з яе традыцыямі і звычаямі.

1-ы п а с т у х. Хай Юр'я прыносіць здароўе і долю.
Хай будзе ў хаце прыбытку даволі.
І як распускаюцца зеленню почкі,
Няхай прыгажэюць сыны вашы й дочкі.

2-і п а с т у х. Няхай заклякоча пад стрэхай на ранку
Той бусел, што дорыць дзяцей і заранку,
І хай абміне вас бяда і нянасце,
Хай сонечным ранкам да вас прыйдзе шчасце!

П а с т у х і р а з а м. Са святам, сябры!

*Пастухі пакідаюць сцэну пад юр'еўскую музыку.*

***Аўтар сцэнарыя А.У.Вячорка***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЮР’Я
## *(сцэнарый фальклорнага свята пастушкоў)*

В я д у ч ы. Свята “Юр’я” адзначаецца шостага мая. Гэтае даўняе земляробчае свята прысвячаецца першаму выгану кароў з хлява ў поле. Юрый – апякун жывёлы і земляробства. У беларусаў святы Юрый уяўляўся то ў выглядзе дзеда, то ў выглядзе белага воўка.

*(Уваходзіць хлопчык у белым адзенні.)*

В у ч а н ь. Святы Юрый, дзе ж ты бываў?

Ю р ы й. Па палях хадзіў, жыта радзіў. Жыта, пшаніцу, усякую пашніцу. Дай табе Божа, пане гаспадару, дзе горачка – жыта копачка, дзе лужочак – сена стажочак. Дай табе Божа, пане гаспадару, на стайні вараныя коні, конікі касатыя, цялушкі рагатыя, авечкі лахматыя, свіначкі віхрастыя, гусачкі храшчатыя, курачкі чубатыя.

*(Сцэна аформлена пад вясковую хату.)*

Б а б а *(выглядае ў акно).*

А той царкве прастол стаіць,
За прастолам Бог сядзіць.
Каля Бога – усе празнічкі –
Шыкуюцца, рахуюцца,
Катораму ўперад ступіць,
Першы празнік – святы Юра.

Б а б а. Дзед, уставай, хопіць спаць. Сёння ж свята – Юр’еў дзень. Кароўка наша на пашу пойдзе, свежай траўкі паесць. Малачка смачнага дасць. Паднімайся хутчэй, Мікола!

Д з е д. Ды не сплю, старая. Усхапілася сярод ночы. Ёсць яшчэ час. Трэба ўсё зрабіць як след, па-людскі, па-божаскі.

*(Баба завіхаецца ля печы, дзед – у куту.)*

В я д у ч ы. Юр’я – заступнік свойскіх і дзікіх жывёл і звяроў. Таму і спяшаюцца выгнаць гаспадыні на Юр’еў дзень скаціну на ранішнюю расу.

Д з е д. Параска, ты падрыхтавала ўсё, што патрэбна?

Б а б а. Здаецца, усё *(дастае з кошыка і паказвае).* Вось яйка – сімвал жыцця, аберагае скаціну і яе прыплод. Вось пояс, трэба яго прадзець праз замкнёны замок. Пояс ахоўвае жывёлу ад пашкоджанняў, а замок надае большую моц. Ён таксама замыкае ваўкам пашчы. Вось хлеб, свянцоная соль, вербная свянцоная галінка – усё на месцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Д з е д. Ну, бяры, складвай усё ў рэшата, пойдзем на двор, усё, як патрэбна, зробім ды кароўку выганім у поле.

Б а б а. Святы Юр’я – Божы пасол,
Божы пасол да Бога пайшоў,
А ўзяў ён ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю сырусенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую
На Белу Русь і на ўвесь свет.

Д з е д. Юр’я, уставай рана, умыйся бела
Ды кладзі боты, надзявай сукні
Ды сядлай каня, ды бяры ключы,
Ды едзь у поле, адмыкай зямлю,
Выпускай расу на лён, на пшаніцу
На ўсяку пашніцу.

*(Выходзіць у двор.)*

Кладу пояс з замком ля варот – засцерагай маю жывёлу ад усіх напасцяў і бед. Кладу ля варот хлеб і соль свянцоную – каб ніхто ніколі не сурочыў, не сапсаваў маю жывёліну ні дрэнным словам, ні дрэнным вокам *(пасыпае соллю перад варотамі)*. Мае словы – ключ і замок *(тры разы)*.

*(Баба вядзе з хлява карову, у яе руцэ галінка. Баба бярэ яйка і тройчы абыходзіць вакол каровы, абводзіць яйкам па яе скуры.)*

Б а б а. Як гэтае яйка цэлае і круглае, так мая карова будзе заўсёды поўная, цэлая, сытая і круглая.

Д з е д. Засцерагай, святы Юр’я, ад хвароб, дай добры прыплод, захоўвай ад усяго дрэннага маю скаціну. Мае словы – ключ і замок *(тры разы )*.

*(Дзед і Баба даюць кавалак хлеба з соллю карове, лёгенька сцёбаюць яе вербнай галінкай, гоняць да варот.)*

Б а б а. Выганяю я сваю кароўку
На шырокую вуліцу,
На шаўковую травіцу,
У глыбокую крыніцу,
Па светлу вадзіцу.

Д з е д. Шаўковай травы наядайся,
У глыбокай крыніцы напівайся,
Карысці набірайся.
Нікога не пужайся,
Ведзьме не паддавайся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Баба бярэ нож, тройчы абводзіць вакол хлява, вакол каровы.)*

Б а б а. Каб мая кароўка ніколі нідзе не заблудзілася, ад статку не адбілася, каб яе не задраў воўк.

*(Баба і Дзед гоняць карову за вароты, сустракаюць пастуха.)*

Д з е д. Вось табе пачастунак у гэты святочны дзень: і сала, і яйкі, і хлеб. Ды не забудзь у полі абысці з яечняй статак тры разы, каб кароўкі нашы ўсе былі сытыя і цэлыя.

П а с т у х. Усё помню, дзякуй ! *(Гоніць карову на пашу.)*

*Дзед і Баба спяваюць "А ў полі вярба". Падыходзяць людзі.*

– Юр'я ўстаў рана.
– Юр'я ўмыўся бела.
– Юр'я прычасаўся.
– Юр'я ўзяў ключы.
– Юр'я пайшоў у поле.
– Юр'я адамкнуў зямлю.
– Юр'я выпусціў расу.
– Раса на кароўкі, трава на конікі.
– Пчала на свіначкі, мурог на авечкі.
– А жвірок на вутачкі і на гусачкі.

Д з е д і Б а б а. Давайце заходзьце ў хату, радасць сёння ў нас якая, свята якое цудоўнае!

*(Гучыць песня "Сёння ў нашай хаце свята".)*

Б а б а. Дзяўчаты, а вам чаго не спіцца! Песні зранку заспявалі, усю вёску разбудзілі.

Д з я ў ч а т ы. Мы раніцай бегалі на луг, збіралі расу і твар ёю мылі, каб быць заўсёды прыгожымі. Ды яшчэ пабегалі па расе босымі, каб быць заўсёды здаровымі.

Х л о п ц ы. А мы, хлопцы-малайцы, таксама рана ўсталі. Ды схадзілі на поле паглядзець, як растуць азімыя, ды насілі ў поле каравай.

Х л о п е ц. Юрайка, Юрайка, ці зялёна мураўка !
Траўка-мураўка зеляненька.
На вуліцы дзевачак поўненька.

Х л о п е ц. Вы, жонкі, вы ўставайце раненька,
Вы ўставайце раненька, вы ганіце каровак,
Вы ганіце каровак ды на Юр'еву расу,
Ды на Юр'еву расу, ды на Божую красу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Гучыць песня “Юрачка”. Дзеці па чарзе выходзяць парамі для абраду засцярогі.)*

1-ы в у ч а н ь. Заяц, заяц, ці горка асінка?

З а я ц. Горка!

1-ы в у ч а н ь. Няхай жа наша скацінка так горка ваўку.

2-і в у ч а н ь. Крывы, крывы! Ці дойдзеш ты?

В о ў к. Не, не дайду. Не бачу.

2-і в у ч а н ь. Няхай жа воўк ніколі не бачыць нашай скаціны.

3-і в у ч а н ь. Калода, калода! Ці павернешся?

К а л о д а. Не, не павярнуся!

4-ы в у ч а н ь. Зязюля, зязюля! Прыкуй нашу скацінку, каб яна не разбягалася, воўку ў зубы не давалася.

З я з ю л я. Прыкую.

4-ы в у ч а н ь. Дзе гэта скацінка будзе начаваць?

*(Дзед кідае ўгару кусок хлеба.)*

Д з е д. Каб наша скацінка ўгору скакала.

*(Гучыць песня “Ой, пралятталі два галубочкі”.)*

В я д у ч ы. Вы ведаеце прыкметы ў гэты дзень?

– Як дожджык на Юр’я, то будзе хлеб і ў дурня.

– Юрый казаў: “Жыта ўраджу”, Мікола адказаў: “Пашу пагляджу”.

– Як на Юр’я мароз, дык на балоце авёс.

– Калі прыйдзе Юры, не ўгледзіш у жыце куры.

– Да Юр’я карма і ў дурня.

– Юр’ева раса – не трэба коням аўса.

Д з я ў ч а т ы. Хлопцы, вы не забудзьце, што сёння яшчэ трэба абстрыгчы коням хвасты і грывы.

Х л о п ц ы. Памятаем. А вы, дзяўчаты, не забудзьце абкурыць вечарам карову купальскімі зёлкамі, а вербную галінку ўтыркнуць у страху хлява для засцярогі.

Д з я ў ч а т ы. Помнім, помнім!

Б а б а. А яшчэ ёсць такі звычай на Юр’еў дзень – мяняцца хусткамі.

Д з я ў ч а т ы. Памяняемся! *(Мяняюцца хусткамі.)*

*(Гучыць песня “Чарнаморац”.)*

Д з е д. Давайце зараз у Юр’я папросім добрага ўраджаю, цёплага дожджыка, ласкавага сонейка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У с е. Юр’я, Юр’я, Юр’я!
Б а б а. Урадзі жыта-пшаніцу,
Пабі кукаль-мятліцу.
Выпусці цёплую расіцу
На жыта, на пшаніцу.
*Дзяўчаты водзяць карагод.*

Ой, выйду я на вулачку, бычкі бушуюць,
Юр’я, Юр’я, бычкі бушуюць.
Бычкі бушуюць, бо вясну чуюць.

Зашумелі рэчкі, ляды паплылі,
Зачарнела зямліца, бо пааралі,
Юр’я, Юр’я, бо пааралі.

Кветкі збіралі вяночкі віці.
Вяночкі віці, Юр’я спяваці,
Юр’я, Юр’я, Юр’я спяваці.

Д з е д. Вун і статак з поля вяртаецца.

Б а б а. А я замову прачытаць павінна: уставала я ранюсенька, умывалася бялюсенька, выганяла я кароўку ў зялёную дуброўку, на Юр’еву расу, у чыстае поле, мая кароўка будзе ўросная, заўсёды малосная.

Д з е д. Пойдзем сваіх каровак сустракаць. Не забудзьце толькі вербныя галінкі свянцоныя.

Д з я ў ч а т ы. Я кароўку дамоў прыганю,
Дамоў прыганю, у хлеў заганю,
У хлеў заганю, слаўцо загавару.
Х л о п е ц. Гэтаму статку
Не будзе ўпадку
Ні ад мядзведзя, ні ад нарову,
Ні ад гада бягучага,
Ні ад змея лятучага.
*Гучыць песня “Туман ярам”.*

Д з я ў ч ы н а. А зараз, гаспадары, скажыце магічныя словы, каб мы пайшлі з вашай хаты сустракаць нашу скацінку з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цеплынёй у сэрцы, а засцерагальныя словы дапамагалі і нам, і кароўкам.

Б а б а. Падай, маці, ключы
Адамкнуць зямліцу,
Выпусціць расіцу,
Карагод вадзіці
На новае лета.
Д з е д. Дзе карагод ходзіць,
Там жыцейка родзіць.
А дзе не бывае,
То там улягае.
Б а б а і Д з е д. Зберажы, Божа, і нас, і нашу скацінку!
*Усе выходзяць з галінкамі ў руках*.

***Аўтар сцэнарыя М.М.Федарэнка***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## У ВАДЗЯНЫМ ЦАРСТВЕ
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Гучыць “Песня кракадзіла Гены” з м/ф “Чабурашка”.*

*Каля задніка сцэны стаяць тры кубы, на кулісах – папяровыя рыбкі. Пачынае гучаць павольная мелодыя, на сцэне адбываецца купанне русалак, танец русалак, якія выводзяць з куліс Вадзянічка. Падчас танца на кубы становяцца персанажы: матрос Лом, багіня вады Ленія, Атлантыда. Русалкі знікаюць за кулісамі.*

В а д з я н і ч о к. Дзень добры, мае паважаныя сябры!
Я Вадзянік-Вадзянічок,
Вельмі мокры мужычок.
Я жыву ўжо сотню год,
Кожны дзень раблю абход,
Даглядаю рыб і ракаў
Ды ратую небаракаў
Ад драпежных рыб і сетак.

В а д з я н і ч о к. Вы ведаеце, сёння ў мяне дзень нараджэння. І я вельмі рады, што вы завіталі на маё свята. Вы мяне ўжо ведаеце, а я вас не. Давайце пазнаёмімся! На лік “тры” вы назавіце сваё імя, добра? Раз, два, тры! *(Дзеці называюць свае імёны.)* Нешта не ўсіх пачуў! Давайце яшчэ раз. Раз, два, тры! *(Дзеці зноў называюць свае імёны.)* Ну, вось мы з вамі і пазнаёміліся.

В а д з я н і ч о к. А ці ведаеце вы, што ў Беларусі вельмі многа азёр і рэк? Вы ведаеце, як яны называюцца? Давайце паглядзім, хто з вас больш ведае? Называйце рэкі і азёры, але па чарзе.

*(Дзеці называюць рэкі і азёры. Кожнага, хто назваў, асістэнткі частуюць цукеркай і раздаюць 8 сініх і 8 зялёных жэтонаў.)*

В а д з я н і ч о к. А ці ведаеце вы, хто жыве ў рэках і азёрах Беларусі? А назвы якіх рыб вы ведаеце? Давайце вызначым лепшага знаўцу рыб. *(Гледачы называюць. Усім цукеркі.)* Малайчыны!

В а д з я н і ч о к. Рэзкі гук, быццам нешта ўпала ў ваду.

Чуеце? Нешта звалілася ў маё возера! Пайду пагляджу.

Ідзе да куліс, выносіць карту, тэлеграму і ліст з чароўнымі словамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ой, як цікава! Нехта даслаў мне тэлеграму, давайце разам пачытаем *(чытае тэлеграму):*

“Паважаны Вадзянічок! Віншуем цябе з днём нараджэння. Жадаем табе шчасця, здароўя. І дасылаем табе ў падарунак “Карту падарожжаў” і першае чароўнае заклінанне, якое перанясе ў першую краіну, у якой ты атрымаеш частку карты і наступнае заклінанне. Калі ты збярэш усю карту – даведаешся аб назве краіны, у якой шмат прыгожых азёр і рэк, лясы, напоўненыя птушынымі спевамі, шырокія раздольныя лугі. Прыемнага табе падарожжа. Твае сябры-лесавічкі з Палесся!”

В а д з я н і ч о к. Як цікава, сябры, давайце адправімся ў падарожжа разам. Згодны? Тады давайце разам прачытаем чароўнае заклінанне.

Хутка хвалі мы ўздымаем
І вандроўку пачынаем.

*Пачынае гучаць музыка, фігура на сярэднім кубе ажывае і пачынае танцаваць.*

Э п і з о д “Е г і п е т”

Л е н і я. Дзень добры, мае шаноўныя сябры! Я рада вітаць вас у краіне фараонаў, пірамід і сфінксаў – Егіпце. Я – багіня вады Ленія. У нашай краіне працякае самая доўгая рака свету – Ніл. Вада Ніла не раз выратоўвала расліны ад зною і спякоты. І зараз у нашай краіне зноў настала засуха. Сябры, дапамажыце выратаваць маё любімае дрэўца! Шмат гадоў яно прыносіла нам цудоўныя, вельмі смачныя і карысныя плады, якія любяць дзеці ва ўсім свеце. Дапаможаце мне? Зараз тыя, хто атрымаў сінія жэтоны, падыдзіце, калі ласка, да мяне. *(Падзяляе на дзве каманды, дае назвы, асістэнткі выносяць рэквізіт.)*

Л е н і я. З аднаго боку ад вас – вада ракі Ніл, а з другога боку – кубачкі, якія вы павінны напоўніць вадой, каб паліць наша дрэўца. Умовы такія: патрэбна ў лыжку набраць вады з Ніла, вельмі асцярожна данесці да кубачка, выліць і адразу бегчы перадаваць лыжку наступнаму ўдзельніку вашай каманды. Якая каманда напоўніць кубачкі хутчэй, тая і пераможа.

Л е н і я. За вашу перамогу я дару вам першую частку карты. Дзякуй вам вялікі за дапамогу! І нашае дрэўца таксама аддзячыла вам і падаравала вось гэтыя смачныя пачастункі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Выносяць мандарыны, частуюць імі членаў каманды і гледачоў.)* Частуйцеся, калі ласка, і праходзьце на свае месцы. Трымай, Вадзянічок, наступныя чароўныя словы!

В а д з я н і ч о к. Дзякуй табе, Ленія, за твае падарункі! Сябры, давайце аддзячым Ленію апладысментамі! Бывай!

Л е н і я. Бывайце! *(Знікае за кулісамі.)*

В а д з я н і ч о к. Вось у нас ёсць ужо першая частка карты і заклінанне. Давайце хутчэй чытаць!

Усім нам разам весялей,
Смела мы плывем далей!

*Гучыць мелодыя, фігура на першым кубе ажывае.*

Э п і з о д "В о с т р а ў"

М а т р о с. Дзень добры, адважныя падарожнікі! Я матрос Лом.

В а д з я н і ч о к. Прывітанне, Лом! Мы вандруем па свеце і шукаем часткі карты, каб даведацца назву краіны, у якой самыя прыгожыя рэкі і азёры. Ці можаш ты нам дапамагчы?

М а т р о с. Канешне, магу! Патрэбнае вам заклінанне і наступная частка карты знаходзяцца на далёкім бязлюдным востраве, але даплыць туды змогуць толькі самыя смелыя і спрытныя.

В а д з я н і ч о к. Паглядзі, як многа дзяцей вакол, і ўсе яны спрытныя і смелыя. Як жа мы вызначым найлепшага?

М а т р о с. Для таго, каб даплыць да бязлюднага вострава, патрэбна спачатку высветліць, ці ведаеце вы, з дапамогай чаго лодка рухаецца? Так! Гэта вясло, падыходзьце да нас! *(Запрашае на сцэну таго, хто першы правільна адказаў. Знаёміцца.)* А з дапамогай чаго карабель спыняецца? Так! Гэта сапраўды якар. Падыходзьце і вы да нас. Вас я прызначаю капітанамі каманд. І зараз тыя, у каго ў руках зялёныя жэтоны, падыдзіце да мяне. Вось, у нас ужо ёсць дзве каманды.

В а д з я н і ч о к. Цяпер патрэбны карабель.

М а т р о с. Так! Кожная каманда павінна намаляваць свой карабель і даць яму назву.*(Асістэнткі выносяць два лісты паперы і два маркеры.)* Вы падбягаеце па аднаму да ліста паперы, малюеце кожны па адной частцы карабля: нехта малюе ветразь, нехта штурвал ці якар. Потым бяжыць назад і перадае маркер наступнаму ўдзельніку. Калі карабель будзе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

намаляваны, напішыце побач яго назву. Хто хутчэй і прыгажэй намалюе карабель, той і перамог. Зразумела? Пачынаем!

В а д з я н і ч о к. Якія цудоўныя караблі ў нас атрымаліся! Паглядзіце.

М а т р о с. Сапраўды цудоўныя. Цяпер мы можам адпраўляцца ў плаванне. Але гэта вельмі небяспечна: на шляху нас падсцерагаюць рыфы!

В а д з я н і ч о к. Нічога, нашы каманды справяцца!

М а т р о с. Каб прайсці праз рыфы, вы павінны па аднаму кожны па чарзе аббегчы рыфы, вярнуцца і стаць за апошнім удзельнікам. Потым уся каманда, трымаючыся адзін за аднаго, павінна асцярожна і хутка аббегчы рыфы. Самыя акуратныя і спрытныя перамогуць.

*Асістэнткі выносяць 8 "рыфаў" (бутэлькі, напоўненыя вадой) і ставяць іх у 2 рады ( 30–40 см адзін ад аднаго.)*

М а т р о с. Сапраўды, вы ўсе спрытныя і смелыя. Цяжка вызначыць самага-самага! Таму апошняе слова за капітанамі. Яны застаюцца са мной, астатнія, калі ласка, атрымайце пачастункі і праходзьце ў залу.

В а д з я н і ч о к. А якое ж выпрабаванне будзе для нашых капітанаў?

М а т р о с. Нас выкінула на бераг бязлюднага вострава. А там рассыпаны жамчужыны. Яны так ззяюць, што нам цяжка ўбачыць чароўнае заклінанне. Капітаны павінны з завязанымі вачыма за 1 хвіліну сабраць як мага больш жамчужын. А каманды могуць з месца падказваць сваім капітанам.

Стоп! Час выйшаў! Давайце разам падлічым, колькі жамчужын сабралі капітаны. *(Падлічваюць.)* Вось наш пераможца *(узнагароджвае),* трымайце падарункі, сядайце на месцы. А вось чароўнае заклінанне і частка карты.

В а д з я н і ч о к. Дзякуй табе, Лом! Давайце разам аддзячым Лома за дапамогу!

М а т р о с. Прыемна было падарожнічаць разам з вамі! Да пабачэння! *(Знікае за кулісамі.)*

В а д з я н і ч о к. Ну, вось у нас ёсць яшчэ адно заклінанне. Давайце хутчэй чытаць: "Нас чакаюць мамы, таты, смела мы плывем да хаты!"

*Пачынае гучаць мелодыя, апошняя фігура "ажывае".*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эпізод "Атлантыда"

А т л а н т ы д а. Вітаю вас, сябры, вы ў Атлантыдзе. Наша краіна вельмі незвычайная, яна знаходзіцца пад вадой. Паміж намі ёсць істоты, у якіх замест ног – хвост рыбы. Вы ведаеце, як завуцца такія істоты? *(Таго, хто першы правільна адказаў, запрашае на сцэну.)* Так, гэта сапраўды русалкі. Калі ласка, падыдзі да мяне. *(Знаёміцца.)* Ты прыйшоў сюды з сябрам? Пакліч яго да нас. Вы будзеце капітанамі і павінны хуценька сабраць сабе ў каманду па чатыры чалавекі. Пачалі! *(Збіраюць.)* Добра. Гэта каманда будзе называцца "Русалкі", а гэта каманда – "Кіты". Адкажыце, ці плавалі вы калі-небудзь пад вадой? *(Пытанне да каманд.)* Зараз паспрабуем. *(Выносяць рэквізіт.)* Вам патрэбна апрануць на ногі ласты, узяць у руку стакан з вадой і падняць яго над галавой. Такім чынам вы апынаецеся "пад вадой". Вы хуценька аббягаеце "рыф", вяртаецеся да каманды і перадаяце эстафету наступнаму ўдзельніку. Якая каманда хутчэй гэта зробіць, тая і перамагла!

А т л а н т ы д а. Малайцы! Вы ўсе вельмі добра выканалі маё заданне. Усім салодкія падарункі. Трымайце і сядайце ў глядзельную залу.

А т л а н т ы д а. А ты, Вадзянічок, трымай наступную частку карты і чароўныя словы.

В а д з я н і ч о к. Вялікі дзякуй табе! Сябры, давайце ўсе разам скажам Атлантыдзе "дзякуй"!

А т л а н т ы д а. Рада была вам дапамагчы. Да пабачэння! *(Знікае за кулісамі.)*

В а д з я н і ч о к. Нам засталося знайсці апошнюю частку карты. Давайце хуценька разам скажам апошнія словы: "Нас чакаюць мамы, таты, смела мы плывём дахаты!"

*(Пачынае гучаць музыка, пад якую танцавалі русалкі і якая гучала напачатку праграмы.)*

В а д з я н і ч о к. Ой, як добра мы павандравалі, пабывалі ў розных краінах. Вам спадабалася? Але, як кажуць, "жыве кулік, дзе прывык". Як добра вярнуцца дадому. Але ж апошнюю частку карты мы так і не знайшлі! Як жа мы даведаемся аб назве цудоўнай краіны?

*(Выходзіць адна з "русалак"-асістэнтак з апошняй часткай карты.)*

Р у с а л к а. Няўжо ты не здагадаўся, Вадзянічок, што гэта краіна – наша Беларусь! *(Аддае Вадзянічку частку карты,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*той вешае яе на заднік сцэны.)* Толькі ў ёй ёсць такія прыгожыя рэкі і азёры.

В а д з я н і ч о к. І сапраўды!

Р у с а л к а. Напэўна, Вадзянічок, ты за ўсімі гэтымі падарожжамі забыўся пра свой дзень нараджэння?

В а д з я н і ч о к. Ой, і праўда забыўся!

Р у с а л к а. А мы не забыліся! *(На сцэну выносяць торт з запаленымі свечкамі.)* Віншуем цябе! Кожны ў свой дзень нараджэння можа загадаць сваё самае запаветнае жаданне, і яно абавязкова споўніцца. Загадвай!

В а д з я н і ч о к. Я хачу, каб усе рэкі і азёры Беларусі былі чыстымі і каб вы, сябры, любілі і шанавалі прыроду! *(Задувае свечкі.)* Які цудоўны падарунак! *(Да гледачоў.)* Сябры, дзякуй вам, што дапамагалі мне ў падарожжы. Усіх вас я хачу пачаставаць! *(Частуе гледачоў тортам.)* Дзякуй, што завіталі на маё свята! Да наступных сустрэч!

***Аўтар сцэнарыя В.А.Патаповіч***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# У СВЕЦЕ РЫБ
## *(сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы)*

*Сцэна ўяўляе школьны клас. На задніку сцэны вісіць намаляваная будова рыбы, на сцяне – плакат з рэбусамі. Пасярэдзіне пляцоўкі знаходзяцца два сталы (парты), каля сценкі – стол для журы. Звініць званок. У глядзельную залу забягаюць вучні і становяцца паміж гледачамі. Выходзіць Вядучая – настаўніца.*

В я д у ч а я. Добрай раніцы, паважаныя сябры! Сядайце на свае месцы і будзем пачынаць урок. Я вельмі рада, што сёння ў гэтай зале сабраліся два класы – 7 “А” і 7 “В”. Менавіта сёння мы з вамі правядзём заключны ўрок на тэму “У свеце рыб”. Усе вы добра працавалі ў гэтым годзе, вывучалі будову і паводзіны рыб. А сёння мы правядзём спаборніцтва, хто лепш з вас ведае гэтае царства рыб. Вы яшчэ больш дазнаецеся аб рыбах, чым ведаеце. Пазнанне таямніцы гэтага царства – даўняя мара чалавека. І няхай не кожны можа акунуцца ў яго глыбіні і пабачыць там нешта цудоўнае і незвычайнае, але зрабіць вугалок жывой прыроды, заключаны ў звычайным акварыуме, можа кожны.

Не шукайце красы за марамі  
Узбярэжжаў з крыштальнымі зорамі,  
Прыязджайце да нас, сюды.  
Тут азёры, як неба, сінія,  
У чаротах чароды гусіныя,  
А на дне млечным шляхам свецяцца  
Трапяткія гурты язіныя.

В я д у ч а я. А зараз я пагляджу, хто з вас больш ведае рыб, якія плаваюць у рэках, азёрах, морах і акіянах.

(*На сцэну памочніца выносіць малюнкі з рыбамі. Трэба назваць, якія рыбы намалёваны і пазнаць іх на малюнку.)*

В я д у ч а я. Дык вось, першае пытанне 7-у “А”.

1. Адкажыце, як называецца самая вялікая рыба ў свеце? (*Кітовая акула.)*

В я д у ч а я. Другое пытанне 7-у “В”.

2. Якая самая драпежная рыба, што водзіцца ў водах Амазонкі? *(Піранья.)*

В я д у ч а я. Зараз пытанне для ўсіх. Слухайце ўважліва.

3. Самая хуткая рыба ў свеце? *(Меч-рыба.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В я д у ч а я. Добра, далей працягваем па чарзе.

4. Якая рыба бегае па зямлі хутчэй за чалавека? *(Ілісты прыгун.)*

В я д у ч а я. Наступнае пытанне.

5. Мяса якой рыбы найсмачнейшае? (*Угра.)*

6. Якой рыбай можна пабрыцца, выкарыстоўваючы электрабрытву? *(Угар электрычны.)*

7. На гербе якога горада Беларусі намалявана ў блакітным полі рыбацкая сетка, уверсе – тры залатыя рыбы, накіраваныя галовамі на дол? *(Горада Паставы.)*

8. Назавіце самую пражорлівую рыбу. *(Таўсталобік, ці Белы амур.)*

9. Якую рыбу называюць каралеўскай? *(Стронгу.)*

10. Назавіце самую маленькую рыбу, якая ў'е сабе гняздо. *(Калюшка.)*

В я д у ч а я. Зараз я папрашу да мяне выйсці толькі тых, хто правільна даў адказы на мае пытанні.

(*Выходзяць вучні.)*

В я д у ч а я. Такім чынам, у нас атрымаліся дзве каманды. Адна каманда – карасі, а другая – акуні. Ці згодны вы? *(Адказ.)*

В я д у ч а я. А зараз, паважаныя вучні, я папрашу вас прайсці на месцы за парты. Паглядзіце, калі ласка, на вашыя парты. *(На партах ляжаць папера, аловак, клей, лентачка, нажніцы.)*

В я д у ч а я. На іх ляжаць розныя прадметы. Вам трэба за 5 хвілін зрабіць эмблему вашай каманды з гэтых прадметаў, але выкарыстоўваць можаце не ўсе прадметы, а толькі тыя, якія лічыце, што вам найбольш зручныя. Эмблему каманды вы павінны зрабіць так, каб яна адносілася да тэмы нашага ўрока. Зразумела? Пачалі.

*(Удзельнікі рыхтуюцца. Каб ім не перашкаджалі, закрываецца заслона.)*

В я д у ч а я. Пакуль нашы ўдзельнікі рыхтуюцца, я прапаную вам адгадаць путанку "Рыбы Беларусі". Калі ласка, паглядзіце ўсе ўбок. Бачыце, дзе яна знаходзіцца? *(Адказ.)* Добра.

1. Адкажыце, як называецца рыба пад нумарам 1? *(Шчупак.)*

2. А ці ведаеце вы рыбу рэк пад нумарам 2? *(Галавень.)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Пад лічбай 3 знаходзіцца рыба, занесеная ў Чырвоную кнігу Беларусі. *(Стронга.)*

4. Пад нумарам 4 пазначана рыба, што нерасціцца зімой. *(Мянтуз.)*

5. Як называецца драпежная рыба сямейства акунёвых? *(Акунь.)*

6. Сажалкавая рыба вадаёмаў Беларусі? *(Карась.)*

В я д у ч а я. Добра. Я бачу, што вы ведаеце. А зараз я папрашу ўсіх, хто адказаў правільна на пытанні, заняць месца за гэтым столікам. Вам даецца права шаноўнага журы вызначыць сёння самых лепшых удзельнікаў. У вас на стале ляжаць адзнакі, якімі вы будзеце вызначаць сённяшніх пераможцаў. Адзнакі будзеце ставіць па пяцібальнай шкале.

*(Заслона адкрываецца. На сцэне з'яўляюцца ўдзельнікі.)*

В я д у ч а я. Я бачу, што нашыя каманды падрыхтаваліся. І самы час паказаць эмблемы каманд. Дык вось – эмблема каманды карасёў. *(Паказваюць сваю эмблему.)* І вашыя апладысменты. Эмблема каманды акунёў *(Паказваюць сваю эмблему.)* І вашыя апладысменты. Ну, а зараз, адзнакі нашага журы. Яшчэ раз – эмблема карасёў, эмблема акунёў.

Дзякуй вам, паважаныя, ну, а мы працягваем нашую гульню.

В я д у ч а я. Другое заданне атрымліваюць нашыя ўдзельнікі. Зараз я папрашу з каманды па аднаму ўдзельніку падысці да мяне і выцягнуць па паперцы. На гэтай паперцы напісана заданне, якое вам трэба падрыхтаваць разам з камандай. На падрыхтоўку задання даецца 5 хвілін.

*(Трэба мімічна паказаць сюжэт казак "Золотая рыбка", "По щучьему веленью".)*

В я д у ч а я. Зараз, сябры мае, я думаю надышоў самы час прадставіць журы. Журы ў нас незвычайнае, з самога царства рыб, і таму кожнага члена журы я папрашу ўявіць сябе рыбай, стаць рыбнай стаяй.

*(На сцэну памочніца выносіць карціны з рыбамі.)*

В я д у ч а я. Дык вось, першы ўдзельнік журы – рыба сямейства ўюнковых – "уюн" (інакш – "піскун"). Асабліва шырока распаўсюджана ў палескіх вадаёмах, а таксама ў вадаёмах Еўропы. Можа служыць своеасаблівым барометрам. Напярэдадні навальніцы ўсплывае на паверхню вады 10–15 ра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зоў у мінуту, а калі добрае надвор’е – тады толькі адзін раз за 10–15 мінут.

В я д у ч а я. Другі ўдзельнік журы – рыба “аўсянка” ці яшчэ яе называюць вярхоўкай. Гэта адна з самых маленькіх рыб у Беларусі. У залежнасці ад характару грунту фарба аўсянкі бывае святлейшай ці цямнейшай.

В я д у ч а я. Рыба “галавень” праяўляе цікаўнасць да ўсіх падаючых рэчаў, спрабуе іх на ядомасць, гэтая рыба нерасціцца зімой.

В я д у ч а я. Карась. Карася можна ахарактарызаваць высокай жыццеўстойлівасцю. Нават у зімовы перыяд ён зарываецца ў іл, праводзіць там усю зіму, не харчуючыся. Калі нават прамерзне рэчка, карась не гіне, а цалкам узнаўляе свае жыццёвыя функцыі.

В я д у ч а я. Рыба “быстранка”. Невялічкая рачная рыбка, вельмі прыгожая. Перад нерастам фарба яе становіцца яшчэ больш выразнай, яркай, зрэдку з чырвоным адценнем.

*(Адкрываецца заслона, на сцэне з’яўляюцца ўдзельнікі.)*

В я д у ч а я. Я бачу – нашыя ўдзельнікі падрыхтаваны. Тады пачнем з каманды акунёў. Калі ласка, выходзьце на сярэдзіну.

*(Каманды паказваюць заданне, потым журы ставіць адзнакі.)*

В я д у ч а я. Добра, павіншуем каманду, якая перамагла ў гэтай размінцы. Вас, журы, папрашу таксама ўлічыць гэты конкурс.

В я д у ч а я. Ну што, працягнем далей наш урок. Дык вось, усе мы ведаем, што рыбы вельмі хутка плаваюць, выратоўваючыся ад пагоні і наўздагон за здабычай. Зараз мы і паглядзім, ці жвавыя вы такія, як рыбы. Вось там *(на падлозе)* ляжыць ваша здабыча. Але вам трэба прайсці праз перашкоды, каб яе здабыць. Кожны з вас будзе ўдзельнікам і перашкодай. Зараз я папрашу ўдзельнікаў усіх каманд выстраіцца ў дзве лініі, паралельна адна адной. Апошні, пяты ўдзельнік будзе пачынаць гульню. Ён павінен прабегчы сярод удзельнікаў, забраць здабычу і вярнуцца назад, перадаўшы здабычу наступнаму – чацвёртаму ўдзельніку. Чацвёрты ўдзельнік павінен будзе пакласці яе на месца, трэці – забраць, другі – пакласці, а першы – забраць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В я д у ч а я. Калі ласка, я папрашу ўдзельнікаў падысці ўперад на крок, удзельнікаў пад нумарамі 1–4 папрашу прысесці, расставіўшы рукі ў бакі, стварыўшы перашкоду. Але калі вам перадаюць здабычу, вы будзеце ўдзельнікамі. Зразумела?

*(Праходзіць гульня.)*

В я д у ч а я. Дзякуй вам за ўдзел у гэтым конкурсе. Сядайце на свае месцы. Ну, што ж, журы, я думаю надышоў час падвесці вынікі нашага спаборніцтва, вызначыць, хто лепшы з класаў – 7 “А” ці 7 “В”. На гэта вам даецца 5 хвілін. А я прапаную правесці аўкцыён песень, дзе ўпамінаюцца рыбы ці вада.

*(Праходзіць аўкцыён песень.)*

В я д у ч а я. Добра. Малайцы! Я бачу, што журы ўжо гатова падвесці вынікі. Калі ласка, журы, вам слова. Дык вось, вашыя адзнакі і хто перамог сёння ў спаборніцтве?

(*Журы падводзіць вынік урока.)*

В я д у ч а я. Павіншуем усіх апладысментамі.

*(Звініць званок.)*

В я д у ч а я. Вось і скончыўся наш урок. Мы пабачылі сёння, якія веды маюць нашыя вучні. Дзякуй вам, журы, за вашую працу, за дапамогу, вы добра ўяўлялі сабе ўсё, што тут адбывалася. За гэта вам салодкія пачастункі і камандзе пераможцаў таксама пачастунак.

*(Чуецца шум перапынку, гучыць фанаграма.)*

В я д у ч а я. На развітанне хачу вам пажадаць, каб вы любілі свой край з яго жыхарамі. Бо наш край – гэта спеўная ліра і крынічка, што з лесу бяжыць.

У свой край непахісная вера,
Што ён жыў, і жыве, і будзе жыць.

В я д у ч а я. Да пабачэння, сябры! Поспехаў вам у вучобе!

*Сцэну пакідае настаўніца. Чатыры ўдзельнікі забягаюць на сцэну, закрываецца заслона, гучыць фанаграма перапынку “У школе”.)*

***Аўтар сцэнарыя А.У.Шабліцкая***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗНАЁМСТВА З ЛЕСАМ
## *(сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы)*

Л е с а в і к. Добры дзень, мае маленькія сябры! Як шмат вас тут сабралася! А ці ведаеце вы, як мяне завуць? *(Адказ.)* Так, мяне завуць Лесавік. Я ўсё жыццё жыву ў лесе, назіраю за ўсім, што тут адбываецца, сачу за парадкам і чысцінёй. Добрым людзям я заўсёда рады, а злых я вельмі не люблю. А ці ведаеце вы, дзеткі, хто ў лесе жыве? *(Адказ.)* Малайцы! А вы ўсе любіце лес? *(Адказ.)* А ці жадаеце вы бліжэй пазнаёміцца з лесам і сябраваць з ім? *(Адказ.)* Вельмі добра. Я вам буду дапамагаць. Але, як вы, напэўна, ведаеце, у лесе акрамя мірных жыхароў, як верылі нашы продкі, жыве яшчэ і нячыстая сіла, пра якую нам распавядаюць паданні, легенды, павер'і. А ці ведаеце вы, чым вашыя продкі засцерагаліся ад нячыстай сілы? *(Адказ.)* Людзі засцерагаліся ад нячыстай сілы пры дапамозе амулетаў. Амулет – невялічкая рэч, якую насілі на целе і якая засцерагала ад нячыстай сілы і дурнога вока. А скажыце мне, дзеткі, якія дрэвы лясныя вы ведаеце?

*(З тых, хто адказвае, запрашае да сябе чатырох удзельнікаў.)*

Л е с а в і к. Зараз, перш чым пачаць нашае вандраванне па лесе, я прапаную вам зрабіць сабе амулеты з дубовых лісточкаў. Хто першы зробіць сабе амулет, той і пераможа. А амулет робіцца так: бярэце іголку з ніткай, 3 лісточкі, нанізваеце іх на нітку і завязваеце. Умовы зразумелыя? *(Адказ.)* Тады, пачалі.

*(Удзельнікам даюцца іголка з ніткай і 3 лісточкі. Ідзе гульня, даруюцца амулеты.)*

Л е с а в і к. Малайцы! Такія цудоўныя зрабілі амулеты. А цяпер вы можаце смела вандраваць па лесе і не баяцца нячыстай сілы. Дзеці, а ці чулі вы аб тым, што дрэвы таксама ўмеюць хадзіць? А ў якую ноч, паводле павер'я, дрэвы могуць пераходзіць з места на месца? Хто мне адкажа?

*(Адказ – у купальскую ноч. Таму, хто адкажа, дае лісточак.)*

Л е с а в і к. Дарма, што дрэвы ходзяць толькі раз у год. У астатнія дні, яны, як і людзі, маюць пачуцці, яны радуюцца, сумуюць. Калі дрэўцу нашкодзіць хтосьці, то яму вельмі балюча. Але ў лесе ёсць свой маленькі лекар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адгайце, хто гэта
У лясах жыве спрадвеку,
Лечыць летам і зімой
Дрэвы дзюбаю сваёй. *(Дзяцел.)*

*(Таму, хто адкажа, дае лісточак.)*

Л е с а в і к. Канешне, гэта дзяцел. Але дрэўцаў пашкоджаных у лесе шмат і дзяцел не можа ўсіх вылячыць. І зараз я прапаную нашым удзельнікам дапамагчы выратаваць нашыя дрэўцы. (*Запрашае на пляцоўкі тых, у каго ёсць лісточак. Яны бяруць з сабою па аднаму сябру. Кожнай пары ўдзельнікаў даюцца па аднаму дрэўцу з надламанай галінкай і бінт.)*

Л е с а в і к. Па маёй камандзе вы павінны перабінтаваць надламаную галінку. Якая пара зробіць гэта лепш і хутчэй, тая і пераможа. Умовы зразумелыя? Тады пачалі.

(*Праводзіцца гульня. Усіх частуюць арэшкамі, а пераможцам дораць адзін амулет.)*

Л е с а в і к. У лесе вельмі шмат дрэў. А скажыце мне, якое дрэва, яго карані, лісцікі, жалуды, кару і, наогул, усё, вашыя продкі лічылі цудадзейным? *(Адказ.)* Правільна, дзеткі. Гэта дуб. Спакон вякоў людзі адносіліся з павагай да дуба. Асаблівай павагай карысталіся самыя тоўстыя і магутныя дубы. А скажыце мне, якія словы замацаваныя за дубам?

*(Называюць: моцны, дужы, магутны, шырокі і інш.)*

Л е с а в і к. І сапраўды, дуб людзі называлі па-рознаму. *(Паказвае на дуб на задніку.)* Вось паглядзіце, які ён прыгожы, сталы, моцны, ён сёння вам таксама дапаможа, падорыць амулеты са сваіх лісточкаў. Дзеткі, а скажыце мне, калі ласка, якія, акрамя дрэў, яшчэ вы ведаеце расліны?

*(Называюць расліны.)*

Л е с а в і к. Добра. А зараз адгадайце мае загадкі.

1.Сядзіць паненачка
Ў чырвонай сукеначцы,
Хто міма ні пройдзе,
Усякі ёй паклоніцца. *(Суніца.)*

2. Хто ў капялюшы,
Але без галавы? (*Грыб.)*

(*Тых, хто адгадвае загадкі, вядучы запрашае да сябе.)*

Л е с а в і к (*да гледачоў).* Вы любіце збіраць грыбы і ягады? *(Адказ.)* Зараз мы гэта праверым. Мы завяжам вам



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вочы, і вы будзеце збіраць грыбы і ягады. Пераможа той, хто назбірае іх больш.

(*Удзельнікам завязваюць вочы, даюць па карзіне. На пляцоўцы раскідваюцца намаляваныя грыбы і ягады. Праводзіцца гульня. Удзельнікаў частуюць арэшкамі. Пераможцу дараць амулет.)*

Л е с а в і к. Як добра вы збіралі грыбы і ягады! А ці ведаеце вы стравы, якія можна прыгатаваць з грыбоў? Я аб'яўляю аўкцыён страў, прыгатаваных з грыбоў. Хто апошні назаве страву, той атрымае наш пачастунак.

*(Праводзіцца аўкцыён. Пераможцу частуюць арэхамі і дараць амулет.)*

Л е с а в і к. А скажыце мне, калі ласка, якіх лясных жыхароў вы ведаеце? (А*дказ.)* Так, у лесе шмат жыхароў. А зараз я пагляджу, як вы адгадваеце жыхароў леса:

1. Хто, выходзячы з нары,
   Ноч палюе ў бары.
   Памялом, хітрун,
   Як след замятае.
   Замятае сам свой след? *(Ліса.)*

2. Хто над голлем дрэў сігае,
   Як агнём, хвастом мігае,
   Дома, сеўшы над застрэшкам,
   Лушчыць шышкі і арэшкі? (*Вавёрка.)*

3. Хто мае хвост куртаты,
   Бараду і нос гарбаты,
   Носіць, лесам ідучы,
   Замест шапкі два карчы? (*Лось.)*

4. Паўзун паўзе
   І іголкі вязе? (*Вожык.)*

5. Ён вялікі і касматы.
   Кажуць, што ён смокча лапу,
   Моцна можа ён равець,
   Хто гэта такі ? (*Мядзведзь.)*

6. Сонца летняе пячэ
   Або дождж маросіць –
   Футру шэрую яшчэ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ён да часу носіць.
Холадам дыхне зіма,
І ўсім на здзіўленне –
Футры шэрае няма,
У белым ён адзенні. *(Заяц.)*

*(Тых, хто адгадвае загадкі, запрашае да сябе.)*

Л е с а в і к. Як добра вы ведаеце жывёл! А скажыце мне, вы любіце танцаваць? *(Адказ.)* А ці ведаеце вы, што звяры таксама любяць танцаваць? *(Адказ.)* Зараз вы ўсе станеце ў кола і пад музыку будзеце рухацца і танцаваць. Але не проста танцаваць. Я буду называць жывёл, а вы павінны будзеце ў рухах іх паказаць. Умовы зразумелыя ? *(Адказ.)* Тады пачалі.

*(Праводзіцца гульня. Усіх удзельнікаў частуюць арэхамі.)*

Л е с а в і к. Малайцы! Так добра гулялі, а зараз выйдзіце, калі ласка, да мяне тыя, хто атрымаў на працягу гульні амулеты.

(*Выходзяць удзельнікі.)*

Л е с а в і к. Спакон вякоў адносіліся да дубоў з павагай. Іх лічылі свяшчэннымі, ім пакланяліся, прыносілі ахвяры. Людзі лічылі, што па дубе падымаюцца і спускаюцца Богі. Зараз, мае сябры, я запрашаю вас падысці да нашага свяшчэннага магутнага дуба. (*Усе падыходзяць да дуба.)* Кажуць, што дуб валодае магутнай энергіяй. Дакраніцеся да яго. *(Кладуць руку на дуб.)*

Л е с а в і к. Шаноўны волат, свяшчэнны дуб, паглядзі, якія добрыя сэрцы прыйшлі да цябе, якія шчырыя ў іх твары і душы. Цяпер яны ведаюць, што трэба берагчы прыроду, дык не адбяры іх сваёй сілай. Дай ім здароў'я, добрага лёсу і доўгага веку. Абарані іх светлыя мары ад усяго дурнога, і ўзнясуць яны табе ўдзячнасцю сваёй.

(*У гэты момант з верхавіны дуба падаюць на зямлю тры галінкі. Лесавік падымае іх і аддае дзецям.)*

Л е с а в і к. Вазьміце гэтыя галінкі, нясіце іх у натоўп, няхай усе дакранаюцца да іх і набіраюцца гаючай сілы, моцы, здароў'я. Вялікі дзякуй вам за такую цудоўную сустрэчу.

Хоць добра з вамі мне было,
Але патрэбна развітацца.
Бо аглядаць далёкі лес
Пара прыйшла мне адпраўляцца.

А вы жывіце дружна тут,
Здаровымі і ў шчасці,
Шануйце сваіх продкаў кут –
І вас мінуць няшчасці.

Шануйце ўсё на гэтым свеце:
Малы расточак і гару,
Шануйце сонца і паветра,
Шануйце дуб, агонь, ваду.

Вам гэты перадаць наказ
Ад продкаў вашых мушу,
Вы не забудзьце яго ўраз,
А пакладзіце ў вашу душу.

Да новых сустрэч, мае сябры! Прыходзьце да мяне ў госці!
***(****Пад гукі лесу Лесавік пакідае сцэну.)***

***Аўтар сцэнарыя К.І.Ачапоўская***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СКАРБЫ ЛЕСУ
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Чуваць шум лесу, спевы птушак. Выходзіць Лесавічок і спявае песеньку на матыў “Дзед Барадзед”.*

Л е с а в і ч о к. Хто я – старычок,
Старычок-Лесавічок.
Абыходзіць увесь лес
Мой любімы інтарэс.

Ого! Дзе гэта я апынуўся? Якая незвычайная паляна. Колькі на ёй розных грыбоў ды ягад. Вось дык дзіва! Але тут яшчэ нехта ёсць. *(Сам сабе.)* Падыду бліжэй ды пазнаёмлюся.

Л е с а в і ч о к. Добры дзень! Мяне клічуць Старычок-Лесавічок. А вы хто?

Д з е ц і. Мы – дзеці.

Л е с а в і ч о к. Вы, напэўна, завіталі сюды, каб сабраць цудоўныя скарбы лесу?А галоўныя скарбы лесу – гэта…

Д з е ц і. Грыбы і ягады.

Л е с а в і ч о к. Праўда! Грыбы ды ягады. Я пра іх усё ведаю. І вас навучу, як адрозніць дрэнныя ад ядомых. Гэта вам спатрэбіцца, калі вы пойдзеце ў лес разам са сваімі бацькамі. Згодны! Даражэнькія, а можа ўжо хто-небудзь хадзіў за грыбамі па-сапраўднаму? Ёсць такія? Вось зараз і пабачым. Хто ведае шмат грыбоў? Зараз вы па чарзе будзеце называць грыбкі. А за кожны адказ я дам вам кошык, у які буду класці грыбок. Добра?

*(Праводзіцца аўкцыён.)*

Л е с а в і ч о к. Пра грыбы вы ведаеце. А ці ведаеце, якія ягады растуць у лесе? Адказвайце таксама па чарзе, а за кожны правільны адказ я буду класці ў кошык ягадку. Дамовіліся?

*(Праводзіцца конкурс “Назаві ягадку”.)*

Л е с а в і ч о к. Вельмі добра. Грыбоў ды ягад вы ведаеце шмат. А ці ведаеце вы, як яны выглядаюць?

Д з е ц і. Ведаем!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л е с а в і ч о к. Вось зараз і пабачым. Кожныя ўдзельнікі каманд павінны намаляваць грыбы і ягады. Хто болей намалюе, той атрымае ў свой кошык яшчэ грыбок ці ягадку.

*(Праводзіцца конкурс малюнкаў.)*

Л е с а в і ч о к. Вы вельмі добра ведаеце, як выглядаюць грыбы ды ягады. Зараз можаш смела адпраўляцца за імі ў мой цудоўны лес. Бярыце свае кошыкі. (*У гэты час з'яўляюцца Мухамор і Воўчае лыка. Яны спрабуюць залезці ў кошыкі.*)

М у х а м о р. Паглядзі, кошыкі стаяць! Гэта, мусіць, нас чакаюць. Няхай прынясуць нас дадому і зварацць з мяне суп.

В о ў ч а е  л ы к а. А з мяне кампот.

М у х а м о р. Ага, наядуцца – ды ў бальніцу. Вось добра, вось цудоўна!

Л е с а в і ч о к. Паглядзіце дзеці! Нейкія нечаканыя госці да нас завіталі. Вы хто такія?

М у х а м о р. Я самы прыгожы грыб! Мяне любяць усе: і ласі, і вавёркі.

Л е с а в і ч о к *(да каманды грыбоў "Баравікі").* Дзеці, вы ведаеце, што гэта за грыб?

Д з е ц і. Мухамор.

М у х а м о р. Ух! Спазналі! А вось маю сяброўчку ніколі не спазнаеце.

В о ў ч а е  л ы к а. Я – цудоўная ягада. Расту сабе сярод лесу. Вельмі падобная на парэчку. Ну, сапраўдны чырвоны карал.

Л е с а в і ч о к. На каралы ты зусім не падобная. Не верце ёй, дзеці, я спадзяюся вы яе пазналі? *(Да каманды ягад "Сунічка".)*

Д з е ц і. Гэта Воўчае лыка.

Л е с а в і ч о к. Сапраўды! Гэтыя грыбы і ягады атрутныя. Не пусцім іх у кошыкі. Ідзіце прэч з нашай паляны. У нас разумныя дзеці, яны лёгка адрозняць дрэнныя грыбы ад ядомых.

М у х а м о р. Вось зараз і пабачым, як яны змогуць адрозніць. Мы правядзём для іх цікавае выпрабаванне. Калі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яны адрозняць дрэнныя грыбы і ягады ад ядомых, мы самі знікнем, а калі не, то вы нас возьмеце ў свае кошыкі.

Л е с а в і ч о к. Ну што, дзеці, паспрабуем адрозніць? Будзьце ўважлівы. Яны вельмі хітрыя і паганыя істоты.

*(Конкурс "Па грыбы, па ягады" праводзяць Мухамор і Воўчае лыка.)*

В о ў ч а е л ы к а. Зноў нас перамаглі.

М у х а м о р. Напэўна, ім нехта дапамагае.

Л е с а в і ч о к. Ніхто ім не дапамагае. Дзеці ўсё ведаюць самі. А вы, даражэнькія (*да Мухамора і Воўчага лыка*), чаго тут затрымаліся? Прэч адсюль!

(*Мухамор і Воўчае лыка знікаюць. Чуецца страшны рык мядзведзя.*)

М я д з в е д з ь. У-у!!! Хто ў лесе шуміць, хто мне спаць не дае? Затапчу, заламаю!

Л е с а в і ч о к. Супакойся, Мішанька. Гэта мы. Я Старычок-Лесавічок, а гэта мае сябры. Яны сапраўдныя знаўцы лесу, паважаюць і любяць прыроду. Завіталі сюды, каб атрымаць карысныя веды па зборы грыбоў ды ягад. Паглядзі ў кошыкі, колькі там лясных скарбаў. І ўсё гэта яны атрымалі пры дапамозе сваіх ведаў. Можа ты, Міша, дапаможаш нам? Дасі некалькі саветаў?

М я д з в е д з ь. Ну, калі так, тады добра. Я вам дапамагу. Толькі і вы не сядзіце. Я буду задаваць вам пытанні, а вы давайце правільныя адказы.

*(Праводзіцца конкурс "Увага! Небяспека!")*

1. Што трэба рабіць, калі каля ягаднага куста скруцілася ў клубок гадзюка? *(Сысці з гэтага месца.)*

2. А калі каля малінніку вы заўважылі некалькі вужыкаў? *(Можна працягваць збіраць ягады.)*

3. Гуляючы па лесе, вы заўважылі, што дрэвы скончыліся, а пад нагамі мох, з якога цячэ вада. Што рабіць? *(Гэта балота, далей ісці нельга.)*

4. Чаму ў лес нельга хадзіць без галаўнога ўбору? *(У лесе водзяцца кляшчы.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М я д з в е д з ь. Малайцы, дзеці! Шмат ведаеце, у лесе не згубіцеся. Жадаю вам поспехаў. А мне трэба крыху падмацавацца. Да пабачэння. *(Пакідае сцэну.)*

Л е с а в і ч о к. Да пабачэння, Міша, дзякуй табе.

Мы тут з вамі танцавалі,
У гульні розныя гулялі.
Вы стаміліся ці не?
Хуценька кажыце мне?

Цяпер я разумею, што вы шануеце нашу родную прыроду, яе лясы і тое багацце, што яна нам дарые. Але, на жаль, надышоў час з вамі развітвацца. Мне патрэбна абыходзіць лясную гаспадарку. Прыходзьце да мяне ў мой прыгожы лес. Кожная кветачка, грыбочак ці ягадка будуць сардэчна вітаць вас. А ад сябе я жадаю павіншаваць нашыя каманды пачастункамі.

*(Праводзіцца ўзнагароджванне ўдзельнікаў.)*

Л е с а в і ч о к. Да пабачэння.

***Аўтар сцэнарыя Н.А.Валько***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАЗКІ СТАРОГА ЛЕСУ
## *(сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы)*

*Па двух баках залы стаяць лавы для дзяцей, у куце – лава для персанажаў казак. На экране ідзе дэманстрацыя казак.*

*Выходзіць Казачніца.*

К а з а ч н і ц а. Добры дзень, дзеці. Сёння я прынесла для вас многа розных казак. Але адкажыце мне, ці любіце вы глядзець і слухаць казкі? Ну, канешне, любіце. Бо ў казках вы сустракаеце шмат цікавых герояў і дзеянняў. А ці любіце вы казкі са страшылкамі? Ну, вядома, казкі са страшылкамі вельмі цікавыя, бо ў іх сустракаюцца і Баба Яга, і Дзед Гаявік, і гаспадар лесу – Лясун. Усе яны – мае даўнія сябры, і я магу дапамагчы вам з імі сустрэцца.

*(У зале прыкметна цямнее, гучыць палахлівая музыка.)*

К а з а ч н і ц а. Чуеце, дзеці, які страшны грохат? Чуеце, як нешта свішча, вухкае. Дык гэта ж сама лясная вядзьмарка Баба Яга да нас ляціць. Характар у яе сварлівы, але вы яе не бойцеся. Яна бывае вельмі добрай і любіць дзяцей.

*(З'яўляецца Баба Яга, апранутая ў лахмоцце, абутая толькі ў адзін лапаць. У руках у яе венік, упрыгожаны рознакаляровымі стужкамі. Яна – выходзіць у цэнтр залы і азіраецца.)*

Б а б а Я г а. Хто гэта пра мяне ўспомніў? І, як на ліха, я толькі вырашыла прылегчы адпачыць. Тры дні я па лесе маталася, як магла – забаўлялася. Дзецям-грыбнікам у кошыкі мухамораў ды паганак падкладвала, дзяўчынам-прыгажуням смачныя ягады на атручаныя воўчыя памяняла. Хай памучацца! А то даўно ўжо ніхто не губляўся ў маіх уладаннях, у хатку Бабусечкі Ягусечкі не заходзіў. Я б іх у лазеньцы памыла, вадзіцаю напаіла, у печку пасадзіла б, засмажыла ды з'ела б!

К а з а ч н і ц а. Ах!

Б а б а Я г а. У мяне і лапатка ёсць! Але так і быць. Не буду я вас есці. Вельмі вы мне спадабаліся. Адкажыце лепей мне на пытанні. Таго, хто першы адкажа, я пачастую цукеркай.

1. Як па-іншаму называецца белы грыб? *(Баравік.)*
2. Які самы атрутны грыб? *(Бледная паганка.)*
3. Назавіце гаспадара лесу. *(Лясун.)*
4. Якія лясныя расліны могуць замяніць мяса? *(Грыбы.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Якая расліна цвіце без кветкі, якую шукаюць столькі, колькі існуюць людзі? *(Папараць.)*

6. Якая расліна ў лесе самая мяккая? *(Мох.)*

К а з а ч н і ц а. Малайцы, дзеці. Усё вы ведаеце. А зараз мне патрэбна адзець мой другі лапаць. Я так спяшалася да вас, што пакінула яго дома.

*(Чытае загавор.)*

Гэй лапаць-лапаток,
Пераляці праз пянёк,
Вакол леса пакруціся
І да гаспадыні вярніся!

*Прама ў рукі да Бабы Ягі пáдае другі лапаць, яна яго апранае.*

Б а б а Я г а. Знайшоў мяне мой лапаточак. А зараз, хто атрымаў ад мяне цукеркі, выходзьце хуценька на пляцоўку. Мы з вамі гуляць будзем.

*(Праводзіцца гульня “Лапаткі”.)*

Б а б а Я г а. Знаеце, дзеці, вы так добра ўсе гулялі, што мне захацелася вас яшчэ больш пачаставаць рознымі маімі стравамі. Зараз я начарую пачастункі – бамбара, чуфара, лорыкі, скорыкі, морыкі.

*(Да ног Бабы Ягі пáдае валёнак.)*

Б а б а Я г а. Ой, што гэта я начаравала? Глядзіце – валёнак. А як жа я буду яго дзяліць на ўсіх? Мусіць, я не тое слова сказала. Паспрабую яшчэ.

*(Паўтарае загавор, гучыць гучная музыка у пакой уваходзіць Дзед Гаявік.)*

Д з е д Г а я в і к. Прывітанне, Яга. Прывітанне, дзеці.

Б а б а Я г а. Няпрошаны госць, а яшчэ ветлівасцю выхваляецца!

Д з е д Г а я в і к. А ці не ты, старая, мяне сюды выклікала? Жыцця ад цябе няма! Кажы, навошта я табе гэтым разам спатрэбіўся?

Б а б а Я г а. Ды не клікала я цябе! Я хацела дзецям пачастункі начараваць, а замест іх ты з’явіўся. Чаруй цяпер сам! *(Бурклівa.)*

Д з е д Г а я в і к. Ну, не варчы ты, Яга! *(Лісліва.)* Для Бабулечкі Ягі я сам напёк бы пірагоў!

Б а б а Я г а. Ну, калі пірагоў, так і быць – заставайся з намі, павесяліся, а то замарыўся ты зусім у сваім гушчары!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д з е д  Г а я в і к. Тады я вам магу патанчыць!

Б а б а  Я г а. Не трэба, Гаявік, а то яшчэ рассыплешся! Ты мне лепш дапамажы для дзяцей пачастунак начараваць.

Д з е д  Г а я в і к. А ну, мяшок з пачастункамі, хутка з'явіся сюды!

*(Нешта шэпча ў далонь. Уносіцца мяшок з пачастункамі.)*

Б а б а  Я г а. Гаявічок, які ты малайчына! Няўжо атрымалася?

Д з е д  Г а я в і к (*з гонарам*). Я дарма не чарую!

*(Баба-Яга і Гаявік раздаюць пачастункі.)*

Д з е д  Г а я в і к. Пачакай, Ягуся, і я жадаю з дзецьмі пагуляць! Хто адгадае, той яшчэ адзін пачастунак атрымае.

(*Гаявік загадвае загадкі. Калі дзеці не могуць адказаць, Баба Яга падказвае ці дае пачастунак.)*

Паскакала па ўсёй хаце
І ў кут схавалася. *(Мятла.)*

Не крокам ходзіць, не бегае,
Толькі скача. (*Жаба.)*

Не звер, не птушка,
Нос, як спіца,
Ляціць – пішчыць,
Сядзе – маўчыць.
Хто яго заб'е,
Сваю кроў пралье. *(Камар.)*

У хаце ў кутку
Вісіць сіта, не рукамі звіта. *(Павуцінне.)*

Круглае, румянае
З дрэва я дастану.
На талерку пакладу,
Еш, бабулечка, скажу. *(Яблык.)*

Б а б а  Я г а (*трымае ў руках талерку, на якой ляжыць яблык)*. Гэта мая любімая загадка пра яблычак! Вы думаеце, гэты яблык просты? А вось і не. Ён чароўны! Калі коціцца яблык па сподачку, то можна ўвесь свет убачыць!

Д з е д  Г а я в і к. А давай, Ягуша, паглядзім у твой чарадзейны сподачак ды пазнаем, што ў нашым лесе робіцца?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Б а б а  Я г а. Давай, Гаюша, паглядзім.

*(Катаюць яблык па талерцы і глядзяць.)*

Д з е д  Г а я в і к. Глядзі, што гэта такое кудлатае з дрэва звісае? Падобнае на нечую вялікую бараду. Ды гэта ж Лясун на дрэве сядзіць, у ладкі пляскае і песні спявае!

*(Раздаюцца гукі, гэта "спевы" Лесуна.)*

Б а б а  Я г а. Ды няўжо гэта спевы? Суцэльнае гудзенне, быццам лес пры штармавым папярэджанні шуміць.

Д з е д  Г а я в і к. Дык ён жа гаспадар лесу! Захоча – стане велізарным, як самае вялікае дрэва, захоча – абярнецца малюсенькім чалавекам, ніжэй травы. А пры сустрэчы з людзьмі ён можа ў звычайнага чалавекаператварыцца.

Б а б а  Я г а. Так, ён вялікая гарэза! Лепш за яго ніхто не ўмее сцяжынкі блытаць. Чалавеку здаецца, што далёка ён па лесе ішоў, а аказваецца – усё на адным месцы і ходзіць па коле.

Д з е д  Г а я в і к *(успамінае)*. Адзін раз вырашыў я, Ягуша, да цябе ў госці пайсці. Іду, іду... Гляджу.... Што такое? Ізноў на ранейшым месцы апынуўся! Раптам чую – побач хіхікае хтосьці! Азірнуўся – вакол няма нікога. Але нездарма ж я ў лесе жыву – хутка зразумеў, хто гэты блытанік! Ніякай павагі да маёй сівізны!

*У зале падчас аповеду Гаявіка неўзаметку з'яўляецца Лясун (у зялёнай адзежы, з доўгай барадой і кіем у руках), становіцца за спінамі Бабы Ягі і Гаявіка, слухае іх гутарку і нягучна пляскае ў ладкі. Героі заўважаюць Лесуна.*

Д з е д  Г а я в і к. Ты зноў, Лясун, са сваімі жартачкамі?

Л я с у н. А здагадаўся , што вы за мной назіраеце і вырашыў у госці зайсці. *(Глядзіць на дзяцей.)* Ой, як жа вас многа! У якім жа вы лесе жывяце?

Б а б а  Я г а. Лешык, дык гэта ж дзеці! Яны жывуць у вялікіх каменных дамах. Ты, Лясун, зусім дрымучы стаў. Жыццём людскім не цікавішся.

Л я с у н *(пакрыўджана)*. І не дрымучы я зусім. Я таксама магу дзяцей павесяліць, ды яшчэ лепей, чым вы. Давайце, дзеці, з вамі пагуляем. Спачатку адгадайце загадку:

Вісіць на дубочку
Залаты клубочак. *(Жолуд.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А цяпер мы з вамі пагуляем.

*(Дзеці становяцца вакол Лесуна. Ён кожнаму раздае па жолуду з вядзерца, а потым распавядае вершаваныя правілы гульні.)*

Жолуд на падлогу пакладзі,
Як танчыш, пакажы.
А потым ужо не пазяхай,
Хутка жолуд падбірай!

*(Гучыць музыка, дзеці кладуць жалуды на падлогу, пачынаюць танчыць і ходзяць па коле. Калі музыка нечакана змаўкае, яны павінны хутка падняць пакладзены побач жолуд. Хто не паспеў, той выбывае з гульні. Па завяршэнні гульні дзеці складаюць жалуды ў вядро, а Лясун раздае пераможцам пачастункі.)*

Л я с у н. Ведаю я яшчэ адну цікавую гульню. Хто цукерку жадае, хай жудасна зарагоча і гучна закрычыць!

*(Дзеці гучна крычаць і рагочуць. Лясун частуе іх цукеркамі.)*

Л я с у н. Малайцы, дзетачкі! Як гучна і страшна вы рагочаце! Нават я, майстар гэтай справы, вам пазайздросціў. Прыходзьце да мяне ў лес, будзем усе разам вандроўнікоў палохаць! Вось смеху будзе!

К а з а ч н і ц а. Малайцы вы, нечысць лясная, павесялілі нашых дзетак, пацешылі. Але ж нашым гасцям пара ўжо адпраўляцца дамоў.

Л я с у н. Да пабачэння, дзеці. Запрашаем вас да сябе ў госці, у наш чароўны лес.

К а з а ч н і ц а. Мне таксама, дзеці, пара з вамі развітвацца. Але я абавязкова зазірну да вас яшчэ і пазнаёмлю вас з іншымі сваімі сябрамі з казак. Да пабачэння!

***Аўтар сцэнарыя С.І.Кузьміч***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## У ЛЕС ПА ЯГАДЫ
## *(сцэнарый пазнавальна-забаўляльнай праграмы)*

*Пляцоўка задэкарыравана пад лясную паляну. Дзяўчынка збірае ягады і спявае песню.*

А л е с я. Першую ягадку бяру,
На другую гляджу,
Трэцюю прымячаю,
А чацвёртую з'ядаю.

*(З'яўляецца хлопчык Алесь, з'ядае ягадку.)*

А л е с ь. Як смачна!

А л е с я. Як табе не сорамна, ты з'еў маю ягадку.

А л е с ь. А чаму гэта яна твая? У лесе вунь колькі ягад. Яны не твае.

А л е с я. Так, але я яе першая заўважыла.

А л е с ь. Не, я таксама.

А л е с я. Не, я!

А л е с ь. Не, я!(*Спрачаюцца паміж сабой.)* Ну, добра, Алеся, я вінаваты. Не будзем болей спрачацца. Я цябе шукаў, каб сказаць прыемную навіну.

А л е с я. Якую?

А л е с ь. А ты здагадайся!

А л е с я. Не ведаю.

А л е с ь. Я пачуў, што сёння ў лесе адбудзецца баль. А запрашае сама Ягадная Каралева.

А л е с я. Як добра!

А л е с ь. Так, Ягадная Каралева будзе дарыць падарункі ўсім гасцям. Проста так. Я так люблю падарункі!

А л е с я. Я таксама люблю іх атрымліваць! *(З захапленнем.)* Ой, глядзі, Алесь, мы не адны на палянцы. Колькі тут дзетак!

А л е с ь. Прывітанне, хлопчыкі!

А л е с я. А чаму толькі хлопчыкі, а дзяўчынкі?! Прывітанне, дзяўчынкі!

А л е с ь. А хлопчыкі дружней адказваюць.

А л е с я. Не, дзяўчынкі!

А л е с ь. Не, хлопчыкі!

А л е с я. Не. Дзяўчынкі!

(*Спрачаюцца.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А л е с ь. Ну, добра, і хлопчыкі, і дзяўчынкі дружныя. Прывітанне дзеці!

*(Дзеці ўсе разам адказваюць.)*

А л е с я. Алесь, а давай на ягадны баль да Каралевы возьмем дзяцей. *(Звяртаецца да дзяцей.)* Вы любіце падарункі?

*(Дзеці адказваюць.)*

А л е с ь. Але вам патрэбна выканаць незвычайныя ўмовы.

А л е с я *(крыўдзіцца).* Якія яшчэ ўмовы? Ты ніколі адразу ўсё не кажаш, што за інтрыга?

А л е с ь. Не крыўдуй, я запамятаў. А ўмовы вось якія, каб госці былі болей з’яднаныя, любілі прыроду і бераглі лес, ведалі ўсіх ягадных служак каралевы.

А л е с я. Складаныя ўмовы. Але я добра ведаю, што мы ўжо парадніліся з дзецьмі і таму адной ўмовай стала меней.

А л е с ь. Алеся, а мы так і не пазнаёміліся. *(Да дзяцей.)* Мяне завуць Алесь. А гэта мая сястра Алеся. *(Паказвае на сястру.)*

А л е с я. Алесь, а як мы будзем знаёміцца з дзецьмі, бо іх так шмат, у нас часу не хопіць і на баль можам спазніцца.

А л е с ь. І сапраўды. *(Думае.)* Дзеці, вы па камандзе назавіце ўсе разам сваё імя, толькі гучна і выразна, каб мы з Алесяй пачулі кожнага.

*(Дзеці адказваюць, называюць свае імёны.)*

А л е с ь. Добра, вось і пазнаёміліся. А зараз можна ісці на баль да Ягаднай Каралевы.

А л е с я. Заўсёды ты спяшаешся і не памятаеш галоўнага, што мы павінны добра ведаць лес, у які пойдзем. Гэта яшчэ адна ўмова балю. Тым больш пра ягады, бо ідзем у госці да самой Ягаднай Каралевы.

А л е с ь. Дзеці, вы ведаеце назвы ягад, якія растуць у нашым краі?

*(Дзеці адказваюць.)*

Вось зараз і паглядзім. Я вам буду паказваць карткі з выявамі ягад, а вы іх павінны называць. Дамовіліся?

*(Дзеці адказваюць. Алесь паказвае карткі, на якіх змяшчаюцца малюнкі ягад: суніц, чарніц, брусніц, малін, дурніц, агрэста, трускавак, парэчак, чорнай смародзіны, журавін. Хто адказаў, таму на спіне замацоўваюць разгаданую картку.)*

А л е с я. Добра, а цяпер трэба размеркавацца на дзве каманды: адну – “Садовыя ягады”, другую – “Лясныя ягады”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каманда, якая зробіць гэта хутчэй, атрымае па ягадцы. А потым, на балі, у залежнасці ад колькасці ягадак атрымае падарунак.

*(Гучыць музыка, на фоне якой дзеці збіраюцца ў дзве каманды.)*

А л е с я. Алесь, а ці ведаеш ты, калі трэба збіраць ягады?

А л е с ь *(усміхаецца)*. Ну, вядома, хто гэтага не ведае?

*(Звяртаецца да дзяцей.)*

А вы, дзеці, ведаеце, у якую пару года трэба збіраць ягады?

*(Дзеці адказваюць.)*

А л е с я. Так, летам і восенню, а дакладней…(*Алесь разгубіўся.)* Бачу, што не ўсе ведаюць, тады слухайце ўважліва, бо гэтыя веды вам вельмі спатрэбяцца.

Збор ягад у Беларусі пачынаецца з суніц, а заканчваецца журавінамі і рабінай; з канца чэрвеня да першага снега вы можаце паспытаць смак свежых ягад. Першыя ягады – суніцы – з'яўляюцца ў канцы чэрвеня. У ліпені – чарніцы, маліна, парэчкі, трускаўкі. У жніўні з'яўляюцца брусніцы і дурніцы, а ў верасні – журавіны і рабіна. У гэтыя месяцы пакланяліся раслінам: нахіліся да зямлі і пад ягадным кусцікам знойдзеш жменьку сакавітых лясных ягад.

А л е с ь. А я ведаю, што збіраць ягады патрэбна ў сухое надвор'е, а лепей раніцою або ўвечары. Бо вільготныя ад расы ягады дрэнна захоўваюцца, а ўсе ягады, якія збіралі ў спёку, вянуць. Гэта мне расказала бабуля. А яшчэ яна казала, што, калі збіраеш ягады, нельга ламаць галінкі, шкодзіць карані, лісце ягадных раслін, бо на наступны год на гэтым месцы больш не будзе ягад.

А л е с я. Добра, Алесь! Дзеці, а ці ведаеце вы, што ягады не толькі смачныя, але і маюць лекавую моц. У іх многа вітамінаў і таму, хто будзе іх ужываць у ежу, той будзе меней звяртацца да дактароў. Хлопчыкам і дзяўчынкам, у якіх дрэнны зрок, трэба болей есці чарніц, у каго кашаль – смакуйце брусніцы. Ад тэмпературы дапамогуць каліна, маліна, суніцы. Ажына дапаможа страўніку. Дзяўчынам, якія жадаюць мець доўгую, прыгожую касу, трэба есці вадзяніку, бо яна спрыяе росту валос, а сабраць яе можна на балоце разам з журавінамі.

А л е с ь. Алеся, а ты не сказала дзецям, што ў лесе ёсць ягады, якія нельга есці, іх называюць атрутнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А л е с я. Так, не сказала. Сябры, а вы ведаеце атрутныя ягады?

*(Дзеці адказваюць.)*

Бачу, што не ўсе ведаюць.

А л е с ь. Алеся, а мы з табою ім у гэтым дапаможам. Я буду паказваць карткі, на якіх намаляваны ягады, калі хто з дзяцей ведае, няхай адказвае, а калі не, тады мы раскажам. (*На картках намаляваны ягады: вех атрутны, воўчае лыка, вароніна вока, магонія, лунасемяннік. Хто адгадаў – таму даюць ягадку і кошык.)*

А л е с я. Дзякуй за адказы. Але трэба веды зараз замацаваць на практыцы. Вось тут, на палянцы, ягады. Вы павінны сабраць толькі добрыя і карысныя, атрутныя браць нельга. Хто хутчэй!

*(Ягады намаляваны на картках і вісяць на дэкаратыўных кустах. Гучыць музыка, дзеці збіраюць ягадкі.)*

Добра, малайцы! Пераможцу мы ўзнагароджваем прызавой ягадкай!

А л е с ь. Хлопчыкі і дзяўчынкі, а ці ведаеце вы песні пра ягады?

*(Дзеці адказваюць.)*

А л е с ь. А гэта мы паглядзім, зараз будзе гучаць песня, а вы павінны яе праспяваць.

*Гучаць песні:*

*– "Ягада-маліна" (сл. М.Пляцкоўскага, муз. В.Дабрыніна).*

*– "Калинка-малинка" (руская народная песня).*

*– "Снежинка" (вык. Алсу).*

*– "Ой, цветёт калина" (руская народная песня).*

*– "Горькая ягода"(вык. В.Лявонцьеў).*

*– "Хадзіла Машанька па барочку" (беларуская народная песня).*

*– "Рябина кудрявая" ( руская народная песня).*

*Удзельнікі, якія называюць песні і гучна іх спяваюць, атрымліваюць ягадку.*

А л е с я. Сябры, вы памятаеце, у каго болей назбіраецца картак-ягад, той атрымае на балі святочныя падарункі.

*(Алесь звяртаецца да Алесі, якая лічыць нешта на пальцах.)*

А л е с ь. Алеся, а што ты робіш?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А л е с я. Ну, вось, збілася з ліку. Я лічу, колькі можна прыгатаваць страў з ягад.

А л е с ь. Не турбуйся, Алеся, дзеці нам у гэтым дапамогуць.

Скажыце, калі ласка, у якіх стравах ужываюцца ягады?

*(Дзеці адказваюць: варэнне, кампот, мармелад, віно, сіроп, напіткі, піражкі, варэнікі, пірагі,чай з ягад.)*

А л е с я. Малайцы! Добра ведаеце, што гатуюць вашы мамы, напэўна, і памочнікі вы добрыя, вось вам за гэта па ягадцы!

А л е с ь. Алеся, а ці ведаеш ты ягадку, ад якой увесь рот чорны, калі яе з'ясі?

А л е с я. Ну, вядома, ведаю. *(Да дзяцей.)* А вы ведаеце?

*(Дзеці адказваюць.)*

Так, гэта чарніцы.

А л е с ь. А чаму яны чорныя, ты ведаеш, а дзеці? Бачу, што не ведаеце.

А л е с я. А ты скажы, чаму, мо ты і сам не ведаеш.

А л е с ь. Ведаю.

А л е с я. Не ведаеш, хлусіш. Калі б ведаў, дык сказаў бы.

*(Спрачаюцца.)*

А л е с ь. А зараз і скажу. Гэту гісторыю мне бабуля расказала, а яна яе чула ад сваёй бабулі.

Жыў-быў лясны ўладар. І было ў яго вялікае царства. Лясныя жыхары любілі і паважалі свайго цара. І ўсё добра было б у яго царстве, пакуль не пачалі знікаць ягады. Засумаваў вялікі ўладар. Тры дні ён не еў і не піў. Думаў, як злавіць злодзея. На трэці дзень прыдумаў, але нікому аб гэтым не сказаў. Людзі казалі, што цара ў той дзень бачылі ў ягадным садзе ноччу, але што ён там рабіў – нікому невядома. Толькі раніцай знайшлі злодзея. У яго былі чорныя рукі і рот. А ягада, якую пафарбаваў цар у чорны колер, з таго часу завецца чарніцаю.

А л е с я. Вельмі цікавая гісторыя. А зараз мы паглядзім, ці ёсць сярод вас смелыя хлопчыкі і дзяўчынкі?

А л е с ь. Калі ласка, падыдзіце да мяне тыя, хто лічыць, што амаль нікога не баіцца.

Вось вас колькі! А зараз я прапаную вам лясное падарожжа і сустрэчу зляснымі звярамі.

А л е с я. Ой, як жудасна. Я хвалююся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А л е с ь. Не бойся, Алеся, і вы, дзецi, бо ў нашым лесе толькi добрыя звяры. Яны вельмі любяць ягады. А вы ведаеце, якія гэта звяры?

*(Дзецi называюць мядзведзя, лася, ваўка, лісіцу, аленя, вожыка.)*

Хто атрымаў картку – прымае ўдзел у гульні “Мядзведжыя ягады”. А хто назваў мядзведзя, той і сам ім будзе.

А л е с я. У бярлозе спіць мядзведзь і ахоўвае свае ягады. А вы *(звяртаецца да дзяцей)* павінны, пакуль гучыць музыка, бегаць вакол бярлогі, а калі музыка скончыцца – збіраць мядзведжыя ягады. У каго болей – той і пераможца. Вам зразумела?

(*Дзецi адказваюць. Гучыць музыка, ідзе гульня, вызначаецца пераможца.)*

А л е с ь *(спалохана).* Алеся, глядзі, сонейка схавалася за лесам. Гэта значыць, што мы разам з дзецьмі загуляліся і спазніліся на баль.

А л е с я. Супакойся, Алесік. Гэта нічога. Ягадны баль адбыўся! Тут! Зараз! У нас! Вы чуеце фанфары? Гэта да нас прыбывае сама Ягадная Каралева! Сустракайце, дзеці, гаспадыню лясных палян!

*(На фоне ўрачыстай музыкі з’яўляецца Ягадная Каралева.)*

Я г а д н а я К а р а л е в а. Прывітанне, хлопчыкі і дзяўчынкі! *(Дзецi адказваюць.)*

Чула я ад сваіх ягадных служкаў, што на гэтай палянцы сабраліся самыя дружныя, кемлівыя, добрыя дзецi, якія любяць лес і ведаюць усё пра яго жыхароў. Гэта так?

А л е с ь. Так.

А л е с я. Мы хацелі, каб ты была задаволена намі.

А л е с ь. А час вельмі хутка прайшоў.

Я г а д н а я К а р а л е в а. Так, ведаю і таму я тут, каб зрабіць вам прыемнае.

А л е с ь *(з захапленнем).* Зрабіць падарункі?

Я г а д н а я К а р а л е в а. Так, Алесік! І запрасіць да сябе ў лясное кафэ, дзе пачастую ягадным мусам.

А л е с ь. Як добра! Проста так!

А л е с я. Не проста так, Алесь. Дзецi гэтыя падарункі заслужылі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я г а д н а я К а р а л е в а. Так, Алеся. Вось гэтымі падарункамі ўзнагароджваюцца дзеці, якія атрымалі ад цябе ягадкі-жэтончыкі.

*(Гучыць музыка, Ягадная Каралева раздае падарункі.)*

Я г а д н а я К а р а л е в а. Які сёлета шчаслівы
І ўрачысты выдаўся год,
Ва ўсіх садах агрэст і слівы,
Клубнікі повен агарод.
Пустыр закінуты калісьці
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.
А за аколіцай пад рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набраклі дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.
А што за ягады лясныя
У нас адразу зацвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разнеслі па зямлі.
Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясах,
За імі следам і гарніцы
Закрасавалі ў верасах.
Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завяззю брусніц.
Усе балотныя палянкі
Цвітуць агнямі журавін.
І неўзабаве ўспыхнуць гронкі
Чырвоных, яркіх арабін.
Які сёлета шчаслівы
І незвычайны выйшаў год.
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод.

*Гучыць музыка. Дзеці, узяўшыся за рукі, ідуць да Ягаднай Каралевы.*

***Аўтар сцэнарыя В.М.Барысевіч***



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# У ГАСЦЯХ У ЛЕСУНА
## *(сцэнарый гульнёва-пазнавальнай праграмы)*

*Заднік сцэны ўпрыгожаны вялікім сонейкам, вакол якога прымацаваны дэкаратыўныя лясныя птушкі. На пляцоўцы елка, пад якой спіць Лясун. Каля елкі схаваны лазовы кош з ляснымі арэхамі, ляжаць шышкі. Чуваць спеў птушак, куе зязюля. Пачынае гучаць ціхая прыгожая мелодыя. Лясун прачынаецца, працірае вочы, пазяхае, устае на ногі і размінае косці.*

Л я с у н. Ужо сонейка паднялося, а я яшчэ ўсё драмлю. Дзякуй, што зязюля разбудзіла, а то б спаў да абеду. *(Заўважае гледачоў, здзіўлена звяртаецца да іх.)*. Ой, бачу, да мяне госці на паляну завіталі, а я разамлеў на імху. Дзень добры, сябры! У мяне сёння шмат працы: патрэбна пералічыць усіх жывёл у лесе, усіх птушак, зазваніць у званочкі, каб пчолы ды шмялі не праляталі міма маіх кветачак. А кабетам да сунічных палян шлях паказаць. Бо я ж нездарма жыву ў лесе і завуся Лесуном.

Л я с у н. На зямлі існуе шмат відаў раслiннасці: сустракаюцца стаметровыя дрэвы і малюсенькія травы, расліны з каранямі, якія пранікаюць на 20-метровую глыбіню і зусім без кветак і каранёў, а ў іншых кветкі да метра ў папярэчніку. Усяго 500 тысяч розных раслін растуць на зямлі. А жывёл яшчэ больш – каля паўтара мільёна, нават у Антарктыдзе, дзе вечная мерзлата. Але я баюся холаду і таму жыву ў сваім лясочку, дзе летам растуць суніцы і журавіны, а ўзімку можна паласавацца сушанымі грыбамі і арэхамі.

Л я с у н. Дарэчы, самы час падсілкавацца. У мяне тут ёсць крыху запасу. Вось частуйцеся, калі ласка, госці любыя, мае арэхі салодкія і такія смачныя!

*(Лясун ідзе да елкі, дастае кошык, потым ідзе да гледачоў і частуе іх арэхамі, затым зноў вяртаецца на сцэну.)*

Л я с у н. З нядаўняга часу я перайшоў жыць у запаведнік. Дужа надакучылі мне паляўнічыя і браканьеры. А тут ціхенька, спакойна... Ой, здаецца нехта ідзе? Хто ж так рана?

*(Хаваецца за елку, на сцэну выходзіць чалавек са стрэльбай. Аглядаецца, ускідвае стрэльбу. Лясун выходзіць з-за елкі.)*

Л я с у н. Стой, рукі ўгору!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Чалавек падымае рукі, стрэльба падае. Лясун яе хуценька падымае.)*

Л я с у н. Ты хто?

Ч а л а в е к. Мікола.

Л я с у н. Ты што гэта ў маім лесе паляваў? Вось зараз свісну, крыкну, прыбягуць сюды кабан і мядзведзь, разарвуць цябе на кавалачкі. А не тое, дык мясцовую ўладу навяду. Што маўчыш?

М і к о л а. Не трэба ўладу, я зусім не паляўнічы. І гэта не стрэльба, а фотаапарат.

Л я с у н. Што ты мне галаву дурыш, ці я ж сляпы? *(Разглядвае стрэльбу.)* Сапраўды, нейкая незразумелая стрэльба. А ну пакажы, як ёю карыстацца! *(Бярэ стрэльбу.)* Так, зараз я зраблю фотаздымак... вунь той вавёркі. Зараз толькі прыцэлюся.

*(Закрывае адно вока, цэліцца. Раптам на сцэну выскоквае Іванка.)*

І в а н к а. Рукі ўгору! Кідай стрэльбу! *(Лясун кідае стрэльбу.)* Ой, дык ці не ты гэта, дзядзька Лясун?

Л я с у н. Цьфу ты, напужаў! Я гэта, ці не бачыш?

І в а н к а. З якога часу ты пачаў у запаведніку паляваць?

Л я с у н. Ды я ж не палюю, я раблю фотаздымкі. Паглядзі вось, гэта ж фотаапарат.

І в а н к а. Ды ну! А каго ты здымаў?

Л я с у н. Хацеў вавёрку, дык ты сваім крыкам напужаў, зараз яе да вечара не дачакаешся.

І в а н к а. Дык ты мяне сфатаграфуй.

Л я с у н. Не, я лепей каго-небудзь з гледачоў. Вунь бачу сімпатычную дзяўчынку. Зараз толькі аб'ектыў навяду. Раз! Гатова! І яшчэ адну сфатаграфую. Раз! Во, колькі фотаздымкаў.

І в а н к а. А калі яны гатовы будуць?

Л я с у н. Хм, А-а...*(Чэша патыліцу.)*

М і к о л а. Дык яны ж ужо гатовы. Вось глядзіце! *(Дастае аднекуль з рукава карткі.)*

Л я с у н. Ну і цуд! Ты што – чараўнік?

М і к о л а. Якое там.

Л я с у н. Давай карткі. Хто тут у нас? Так, вось гэта тая прыгожая дзяўчынка, якую я фатаграфаваў. Калі ласка, падыдзіце да мяне вось вы, вы і вы. Атрымайце свае карткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(З залы падымаюцца на сцэну шэсць чалавек, на якіх паказаў Лясун.)*

Вось вашы карткі.

*(Падае каляровыя фотаздымкі.)*

Бачыце, якія прыгожыя фотаздымкі. На адваротным баку картак напісаны загадкі пра грыбы. Давайце загадаем гэтыя загадкі гледачам. Ляснік Іванка будзе частаваць арэхамі тых, хто правільна адгадае. Дык вось, пачынаем чытаць па чарзе.

1. Нібы родныя сястрычкі ў радок стаяць... *(лісічкі)*.
2. Рукі ўзялі ўбакі маладыя... *(маслякі)*.
3. Галавой сваёй прынік да сасонкі... (*баравік)*.
4. З-пад зямлі вылазіць лоўка, да сонца цягнецца... *(вужоўка)*.
5. Павытырквалі каленкі ганарыстыя... (*апенькі)*.
6. Шапачка чырвоная, а на ёй узор, што гэта такое? *(мухамор)*.
7. Распусцілі каля сцежкі парасоны... (*сыраежкі)*.
8. Знізу ўверх глядзіць на куст усміхаючыся... *(груздзь)*.
9. Так і просяцца ў лапкі да вавёркі два... (*абабкі)*.
10. На вячэру да Алёнкі з лесу брат прынёс... *(зялёнкі)*.
11. Прытаіўся, як шпіён, між травінак... (*шампіньён)*.

*(Тых, хто адгадаў, частуюць арэхамі і запрашаюць на сцэну.)*

Л я с у н. Бачу я, грыбы вы ведаеце. А ці любіце вы іх збіраць?

*(Удзельнікі адказваюць.)*

Л я с у н. А суп грыбны таксама любіце?

*(Удзельнікі адказваюць.)*

Л я с у н. А калі любіце, то вось вам па кошыку.

*(Мікола і Іванка падаюць па кошыку з дэкаратыўнымі грыбамі.)*

Л я с у н. Падзелімся на дзве каманды па тры чалавекі і пойдзем на паляну па грыбы ды пагуляем. А гульня заключаецца ў наступным: першы ўдзельнік бяжыць з кошыкам на паляну і “садзіць” там грыбы, затым перадае кошык наступнаму ўдзельніку, які тыя грыбы збірае, трэці высыпае на падлогу і адбірае прыдатныя да яды ад вужовак. Чацвёрты ўдзельнік нанізвае іх на тонкі дрот, пяты вешае “сушыць” на бярозу. Шосты здымае і высыпае ў чыгун, што стаіць ля кожнай каманды на крэсле. Вось і гатова смачная страва! А пераможцаў чакае падарунак. Калі ласка, пачнем!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(Гучыць музыка, пачынаецца гульня.)*

Л я с у н. Вось каманда пераможцаў, яна атрымлівае па пачцы грыбнога супу.

М і к о л а. Ай, дзядзька Лясун, што твой суп! Ты б лепей удзельнікам па футры на каўнер даў, вось гэта я разумею падарунак.

Л я с у н. Што ты кажаш! Па-першае, не так лёгка злавіць лісу, бо ў яе не адна нара, а некалькі, а па-другое, у маім лесе забаронена паляванне.

М і к о л а. А мы не будзем яе забіваць. Я аддам яе ў школу, у жывы куток. Вучні будуць па ёй заалогію жывёльнага свету вывучаць.

Л я с у н. Добра, згодны, але ж я кажу, што яе не так проста злавіць.

М і к о л а. А мы зараз праверым. *(Звяртаецца да ўдзельнікаў.)* Сябры, я буду лоўчым, астатнія становяцца па двое і бяруцца за рукі, утвараючы кола, а трэція становяцца ў гэтае кола, своеасаблівую лісіцыну нару. Лісой будзе той, каму не хопіць нары. Я лаўлю ліса, а ён ўцякае і ўскоквае ў норку. Лісаня, што было ў гэтай норцы, выбягае і ўцякае ад лоўчага да другой нары. Калі лоўчы дакранаецца да ліса, то ён становіцца лоўчым і даганяе ліса. Дык вось, становімся па парах і ўтвараем норкі з лісамі. Музыка!

*(Пачынаецца гульня, гучаць беларускія найгрышы.)*

М і к о л а. І сапраўды, цяжка злавіць хітрую лісу ў яе норцы. Дзякуй, паважаныя сябры за ўдзел у гульні, вось вам гасцінцы. *(Частуе арэхамі, удзельнікі ідуць на свае месцы.)*

М і к о л а. Дзядзька Лясун, складваецца ўражанне, што ў тваім лесе не расце нічога, акрамя арэхаў. Нашыя гледачы ўжо, мабыць, усе зубы паламалі аб тваe гасцінцы.

Л я с у н. Ты перабольшваеш, Мікола, у маім лесе растуць:

І маліна, і ажына,
І чырвоная каліна,
Круглашчокія суніцы
У сацінавых спадніцах,
А брусніцы пад лісточкі
Пахавалі свае вочкі.
Журавіны на балоце
Грэюць кіслы сок у роце,
А грыбоў – касой касі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Еш і болей не прасі.
Ну, а шышак для вавёркі
Сто пудоў ці ўсе сто сорак.

І в а н к а. Ну, для вавёрак шышкі мо і добра, але навошта яны нашым гледачам?

Л я с у н. А з шышкамі можна прыдумаць цікавую гульню. Напрыклад: "Вавёрчына камора". Зараз я буду называць жывёл і птушак, якія жывуць у лесе, а калі я памылюся і назаву не тую птушку ці жывёлу, нашыя гледачы няхай пляскаюць у далоні, хто першы заўважыць памылку і плясне ў далоні – атрымае з вавёрчынай каморы шышку. У каго будзе болей шышак, той пераможа і атрымае падарунак. Я пачынаю, сябры, а вы сачыце ўважліва:

Хто ў лесе не жыве?
У лесе шмат жывёл:
Дзве вавёркі і казёл.
На галінцы адным вокам
Зверху ўніз глядзіць сарока,
Пад кустом шыпіць гадзюка
На свайго сланёнка-ўнука.
У мурашнік доўгі нос
Суне птушка альбатрос.
Паварочваецца ледзь
У бярлозе сам мядзведзь.
Маладыя зубраняты
Шчыплюць лісце каля хаты.
Дзяцел з пеўнем у кафэ
Апранулі галіфэ.
А на сонечнай палянцы
Пад гармонік скачуць зайцы.
Воўк у бубен выбівае,
Грак яму дапамагае.
І лісіцы, і індычкі
Трусяць новыя спаднічкі.
Сойка пад фартэпіяна
Цягне доўгае сапрана.
Толькі філін не балюе,
Качанят малых цікуе
Ды гарэзачкі казулі
К рэчцы мыць пайшлі каструлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ну, скажыце зараз мне,
Хто ў лесе не жыве?

І в а н к а. У каго болей шышак? Вось нашыя переможцы, самыя кемлівыя і разумныя. Ад дзядзькі Лясуна вам падарункі – кніжкі пра лес з малюнкамі.

*(Уручаюцца падарункі.)*

Л я с у н. Лес – гэта загадка. Ну, напрыклад, хто ведае, колькі трэба часу, каб вырасла папараць? А! Не ведаеце, а трэба аж 15–20 гадоў, а жыве папараць 30–40 гадоў. А вось сасновая шышка паспявае за два гады. Адкажы Мікола, а ці любіш ты бярозавы сок?

М і к о л а. Канешне, люблю. Асабліва, калі падкісне ў бочцы, туды кідаеш лусту падсмажанага хлеба. Смаката!

Л я с у н. Вядома ж, што смаката, а толькі вось бярозу трэба берагчы і шкадаваць, браць сок з яе можна толькі адзін раз у пяць гадоў.

М і к о л а. Як цікава, а я і не ведаў! Бачыш, аказваецца, для яе сок, як для чалавека кроў. Так?

Л я с у н. Так. Ну, вось цяпер: і ты, і гледачы будуць больш беражліва адносіцца да прыроды, да лесу і ведаць, што ў лесе шмат таямнічага. А колькі прымавак існуе пра яго. Давайце паспрабуем успомніць іх. Я буду называць першую частку прымаўкі, а вы другую – фінальную. Слухайце ўважліва.

1. Ваўка баяцца... *(у лес не хадзіць).*
2. Чым далей у лес ... *(тым болей дроў).*
3. Лес рубяць... *(шчэпкі ляцяць).*
4. Хто ў лес, хто ... *(па дровы).*
5. Хто б пазнаў дзятла, каб не яго... *(дзюба).*
6. Ваўка ногі... *(кормяць).*

Л я с у н. Якія малайцы, ведаеце. І за гэта я вас пачастую.

І в а н к а. Арэхамі!!!

Л я с у н. Не, духмяным смакавітым пірагом з грыбамі. Суседка вавёрачка вырашыла пачаставаць нас і гледачоў сваім гасцінцам – вялікім пірагом з апенькамі і лісічкамі.

*(Ідзе за кулісы і выносіць пірог.)*

М і к о л а. Ай дык вавёрка, ай дык малайчына! Чаго, дзядзька Лясун, маўчаў да гэтага часу? Мабыць, адзін хацеў з'есці пірог? А можна дзяліць пірог буду я?

Л я с у н. Нашых гасцей таксама трэба пачаставаць. Самыя смачныя, хрусткія кавалачкі пірага дастануцца таму, хто

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

назаве дрэвы, якія растуць у звычайным беларускім лесе? Пірог дужа смачны.

І в а н к а. Я ведаю – елка!

*(Частуюць пірагом.)*

Л я с у н. Ну вось, сябры, і прыйшоў час развітання!

(*Пачынае ціха гучаць мелодыя песні "Белавежская пушча". Лясун, Іванка, Мікола выходзяць на сярэдзіну пляцоўкі.)*

Л я с у н. Дзякуй, мае даражэнькія, што завіталі да мяне на маю паляну. І калі хто ўвосень неяк раптам заўважыць сярод жоўтых і чырвоных фарбаў лесу маладыя зялёныя лісточкі, не здзіўляйцеся, гэта "Іванавы парасткі", якія вырастаюць на дубах, каб надаць восеньскаму надвор'ю трошкі веснавога сонечнага настрою.

І в а н к а. Многа лесу – не рубіце,
Мала лесу – беражыце,
Няма лесу – пасадзіце,
Будуць кветкі і суніцы.

М і к о л а. Жадаем вам быць такімі ж прыгожымі, як першая пралесачка, сакавітымі, як журавінка, вясёлымі, як салавейка, спрытнымі, як ваверка, моцнымі, як мядзведзь, добрымі ды багатымі, як лес і зямліца наша родная.

Л я с у н. Беражыце, людзі, усё зямное, не паганьце мудрасці лязом, нам не будзе дадзена другое, калі гэта мы не зберажом. Да новых сустрэч! Усяго вам добрага!

*(Лясун, Мікола, Іванка развітваюцца, пад музыку "Белавежская пушча" заслона закрываецца.)*

***Аўтар сцэнарыя Т.К.Кухта***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МУРАШНІК – ДЗЯРЖАВА ЧЫСЦІНІ І ПАРАДКУ
### *(сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы)*

*Гучыць фанаграма шуму лесу, спяваюць птушкі. На сцэне ўсталяваны дэкаратыўны мурашнік. Выходзіць хлапчук, азіраецца па баках. Бачыць мурашнік, падыходзіць да яго, пачынае варушыць, тыкаць у мурашнік трасцінкай.*

Х л а п ч у к. Ну, і нічога цікавага няма, варушы – не варушы.

Э х а Д з е д а Г а ю н а. Не варушы, не варушы, не варушы...

*(Хлапчук азіраецца.)*

Х л а п ч у к. Бегаюць нібыта ад пажару. Навошта мне гаварылі: "Не чапай"?

Э х а Д з е д а Г а ю н а. Не чапай, не чапай, не чапай...

*(Хлапчук пужаецца.)*

Х л а п ч у к. Лепш мне, відаць, трэба ісці адсюль.

Э х а Д з е д а Г а ю н а. Ідзі адсюль, ідзі адсюль, ідзі адсюль...

*(Выходзіць Дзед Гаюн.)*

Д з е д Г а ю н. Я ж забараніў мурашнік варушыць.

*(Следам за дзедам бяжыць унучка Кацярынка.)*

К а ц я р ы н к а. Чаму злуешся, дзед Гаюн?

Д з е д Г а ю н *(садзіцца на зямлю)*. Зноў людзі… Да мурашніка хлапчук падыходзіў. Жадаў пакой мурашак парушыць.

К а ц я р ы н к а. Канешне, нельга падыходзіць. На мурашак можна глядзець бясконца, як на ваду, вогнішча ці аблокі. Усе бягуць кудысьці без перапынку.

Д з е д Г а ю н. Гэта ты толькі прыгажосць бачыш, а на самай справе мурашкі – гэта санітары нашага лесу. Яны старанна працуюць – наш лес мацуюць. Таму мы павінны адносіцца да іх з вялікай павагай. Аднак людзі толькі гэтага не разумеюць. На жаль...

К а ц я р ы н к а. Будуць разумець, будуць. Сядай, дзядулечка.

*(Гучыць музыка.)*

К а ц я р ы н к а. Мы пачынаем гульнёвую праграму: "Мурашнік – дзяржава чысціні і парадку". Але ж мне патрэбны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памочнік. Думаю, лепш, чым мурашка, з гэтый функцыяй ніхто не справіцца.

*(На сцэну выбягае мурашка.)*

К а ц я р ы н к а. Працоўная мурашка? Пляскае ў далоні тры разы. З'яўляецца мурашка.

М у р а ш к а. Я да вас накіравана, каб дапамагчы.

К а ц я р ы н к а. Добра. Як ты лічыш, што першае павінны зразумець людзі?

М у р а ш к а. Тое, як моцна мы сябруем.

К а ц я р ы н к а. Ну, для гэтага і нам трэба пасябраваць. Уявіце сабе, што мы – адзін вялікі мурашнік. Паважаныя ўдзельнікі, абдыміце, калі ласка, свайго суседа справа, а зараз свайго суседа злева. Зараз ушчыпніце бок свайго суседа справа, а зараз – суседа злева. Трэба пагладзіць па галаве суседа злева і справа. Яшчэ раз абдыміцеся, толькі з двума сваімі суседамі, паказытайце двух і ўшчыпніце таксама двух. Малайцы.

*(Праводзіцца гульня "Сяброўства".)*

К а ц я р ы н к а. А зараз я прапаную вам віктарыну. Вам трэба адказваць на мае пытанні словамі "веру" ці "не веру". А той, хто першы адкажа на пытанне правільна, атрымае ад мурашкі дзве саломіны. Пачынаем віктарыну.

1. Галоўная ў мурашніку – матка. Яна працягвае род, адкладвае яйкі. (*Веру.)*

Акрамя маткі, усе астатнія мурашкі мужчынскага полу. *(Не веру, яны бясполыя.)*

2. Пасля апаладатварэння матка адкідвае свае крылы. *(Веру.)*

3. Самцы пасля апладатварэння жывуць адзін тыдзень. *(Не веру, адразу паміраюць.)*

Тыя, хто правільна адказаў на пытанні, атрымліваюць па дзве саломіны.

К а ц я р ы н к а. А зараз звяртаюся да тых, хто атрымаў саломіны. Калі ласка, адну з іх аддайце таму, хто вам падабаецца больш за ўсіх у гэтай зале. Добра, зараз гэтыя саломіны вы будзеце перадаваць адзін аднаму, па радах, каму жадаеце. Як толькі музыка спыніцца, той, у каго апынецца саломіна – падніме яе, маю на ўвазе саломіну, уверх. Пачынаем.

*(Гучыць музыка, праз 30 секунд спыняецца.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К а ц я р ы н к а. Добра, таго, у каго засталіся саломіны з чырвонымі рысамі, я запрашаю на правы ад мяне бок. Вы – паўднёвы бок нашага вялікага мурашніка. Тыя, у каго саломіны з зялёнымі рысамі, праходзьце на другі бок. Вы – прадстаўнікі паўночнага боку.

К а ц я р ы н к а. На працягу нашай праграмы паміж вамі будуць праходзіць розныя спаборніцтвы, за перамогу ў якіх вы атрымаеце вось такую мурашку *(дэманструе)*. У кожнай камандзе павінны быць:

Матка – галоўная ў сям'і, яна прыносіць прыплод.

Будаўнічы – адказны за працэс будавання.

Нянька – сочыць за прыплодам маткі.

Дабывальнік ежы – адказны за працэс харчавання.

К а ц я р ы н к а. Аб сваёй ролі ў мурашніку вы даведаецеся, калі дастанеце з саломіны скрутак. Кожны ўдзельнік дастае скрутак, вызначае сваю ролю ў камандзе. У кожнай мурашкі павінны быць знакі адрознення. Мурашка, калі ласка, паднясі знакі адрознення.

*(Мурашка падносіць скрутак адзення.)*

К а ц я р ы н к а. Зараз працэсам размеркавання адзення будзе кіраваць матка. За 30 секунд вы павінны адзначыць, які знак каму належыць. Падказка: кепкі ва ўсіх, акрамя маткі, аднолькавыя, але нагрудныя знакі – розныя, а ў маткі – фартух. Паспрабуйце адгадаць. Хто хутчэй зробіць, таму дастанецца мурашка перамогі. Пачынаем. (*Гучыць музыка.)*

*(Праходзіць спаборніцтва "Размеркаванне абавязкаў".)*

*Назіральнікі размяркоўваюць абавязкі. У час гульні Кацярынка запрашае гледачоў падтрымаць команды. Пасля конкурсу падводзяцца вынікі. Каманда, якая перамагла, атрымлівае мурашку.*

К а ц я р ы н к а. Цяжка? Вось так і ў мурашак. Гэта першы закон мурашак – калектыў. Добра, мы ўжо ведаем ролю маткі, будаўнічага, дабывальніка ежы і нянькі. Хутчэй з гэтым справілася каманда "_______". Яна і атрымлівае мурашку перамогі. Абавязкі размеркаваны. Малайцы. А зараз запрашаю паказацца нянек, якія павінны сачыць за прыплодам. Мурашка, вынесі, калі ласка, прыплод.

*(Мурашка выносіць разнос з прыплодам і аддае яго Дзеду Гаюну.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К а ц я р ы н к а. Лічынкі маленькія *(дэманструе),* але і сродкі захопу лічынак таксама ў вас будуць невялікія, нібы танюсенькія лапкі, нашыя памочніцы – саломіны. Вам трэба з дапамогай дзвюх саломін схапіць яйка і прынесці яго матцы. Хто хутчэй гэта зробіць, той і пераможа. Пачынаем.

*Гучыць музыка. Каманды выконваюць умовы конкурсу. Пасля конкурсу падводзяцца вынікі. Каманда, якая перамагла, атрымлівае мурашку.*

*(Праходзіць спаборніцтва "Перанесці лічынкі".)*

К а ц я р ы н к а. Малайцы. Маткі ёсць, нянькі ёсць, але ж час ужо есці. Што ядуць мурашкі? *(Гледачы адказваюць.)* Добра, а яшчэ яны частуюцца сокам тлі, якая знішчае дрэвы, чым і дапамагаюць нашай экалогіі. Аднак да тлі трэба дабрацца, а значыць – зрабіць шлях з хвойных саломін. Але ж і саломіны здабыць не так проста. Трэба сабраць іх у лесе. Нашыя гледачы будуць лесам. Мурашка выносіць 20 саломін, аддае іх на два бакі (10 – аднаму боку гледачоў, 10 – другому).

К а ц я р ы н к а. Аднак лес трэба паважаць і шанаваць, каб ён padараваў нам свае скарбы. А каб атрымаць саломіну ад гледача, вы павінны будзеце выказаць яму пашану нейкім кампліментам у яго адрас. Толькі тады глядач мае права аддаць вам сваю саломіну. Замацоўваючы саломіны адна за адной, стварыце ланцуг з саломін. Пачынаем будаваць ланцуг.

*(Гучыць музыка. Каманды выконваюць умовы конкурсу. Пасля конкурсу падводзяцца вынікі. Команда, якая перамагла, атрымлівае мурашку.)*

*(Праходзіць спаборніцтва "Шлях да тлі".)*

К а ц я р ы н к а. А зараз мы будзем выяўляць спрытнасць, кемлівасць і камандны дух. Па маёй камандзе патрэбна будзе зняць з сябе ўсе знакі адрознення і пакласці іх каля маткі, якая таксама выконвае дадзеныя ўмовы выпрабавання. Дапамагайце адзін аднаму. Пачынаем.

*(Падводзяцца вынікі ўсіх спаборніцтваў. Узнагароджваюцца пераможцы.)*

К а ц я р ы н к а. Вы справіліся з усімі ўмовамі мурашніка. Але ж мы казалі, што галоўнае – гэта сяброўства. Каманды, абдыміце адна адну і ўявіце, што на вас, як на дзяржаву, нападае самы страшэнны ваш вораг – лянота. І яе трэба прагнаць, толькі паказаўшы, што, нягледзячы на тое, што вы былі саепрнікамі ў выпрабаванні, усё ж такі вы – гэта адзін му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рашнік. Зараз будзе гучаць музыка. Я па чарзе буду запрашаць у цэнтр пляцоўкі аднаго ўдзельніка з каманды. Якія рухі ён будзе паказваць, вы павінны паўтараць, а гледачы будуць паўтараць таксама ўсе рухі, толькі на сваіх месцах. Пачынаем.

*(Гучыць музыка. Каманды выконваюць умовы гульні.)*

К а ц я р ы н к а. Усім удзельнікам гучныя апладысменты! Сядайце, калі ласка, на свае месцы. Сёння вы паказалі, што лепш за ўсё мы робім любую справу толькі разам.

Д з е д Г а ю н. Такі прынцып у мурашніку менавіта таму, што ён – дзяржава чысціні і парадку. І ты, Кацярынка, і мурашка – малайцы, што такое прыдумалі. Я спадзяюся, што гэта павучальныя гульні. Дзеці будуць добра памятаць, якая складаная праца ў мурашніку, і шкодзіць яму больш не будуць. Да пабачэння.

К а ц я р ы н к а. Да пабачэння.

*Усе пакідаюць сцэну.*

***Аўтар сцэнарыя А.Я.Цімафеева***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЖЫХАРЫ ЛЕСУ
### *(сцэнарый гульнёва-забаўляльнай праграмы)*

*Сцэна аформлена пад лясную паляну. Гучыць музыка, чытаецца дыктарскі тэкст.*

Г о л а с. Хай годы мінаюць, сэрца маладое
Ад красы прыроды замірае зноў,
Лес і луг, і рэчка для мяне – святое,
Да прыроды будзе вечнаю любоў!

*(Выходзяць вядучыя Мікіта і Настачка.)*

М і к і т а. Добры дзень, паважаныя сябры! Сёння мы з вамі будзем весці гаворку пра жыхароў лесу.

Н а с т а ч к а. Адкажыце, калі ласка, ці любіце вы звяроў? *(Так.)* І я ўпэўнена, што кожны з вас, знаходзячыся ў лесе, чакае сустрэчы з вожыкам або вавёркай.

М і к і т а. І вельмі баіцца ваўка ці мядзведзя.

Н а с т а ч к а. А як вы лічыце, ці патрэбны лесу жыхары? *(Так.)*

М і к і т а. Вельмі добра. У наш час вельмі шмат людзей, якія знішчаюць нашу прыроду і забіваюць яе жыхароў.

Н а с т а ч к а. Каб вы заўжды абаранялі лясное насельніцтва, захоўвалі яго, мы прапануем вам пазнаёміцца з ім бліжэй.

М і к і т а. Зараз зазірніце ўсе пад свае крэслы. *(Зазіраюць.)* Тых, хто знайшоў паперку з выявай звяроў, я прашу выйсці да нас.

Н а с т а ч к а. Ствараем дзве каманды. Кожная каманда павінна прыдумаць сабе назву, звязаную з жыхарамі лесу. *(“Пушча”. “Запаведнік”.)*

М і к і т а. Добра. Амаль усе звяры ў лесе вельмі спрытныя і разумныя. Вось мы і паглядзім, ці адпавядаеце вы гэтым якасцям.

*(У гэты момант асістэнты прычапляюць да спіны кожнага ўдзельніка каманды літару.)*

Н а с т а ч к а. У кожнага з вас на спіне знаходзіцца літара. Ваша задача – як мага хутчэй убачыць гэтую літару і скласці адпаведна літарам назву звера. Тая каманда, якая хутчэй справіцца з заданнем, атрымае адзін бал.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*(Ідзе гульня.)*

М і к і т а. Ну вось, лік у нас ужо пачаўся. Але не спяшайцеся святкаваць перамогу, самае цікавае яшчэ наперадзе.

Н а с т а ч к а. Уважліва паглядзіце адно на аднаго і пастарайцеся запомніць удзельнікаў сваёй каманды.

М і к і т а. Уявіце сабе, што вы вяртаецеся з палявання. Як усе мы ведаем, жыхары лесу вельмі часта спрачаюцца за ежу. Вось і вам прыйдзецца прыкласці шмат намаганняў, каб зберагчы сваю здабычу. А здабычай будуць вось гэтыя паветраныя шарыкі. Пакуль будзе гучаць музыка, вы павінны нагамі наступіць на шарык свайго саперніка, каб шарык лопнуў. Як толькі музыка прыпыніцца, каманды атрымаюць столькі балаў, колькі шароў у вашай камандзе засталося. Усё зразумела? Тады пачалі!

*(Гучыць музыка, ідзе гульня.)*

Н а с т а ч к а. Вось гэта цуд, вось гэта звяры! Так абаранялі сваю здабычу, што нават стаміліся і ў роце перасохла? Ну, нічога, мы вам дапаможам спатоліць смагу. Вось вам напой, які змяшчаеццца ў спецыяльных талерачках, вы, напэўна, усе добра ведаеце, як жывёлы п'юць ваду. Кожнаму члену каманды мы прапануем без дапамогі рук, толькі сваімі вуснамі выпіць з талерачак гэты кісель. Пераможа тая каманда, якая з умовай гульні справіцца хутчэй. Як толькі апошні ўдзельнік вернецца назад да каманды і ўсе талерачкі будуць пустыя, тая каманда і атрымае перамогу.

*(Ідзе гульня.)*

М і к і т а. Ведаеце, даражэнькія, у нашай зале сядзяць гледачы, у якіх таксама ёсць адметныя картачкі пераможцаў, але не са звярамі. Зараз вам патрэбна іх знайсці і прывесці ў сваю каманду, каб у нас атрымаліся дзве каманды па 10 чалавек.

*(Гучыць музыка, удзельнікі з залы выводзяць яшчэ 10 чалавек.)*

Н а с т а ч к а. Як вас цяпер шмат! І, нягледзячы на вялікую колькасць удзельнікаў, усе праявяць свае асабістыя здольнасці ў наступным выпрабаванні. Вось на гэтых паперках напісаны словы, якія вам патрэбна скласці з дапамогай творчага падыходу, крэатыву, фантазіі і пластычнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М і к і т а. Паважаныя сябры, жыхары лесу з’яўляюцца яго неад’емнай часткай.

Н а с т а ч к а. Зараз вам патрэбна вось з гэтых паперак з назвамі звяроў выбраць адной камандзе траваядных і прычапіць на правую палову дрэва, а другой – драпежнікаў і прычапіць на левы бок дрэва.

*(Ідзе гульня.)*

М і к і т а. Вось якое цудоўнае дрэва атрымалася! А колькі на ім жыхароў лесу, усе такія прыгожыя і разнастайныя!

Н а с т а ч к а. Няхай гэтае дрэва стане сімвалам вашай павагі і пашаны да прыроды. Беражыце яе, захоўвайце тую прыгажосць, якую маеце.

М і к і т а. А мы на гэтым з вамі развітваемся. Да новых сустрэч!

***Аўтар сцэнарыя Д.П. Сергейчук***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. *Барташэвіч, Г.А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г.А.Барташэвіч. – Мн., 1985.

2. *Беларуская* вусна-паэтычная творчасць: падручнік для філал. спец. ВНУ / К.П.Кабашнікаў [і інш.]. – Мн., 1998.

3. *Беларускі* фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]; АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн., 2001. – Кн. 1.

4. *Беларускі* фальклор: хрэстаматыя / склад.: К.П.Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік, І.К.Цішчанка. – Выд. 4-е, перапрац. – Мн., 1996.

5. *Беларускія* народныя танцы, карагоды, гульні / склад. В.С.Семенякоў. – Мн., 1989.

6. *Валодзіна, Т.* Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / Т.Валодзіна. – Мн., 2004.

7. *Беларусы.* Т. 7. Вусная паэтычная творчасць / Г.А.Барташэвіч [і інш.]. – Мн., 2004.

8. *Васілевіч, У.* Беларускі народны каляндар / У.Васілевіч. – Мн., 1993.

9. *Вількін, Я.Р.* Беларускія народныя гульні / Я.Р.Вількін. – Мн., 1969.

10. *Гілевіч, Н.С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі / Н.С.Гілевіч. – Мн., 1975.

11. *Гілевіч, Н.С.* Песні народных свят і абрадаў / Н.С.Гілевіч. – Мн., 1974.

12. *Гуд, П.А.* Ад каляд да Пакроў / П.А.Гуд. – Мн., 2000.

13. *Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята: вучэб. дапам. / П.А.Гуд; Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мн., 2004.

14. *Гурскі, А.І.* Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі / А.І.Гурскі. – Мн., 2001.

15. *Гурскі, А.І.* Тайны народнай песні / А.І.Гурскі. – Мн., 1994.

16. *Жаніцьба* Цярэшкі / уклад. Л.М.Салавей. – Мн., 1992.

17. *Земляробчы* каляндар / склад. А.І.Гурскі, А.С.Ліс. – Мн., 1990.

18. *Зімовыя* песні / склад.: А.І.Гурскі, З.Я.Мажэйка. – Мн., 1975.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. *Кабашнікаў, К.П.* Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П.Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік. – Мн., 2000.
20. *Казакова, І.В.* Беларускі фальклор: курс лекцый / І.В.Казакова. – Мн., 2003.
21. *Касцюкавец, Л.П.* Беларускія народныя абрады / Л.П.Касцюкавец. – Мн., 1994.
22. *Коваль, У.І.* Беларускія народныя святы і звычаі / У.І.Коваль, В.С.Новак. – Гомель, 1993.
23. *Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я.Крук. – Мн., 2000.
24. *Кухаронак, Т.І.* Маскі ў каляднай абраднасці беларусаў / Т.І.Кухаронак. – Мн., 2001.
25. *Кухаронак, Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў / Т.І.Кухаронак. – Мн., 1993.
26. *Лакотка, А.І.* Сцежкамі дзядоў: этнаграфічныя нарысы: кн. для вучняў / А.І.Лакота. – Мн., 1986.
27. *Лірычныя* песні / уклад. і рэд. Н.С.Гілевіч. – Мн., 1976.
28. *Ліс, А.С.* Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С.Ліс. – Мн., 1998.
29. *Ліс, А.С.* Купальскія песні / А.С.Ліс. – Мн., 1974.
30. *Ліцьвінка, В.* // Беларускі фальклор: энцыкл.: у 2 т. – Мн., 2005.
31. *Ліцьвінка, В.Д.* Святы і абрады беларусаў / В.Д.Ліцьвінка. – Выд. 3-е. – Мн., 2001.
32. *Лозка, А.Ю.* Беларускі народны каляндар / А.Ю.Лозка. – Мн., 1993.
33. *Народная* культура Беларусі: энцыкл. даведнік / пад агульн. рэд. В.С.Цітова. – Мн., 2002.
34. *Народная* спадчына / склад. А.С.Фядосік, Г.А.Пятроўская. – Мн., 1984.
35. *Паэзія* беларускага земляробчага календара / уклад. А.С.Ліс. – Мн., 1992.
36. *Паэзія* земляробчага календара / уклад. А.С.Фядосік. – Мн., 1997.
37. *Песні* народных свят і абрадаў / уклад. і рэд. Н.С.Гілевіч. – Мн., 1974.
38. *Пятроўская, Г.* Жывая спадчына / Г.Пятроўская. – Мн., 1988.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

39. *Сакалова, В.К.* Вяснова-летнія каляндарныя абрады рускіх, украінцаў і беларусаў / В.К.Сакалова. – Мн., 1998.

40. *Сівурава, Л.П.* Аб станаўленні фестывальных традыцый у самадзейнай мастацкай творчасці / Л.П.Сівурава // Веснік: навук.-метад. зб. БелІПК. – Вып. 3. – Мн., 1996.

41. *Сысоў, У.М.* З крыніц спрадвечных / У.М.Сысоў. – Мн., 1997.

42. *Туманов, И.М.* Режиссура праздника и театрализованных представлений / И.М.Туманов. – М., 1974.

43. *Цітовіч, Г.І.* Анталогія беларускай народнай песні / Г.І.Цітовіч. – Мн., 1975.

44. *Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и представлений / Ю.М.Черняк. – Мн., 2004.

45. *Черняк, Ю.М.* Театрализованное представление в массовом празднике-юбилее города / Ю.М.Черняк. – Мн., 1989.

46. *Хатэнка, А.* Зніч крыжовых дорог / А.Хатэнка. – Мн., 1992.

47. *Этнаграфія* Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Б.І.Сачанка [і інш.]. – Мн., 1995.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вытворча-практычнае выданне*

Серыя “Народнае выхаванне”

# У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ

*Зборнік сцэнарыяў гульнёвых праграм*
*экалагічнай накіраванасці*

Рэдактар І.В.Смяян
Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая
Вокладка М.К.Пуцінцава

Падпісана ў друк                    2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 7,21. Ул.-выд. арк. 4,96.
Тыраж       экз. Заказ          .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ